ДАДАТКОВАЯ
АДУКАЦЫЯ
ДАРОСЛЫХ
У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

# АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

*Зборнік артыкулаў*

Пад агульнай рэдакцыяй
І. Б. Лапцёнак

Мінск
БДУКМ
2020

ББК 79.0
УДК 351.855
А437

Укладальнікі:
А. Т. Каліноўская, А. В. Гумінская

Пад агульнай рэдакцыяй
кандыдата філалагічных навук, дацэнта І. Б. Лапцёнак

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт А. Ю. Лозка,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. В. Мартынюк

Рэкамендавана да выдання
Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 11 ад 11.11.2020 г.).

А437 **Актуальныя** аспекты аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей : зб. арт. / уклад.: А. Т. Каліноўская, А. В. Гумінская, пад агул. рэд. І. Б. Лапцёнак ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Ін-т павыш. кваліф. і перападр. кадраў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 100 с.

ISBN 978–985–522–266–9.

Зборнік падрыхтаваны па матэрыялах рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Актуальныя пытанні аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей» (2020) і рэспубліканскага круглага стала «Выкарыстанне элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў мэтах развіцця ўнутранага і ўязнога турызму» (2020), праведзеных Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, галоўных спецыялістаў упраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў, экспертаў, кіраўнікоў і спецыялістаў устаноў культуры, якія маюць вопыт дзейнасці ў сферы аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Выданне адрасавана кіраўнікам і спецыялістам метадычных цэнтраў народнай творчасці, клубных арганізацый, музеяў, спецыялістам аддзелаў (упраўленняў) культуры абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, выкладчыкам і навучэнцам устаноў, што рэалізуюць праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

**УДК 351.855**
**ББК 79.0**

**ISBN 978-985-522-266-9**

© УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2020

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗАХАВАННЕ І ПАДТРЫМКА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ – ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫ РЭСУРС УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯРЖАВЫ

Важнейшымі аспектамі захавання традыцыйнай спадчыны з'яўляецца дакументаванне, даследаванне, перадача і папулярызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца пры дапамозе разнастайных сродкаў навукова-даследчай, культурна-асветнай дзейнасці, фармальнай і нефармальнай адукацыі.

У 2006 г. уступіла ў сілу Канвенцыя аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыяўлення. Ратыфікаваўшы Канвенцыю, Беларусь узяла на сябе абавязкі захоўваць яе палажэнні, уведамляючы, што культурная разнастайнасць прадастаўляе дыяпазон выбару, забяспечвае асяроддзе для захавання каштоўнасцей.

Не менш значным фактам з'яўляецца і тое, што Беларусь у ліку першых дзесяці дзяржаў ратыфікавала Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (уступіла ў сілу для Рэспублікі Беларусь 20 красавіка 2006 года). Далучэнне да яе стала важным крокам да ўсведамлення значнасці нематэрыяльнай спадчыны ў якасці крыніцы разнастайнасці і гарантыі ўстойлівага развіцця, стварэння дыялогу паміж супольнасцямі.

Беларусь вядзе даволі актыўную дзейнасць у межах Канвенцыі. «Калядны абрад "Цары"», «Вясновы абрад "Юраўскі карагод"», «Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай» (Будслаўскі фэст), «Культура бортніцтва Польшчы і Беларусі» — у спісы ЮНЕСКА ўключаны чатыры беларускія нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Адна прапанова плануецца да разгляду — «Саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство і ўменне» .

З мэтай метадычнай падтрымкі супольнасцей, груп носьбітаў спадчыны, устаноў адукацыі, музеяў, дамоў рамёстваў, фальклору, зацікаўленых асоб, уключаных у працэс ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльных каштоўнасцей, Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў створаны выданні, па якіх адбываецца навучанне спецыялістаў методыцы работы ў сферы аховы спадчыны: «Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны: практычнае кіраўніцтва» (2013); «Жывая спадчына Беларусі: Нацыянальны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі» (2014), «Культурный потенциал Республики Беларусь: методологические основания и практический опыт выявления, фиксации и систематизации культурных ресурсов» (2019) і інш.

Вынікам ажыццяўлення экспедыцыйных палявых запісаў супрацоўнікамі Інстытута (у той час — БелІПК) стаў выпуск грунтоўнай шасцітомнай працы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», аўтары якой у 2014 годзе былі адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Праца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засведчыла, што многія ўнікальныя традыцыі не толькі існуюць у памяці старажылаў, але і знаходзяцца ў жывым бытаванні, а іх вывучэнне, фіксацыя і папулярызацыя застаюцца важнай надзённай справай.

Актуальным аспектам у сферы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца абмеркаванне праблемных пытанняў аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку падчас іх выкарыстання ў музейнай і турыстычнай дзейнасці, перспектыў і пагроз гэтай дзейнасці для захавання жывых форм нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Дадзеныя пытанні знайшлі шырокі водгук сярод спецыялістаў сферы культуры і ўвайшлі ў праблемные поле мерапрыемстваў рэспубліканскага ўзроўню, арганізаваных Інстытутам у 2020 г. для спецыялістаў па ахове нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей рэгіянальных упраўленняў (аддзелаў) культуры, кіраўнікоў і спецыялістаў метадычных цэнтраў народнай творчасці, музеяў з абласцей Беларусі і г. Мінск: круглы стол «Выкарыстанне элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў мэтах развіцця ўнутранага і ўязнога турызму» (30 верасня 2020), навукова-практычны семінар (сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь) «Актуальныя пытанні аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей» (29 кастрычніка 2020).

Адпаведна патрабаванням ЮНЕСКА нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі прадстаўлена ў сетцы Інтэрнэт на спецыялізаваным сайце «Жывая спадчына Беларусі: Нацыянальны Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі», вядзенне якога забяспечвае Інстытут. Тут публікуюцца матэрыялы фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы, паведамленні аб мерапрыемствах па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, атрыманыя ад спецыялістаў устаноў культуры абласцей. На падставе матэрыялаў Нацыянальнага інвентара нематэрыяльнай культурнай спадчыны тэлеканалам «Беларусь-3» у 2018 – 2020 гг. падрыхтаваны цыклы перадач «Жывая культура» і «Жывая спадчына».

Запрашаем установы культуры больш актыўна прымаць удзел у публікацыях і прэзентацыі сваёй дзейнасці па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны на сайце «Жывая спадчына Беларусі». Менавіта сумесная дзейнасць высокакваліфікаваных спецыялістаў, супрацоўніцтва рэспубліканскіх, абласных, раённых устаноў культуры і адукацыі дазволіць нам наладзіць эфектыўную дзейнасць па захаванню, аднаўленню, развіццю і перадачы нашчадкам нацыянальных культурных традыцый.

Сёння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны 145 адметных праяў нематэрыяльнай творчасці чалавека, 94 з іх – жывыя традыцыі правядзення абрадаў і свят, выканальніцкія мастацтвы, народныя рамёствы, традыцыі кухні, светапогляду і міфалогіі.

У рамках Плана мерапрыемстваў па развіццю культурна-пазнавальнага турызму Інстытутам праведзены маніторынг дзейнасці па захаванню нематэрыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія выкарыстоўваюцца ў турыстычнай дзейнасці, шляхам вывучэння дзейнасці абласных і раённых устаноў культуры па напрамках: «Выкарыстанне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычнай дзейнасці» і «Вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыя нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у музейнай дзейнасці». Выказваем падзяку упраўленням культуры аблвыканкамаў і абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці за актыўны ўдзел у правядзенні даследавання. Яго папярэднія вынікі прадстаўлены ў выданні.

Рыхтуючы метадычныя праекты, мы арыентаваны ў тым ліку і на лакуны, існуючыя ў дзейнасці ўстаноў культуры. У прыватнасці, у практычнай дзейнасці музеяў пытанні вывучэння і папулярызацыі нематэрыяльных каштоўнасцей яшчэ толькі пачынаюць ставіцца і вырашацца комплексна. У многіх музеях нематэрыяльная культурная спадчына не знаходзіцца сёння ў цэнтры ўвагі, а музейна-педагагічныя і культурна-адпачынкавыя праграмы распрацоўваюцца без уліку існуючых у мясцовасці гісторыка-культурных каштоўнасцей. У той жа час адпаведна артыкулу 154 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры музейная дзейнасць ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння агульнадаступнасці культурных каштоўнасцей, выкарыстання іх для эстэтычнага выхавання і культурнага развіцця грамадзян і ўключае вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, культурна-асветную работу і культурна-адукацыйную дзейнасць, звязаную з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі адпаведна профілю музея.

На круглым стале, які адбыўся ў Інстытуце ў рамках адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі «Актуальныя пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны» ў сакавіку 2020 г., супрацоўнікі некаторых музеяў паказалі паспяховыя практыкі вывучэння і выкарыстання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. У рамках семінараў рэспубліканскага ўзроўню, праведзеных у верасні і кастрычніку 2020 г. мы працягнулі гаворку аб магчымасцях папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны на музейных пляцоўках. Звесткі аб рэалізаванай дзейнасці таксама ўключаны ў матэрыялы зборніка.

Своеасаблівай практычнай лабараторыяй, створанай на базе Інстытута ў 2020 г., якая дазваляе прадэманстраваць актуальныя аспекты прэзентацыі культурнай спадчыны ў рамках адукацыйнага працэсу, з'яўляецца спецыялізаваная вучэбная аўдыторыя «Этналабараторыя», у якой прадстаўлены прадметы этнаграфіі, музычныя інструменты з 15 краін свету. Сярод экспанатаў этнаграфічнай калекцыі «Этналабараторыі» ёсць тыя, што адкрываюць шырокія магчымасці для папулярызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Вялікая калекцыя разнастайных саламяных вырабаў нагадвае нам адразу пра тры элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. «Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення» прадстаўлены работамі знакамітага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнага майстра Т. Агафоненка. Багатая калекцыя вырабаў спіральнага саломапляцення дазваляе прадэманстраваць, што рамяство гэтае жывое. «Традыцыйная тэхналогія спіральнага пляцення ў Гарадоцкім, Браслаўскім, Верхнядзвінскім раёнах і г. Віцебск» мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Прадстаўлены ў экспазіцыі саламяны павук распаўсюджаны па ўсёй Беларусі. Па прапанове Быхаўскага раёна гэтая каштоўнасць была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Захоўваецца ў калекцыі Інстытута і маляваны дыван, на прыкладзе якога мы расказваем пра «Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я», якое мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і практыкуецца майстрамі ў пяці раёнах Віцебскай вобласці.

Вясельны каравай з традыцыйнымі ўпрыгожваннямі ў экспазіцыі прадстаўлены сімвалічна, але дае магчымасць узгадаць пра дзве сапраўдныя жывыя праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны — «Вясельную каравайную традыцыю ў аг. Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці» і «Веды і навыкі па вырабу традыцыйнага вясельнага каравая на Ваўкавышчыне». Больш шырока, у комплексе з іншымі абрадамі прадстаўлены ў Дзяржспісе вясельныя караваі з Дубровенскага і Слонімскага раёнаў.

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей уключана каля 10 ткацкіх традыцый. Багатая калекцыя ткацкіх вырабаў «Этналабараторыі» дае магчымасць прадэманстраваць некаторыя ткацкія тэхнікі вырабу паясоў, каляровых узорных посцілак і дываноў, белаўзорыстага ткацтва і інш.

Такім чынам, калекцыі «Этналабараторыі» пашыраюць магчымасці навучання на практыцы прэзентацыі жывых сучасных форм існавання традыцыйных рамёстваў.

Вопыт стварэння падобнай лабараторыі, якая з'яўляецца шматфункцыянальнай і не абмяжоўваецца толькі музейным паказам, можа прымяняцца дамамі культуры, рамёстваў, фальклору, метадычнымі цэнтрамі культурна-асветнай работы, установамі адукацыі сферы культуры.

З мэтай метадычнай падтрымкі дзейнасці арганізацый культуры рэспублікі Інстытут пачаў фарміраванне фонду метадычнага кабінета «Жывыя традыцыі» (па методыцы захавання і выкарыстання нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі). Акрамя размешчаных сістэматызаваных метадычных матэрыялаў, на яго базе рыхтуюцца выставы. У 2020 г. дэманстраваліся выданні, прысвечаныя нематэрыяльнай культурнай спадчыне Беларусі ў ЮНЕСКА, — «Традыцыйныя адзенне Віцебшчыны» (2017), «Прыдзвінскія карункі: народныя танцавальная спадчына Віцебшчыны» (2020), «Мастацтва insita: з гісторыі правядзення выстаў непрафесійнага мастацтва» (2013), «Нематэрыяльная культурная спадчына Міншчыны» (2013), «Гомельшчына турыстычная» (2019), «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання» (2020), «Бортныя хронікі» (2017), «Жывая культура Беларусі» (2019), «Бортніцтва — сувязь часоў» (2020), а таксама вырабы народных мастацкіх рамёстваў, якім нададзены статус гісторыка-культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасці, — дрыбінскія лапці, валёнкі і шапкі-магеркі, бабруйская кераміка, быхаўскія павукі, лідскія белаўзорыстыя ручнікі, шчэпавая птушка з Брэстчыны, гліняныя свістулькі з Віцебшчыны, неглюбскі ручнік з Веткаўшчыны, велікодныя пісанкі з Гродзеншчыны і інш.

Праблема аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны мае комплексны характар, патрабуе цеснай каардынацыі дзейнасці ўдзельнікаў працэсу захавання і папулярызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, рэалізацыі канкрэтных мер на розных узроўнях.

Ад аўтэнтычных выканаўцаў, мясцовых супольнасцей, работнікаў устаноў культуры і адукацыі сёння ў значнай ступені залежыць адраджэнне элементаў нематэрыяльнай спадчыны з мэтай пашырэння культурнай разнастайнасці, сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, дасягнення мэт устойлівага развіцця дзяржавы. Нацыянальныя абрады і звычаі, традыцыі, звязаныя з падрыхтоўкай і ўжываннем ежы, грамадскія мерапрыемствы, святы і сістэмы перадачы ведаў — усё гэта адыгрывае важную ролю ў дасягненні комплекснага сацыяльна-культурнага развіцця краіны і яе рэгіёнаў, выкананні актуальных змястоўных паказчыкаў рэалізацыі культурнай палітыкі.

***І. Б. Лапцёнак,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# І. АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЗАХАВАННЮ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АДМЕТНАСЦІ АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

***Каліноўская А. Т.,***

*вядучы спецыяліст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», член Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны*

Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўступіла ў сілу ў Рэспубліцы Беларусь 20 красавіка 2006 г. З таго часу праведзена вялікая работа па яе імплементацыі ў нацыянальнае заканадаўства і дзейнасць устаноў культуры краіны.

Пры падтрымцы Фонду нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ў 2012 г. быў створаны Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі (Інвентар НКС) – інфармацыйны рэсурс, у якім размешчаны звесткі пра адметныя праявы творчасці чалавека, жыццядзейнасць якіх падтрымліваецца мясцовымі супольнасцямі і ўвасабляе захаваныя культурныя традыцыі гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў краіны. Інфармацыйны рэсурс «Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны» выконвае задачы па ўліку і публікацыі вынікаў інвентарызацыі нематэрыяльных культурных каштоўнасцей, захаванню матэрыялаў фіксацыі і навуковай апрацоўкі элементаў НКС, метадычнаму забеспячэнню падрыхтоўкі прапаноў аб наданні статусу нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. У Інвентары НКС сабраны звесткі аб 26 рамёствах, 19 традыцыйных цырымоніях, 12 выканальніцкіх мастацтвах, 8 традыцыях кухні, 6 праявах светапогляду і міфалогіі, 5 вусных традыцыях.

Штогод іх колькасць павялічваецца. У 2018 г. у Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва ўключана гісторыка-культурная каштоўнасць Беларусі «Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай (Будслаўскі фэст) у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці». У 2019 г. у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова, унесены элемент НКС «Вясновы абрад “Юраўскі карагод”» у в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці». У 2019 г. сумесна з Рэспублікай Польшча ўнесена прапанова аб уключэнні ў Рэпрэзентатыўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва элемента НКС «Культура ляснога бортніцтва».

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), які ўступіў у сілу ў 2017 г., значна пашырыў прававы статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Артыкулам 69 Кодэкса замацавана паняцце «нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці»: да яго адносяцца звычаі, традыцыі, абрады, фальклор, беларуская і іншыя мовы, змест геральдычных аб'ектаў, тапонімаў, вырабаў народных мастацкіх рамёстваў і іншыя нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека. Артыкул 107 Кодэкса прысвечаны мерам па забеспячэнню захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь да канца 2020 г. уключаны 145 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. З іх 39 катэгорыі «А» – поўная аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя, і 106 катэгорыі «Б» – гісторыка-культурныя каштоўнасці поўнасцю або часткова аднояўленыя. За перыяд 2017–2020 гг. статус быў нададзены 34 нематэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям. Статус атрымалі адметныя рамёствы, напрыклад, белаўзорыстае ткацтва, практыкі саломапляцення, лясное бортніцтва, традыцыі беларускай кухні – выраб вясельных караваяў, выпечка хлеба, прыгатаванне клёцак з «душамі» і рыбы, сушанай на саломе, традыцыі народных гульняў – «Ката пячы», «Яшчар», выканальніцкія мастацтвы – спевы «ў перахлёст», Дэмбраўская кадрыля, а таксама шанаванне «Нявесцінага каменя», абрад «Сула», абрад «Розгары» і інш. Усе звесткі пра нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці апублікаваныя ў раздзеле «Інвентар НКС» на сайце «Жывая спадчына Беларусі» (http://livingheritage.by/nks/).

На падставе звестак Інвентара НКС у сродках масавай інфармацыі выходзяць серыі публікацый, тэле- і радыёперадачы. Тэлеканалам «Беларусь 3» з 2018 г. праводзяцца здымкі цыкла праграм пра кожную нематэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць. Цыкл будзе ўключаць больш за 80 тэлеперадач і працягнецца да 2021 г. У межах выдавецкага праекта Банка развіцця «Культурная спадчына Беларусі» ў 2019 г. падрыхтаваны ілюстраваны альбом «Жывая культура Беларусі» на чатырох мовах, а ў 2020 г. – выданне «Бортніцтва – сувязь часоў».

У кожнай вобласці вядзецца работа па падрыхтоўцы ад 2-х да 5-ці прапаноў па наданню статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Найбольшая колькасць прапаноў рыхтуецца ў Віцебскай вобласці, што звязана з актыўным удзелам спецыялістаў абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці ў даследаванні разнастайных праяў культурнай спадчыны. На падставе звестак пра адметныя мясцовыя традыцыі кожнага раёна вывучаецца бытаванне культурнай каштоўнасці на тэрыторыі ўсёй вобласці. У выніку нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці аб'ядноўваюць некалькі раёнаў напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я», «Традыцыйная страва “Клёцкі з душамі” Віцебскай вобласці», «Інсітнае мастацтва Віцебшчыны» і інш. Практыку комплекснага вывучэння адметных праяў творчасці чалавека на тэрыторыі сваіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў неабходна прымяняць ва ўсіх абласцях пры падрыхтоўцы прапаноў аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці патрабуюць не толькі даследавання, дакументавання і надання статусу, але і дзейсных мер па захаванню, стварэнню ўмоў для адраджэння, развіцця і перадачы нашчадкам нашых культурных традыцый.

У кожнай вобласці склалася пэўная сістэма работы па забеспячэнню жыццяздольнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

У Гродзенскай вобласці пад аховай 18 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (гэта найбольшая колькасць нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей), што з'яўляецца вынікам сістэматызаванай дзейнасці па выяўленню нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у кожным раёне і прэзентацыі іх на абласных мерапрыемствах. Менавіта на Гродзеншчыне арганізаваны адмысловыя фестывалі, прысвечаныя нематэрыяльнай культурнай спадчыне. Рэгіянальны фестываль традыцыйнай культуры «Скарбы Гродзеншчыны» праходзіць кожныя два гады ў адным з раёнаў і знаёміць наведвальнікаў з культурнай спадчынай усяго Панямоння. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці служаць асновай для стварэння яркіх самабытных брэндавых мерапрыемстваў – кірмаш «Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня» ў Гродне, «Свята ткацтва» ў Лідзе, фестываль «Па сцежках спадчыны» ў Мастоўскім раёне, «Свята пісанкі» і «Адэльскі фэст» на Гродзеншчыне, «Паўлаўскі каравай» на Слонімшчыне і інш. Нематэрыяльная культурная спадчына Гродзеншчыны эфектыўна выкарыстоўваецца ў праектах трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама пры стварэнні музеяў, музейных пакояў і экспазіцый, прысвечаных нематэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям, што дае магчымасць у любы час пазнаёміць гасцей са скарбамі спадчыны, прыцягнуць увагу цікавымі экскурсійнымі аб'ектамі, запрасіць дзяцей і моладзь да знаёмства з адметнымі мясцовымі традыцыямі. З праявамі мясцовай культурнай спадчыны знаёмяць «Музей пісанкі» ў г. п. Сапоцкін, музейны пакой драўляных музычных інструментаў народнага майстра М. А. Скрамблевіча ў аг. Адэльск Гродзенскага раёна. Пра выраб славутых караваяў расказвае музейная экспазіцыя «Ізабелін кулінарны» ў Ваўкавыскім раёне, пра багатыя ткацкія традыцыі Панямоння – музейны пакой аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці.

У артыкуле 154 Кодэкса аб культуры адзначана, што музейная дзейнасць уключае вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю нематэрыяльных гісторыка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурных каштоўнасцей адпаведна профілю музея. Варта актывізаваць работу музеяў у гэтым напрамку ва ўсіх абласцях.

У Віцебскай вобласці ў выніку ажыццяўлення паслядоўных праграм па вывучэнню асобных сфер традыцыйнай культуры публікуюцца грунтоўныя выданні, прысвечаныя рамёствам, майстрам, традыцыйным строям рэгіёна, ствараюцца калекцыі мастацкіх вырабаў і тэматычныя выставы, праводзяцца фэсты, прысвечаныя аднаўленню традыцый, напрыклад, «Вялікая вясельніца». Цікавыя праграмы па народнай творчасці рыхтуюцца падчас Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

У Гомельскай вобласці захоўваецца найбольшая колькасць традыцыйных аўтэнтычных абрадаў, якія не патрабуюць арганізацыі спецыяльных мерапрыемстваў, бо мясцовыя супольнасці абавязкова штогод адзначаюць абрадавымі дзеямі пэўныя святочныя дні («Юраўскі карагод», «Ваджэнне і пахаванне стралы», «Сула», «Провады русалкі», «Чырачка»). Тут з боку ўстаноў культуры патрэбна дапамога ў арганізацыі пераемнасці і падтрымкі выканальніцкага майстэрства. Выдатнай практыкай захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляецца Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», скіраваны на практычнае ўвасабленне ідэй пераемнасці і папулярызацыі аўтэнтычных форм народнага мастацтва сярод дзяцей і моладзі.

Добрыя практыкі захавання спадчыны склаліся ў многіх раёнах Мінскай вобласці. Неабходна адзначыць паспяховую дзейнасць Капыльскага раёна па захаванню каляднага абрада «Цары», уключанага ў спісы ЮНЕСКА, дзе ўжо вырасла некалькі пакаленняў маладых «цароў». Адметны калядны фэст праходзіць 13 студзеня. Урачыстасць у гонар ушанавання абраза Божай Маці Будслаўскай штогод наведваюць каля 20 тыс. чалавек, якіх прымаюць у Мядзельскім раёне. Асаблівую цікавасць выклікае вывучэнне комплексу праяў нематэрыяльнай спадчыны ў фармаце маладзёжнага летніка, які на працягу тыдня ладзіцца ў Любанскім раёне, – гэта фестываль традыцыйнай культуры «Пятровіца». Штогод удзельнікі з Беларусі, Літвы, Расіі і іншых краін вывучаюць народныя песні і танцы з аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі, пякуць хлеб у вясковай печы, косяць, жнуць, удзельнічаюць у рэканструкцыі мясцовых абрадаў. Летнікі, прысвечаныя асобным рамёствам, адбываюцца і ў іншых раёнах, напрыклад, у Мастоўскім і Веткаўскім, але комплекснае знаёмства з багатай культурнай спадчынай мясцовасці, якая ўключае спевы, танцы, кухню, традыцыйныя абрады, выклікае найбольшую цікавасць сярод моладзі.

У Брэсцкай вобласці для турыстычных груп установамі культуры распрацоўваюцца спецыяльныя інтэрактыўныя праграмы з прэзентацыяй нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Добра вядома праграма Мотальскага музея народнай творчасці «Абрадавае дзейства «Вясельны каравай». Спецыялістамі Кобрынскай раённай клубнай сістэмы распрацаваны турыстычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маршрут «Лелікаўская сваха запрашае ў падарожжа». Цікавасць майстроў выклікае Міжнародны пленэр ганчароў у в. Гарадная Столінскага раёна.

У Магілёўскай вобласці выкарыстоўваецца практыка правядзення фальклорных свят у дні традыцыйных абрадаў ля крыніц. Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці маюць «Традыцыя паломніцтва і пакланення крыніцы “Блакітная крыніца”» ў Слаўгарадскім раёне і «Абрад “Бразгун”» у Чэрыкаўскім раёне, якія таксама адбываюцца побач з крыніцай. Набажэнствы ў дні свят наведваюць тысячы чалавек, адначасова праводзяцца фальклорныя конкурсы, экалагічныя і інфармацыйныя акцыі.

Вопыт рэгіёнаў у сферы аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей заслугоўвае шырокай прэзентацыі на мерапрыемствах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Падобны падыход рэалізаваны ў Магілёўскай вобласці, дзе раз у два гады праводзіцца міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага грамадства».

Нароўні з паспяховымі практыкамі аховы нематэрыяльнай спадчыны выяўляюцца і праблемныя моманты. Складанасці ўзнікаюць у выпадках аб'яднання лакальных звычаяў невялікіх вёсак з раённымі фальклорнымі мерапрыемствамі: змянення кантэксту, колькасці ўдзельнікаў традыцыйных цырымоній, журналістаў, тэлерэпарцёраў і фотааматараў на традыцыйных абрадавых дзеях. Важна захоўваць асаблівасці традыцыйных лакальных свят і абрадаў, іх адметныя духоўныя і мастацкія вартасці, уключаючы мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці не вельмі часта прэзентуюцца ў сталіцы, але мерапрыемствы па іх прэзентацыі і папулярызацыі з'яўляюцца знакавымі. Сярод пастаянна дзеючых творчых пляцовак можна вылучыць Рэспубліканскі фестываль-кірмаш «Вясновы букет», канцэрт «Фальклор беларускай глыбінкі» ў рамках Міжнароднай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, музычна-этнаграфічны канцэрт падчас Міжнароднага форуму этнакультур у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

У дзейнасці па захаванню спадчыны неабходна ўлічваць рэкамендацыі ЮНЕСКА па выкананню Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і этычныя прынцыпы аховы жывой спадчыны. Работа па імплементацыі міжнародных норм аховы спадчыны ў нацыянальнае заканадаўства працягваецца і знаходзіць сваё адлюстраванне ў прапановах па ўнясенню змяненняў у Кодэкс аб культуры.

Дзейнасць па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны адлюстроўвае духоўнае багацце краіны, садзейнічае папулярызацыі традыцыйных каштоўнасцей. У Дзяржаўны спіс уключаны каля 5 тыс. матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, з іх 145 – нематэрыяльных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна далейшая актыўная работа па выяўленню, асэнсаванню і захаванню духоўных скарбаў Беларусі. Наданне ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дае магчымасць стварыць умовы для поўнага раскрыцця патэнцыялу культурнай спадчыны і перадачы нашчадкам нацыянальных культурных традыцый.

## МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ЗАХАВАННЮ ЭЛЕМЕНТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ, УКЛЮЧАНЫХ У СПІСЫ ЮНЕСКА

***Мельнікава Л. Г.,***
*вядучы метадыст па народных традыцыях і абрадах*
*установы «Гомельскі абласны метадычны*
*цэнтр народнай творчасці»*

Дзейнасць установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» ў сферы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гомельскай вобласці будуецца на аснове патрабаванняў міжнароднага і рэспубліканскага заканадаўства, Канвенцыі 2003 года аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (ЮНЕСКА), главы 16 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

На працягу 20-і гадоў аддзелам традыцыйнай народнай культуры ўстановы праводзяцца маніторынгі культурнай спадчыны Гомельшчыны. З мэтай папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны спадчыны цэнтр выпускае друкаваную прадукцыю: буклеты, зборнікі з дадаткам экспедыцыйных аўдыя- і відэазапісаў, брашуры. Выданне «Жывая спадчына Гомельшчыны» абагульняе гісторыка-культурныя каштоўнасці, перавыдаецца з дапаўненнямі.

Гомельская вобласць налічвае 12 нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Гэта каляндарна-земляробчыя абрады, песенныя стылі, традыцыя пакланенння каменным крыжам, тэкстыльная традыцыя і лясное бортніцтва. У 2020 г. элемент НКС «Мастацкія практыкі саломапляцення Гомельскай вобласці» стаў 12-й нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю вобласці ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурны каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У мэтах захавання элемента НКС «Вясновы абрад "Юраўскі карагод"» Гомельскім аблвыканкамам і Жыткавіцкім райвыканкамам распрацаваны прапановы па арганізацыі мерапрыемстваў на сродкі гранта ЮНЕСКА на 2020–2021 гг.; праект плана мерапрыемстваў па захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці

на 2022–2023 гг. У цяперашні час прапрацоўваецца план мерапрыемстваў, у які ўключаны: картаграфаванне і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Жыткавіцкім раёне; стварэнне анталогіі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Тураўшчыны і в. Пагост, публікацыя аўдыя- і відэаматэрыялаў, выданне буклетаў, фотаальбома з аўдыядадаткам «Юраўскі карагод», арганізацыя і правядзенне фестывалю нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў в. Пагост і інш.

Абраду «Юр'я» в. Пагост Жыткавіцкага раёна ў 2007 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь быў прысвоены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Носьбітамі элемента з'яўляюцца мясцовыя жыхары, у тым ліку ўдзельнікі народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Міжрэчча» Пагосцкага філіяла сельскага клуба-бібліятэкі ДУК «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі культурнага адпачынку насельніцтва». Яны штогод 6 мая праводзяць абрад «Юр'я», як і іншыя традыцыйныя абрадавыя святы – «Каляда», «Шчадрэц», «Гуканне вясны», «Саракі». Падрыхтаваны 3 тэатралізаваныя інтэрактыўныя пастаноўкі на аснове вясельнага абраду, шматлікія канцэрты. Рашэннем Жыткавіцкага раённага савета дэпутатаў і райвыканкамам прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Жыткавіцкага раёна» заснавальніку і першаму кіраўніку народнага фальклорна-этнаграфічнага калектыву «Міжрэчча», захавальніцы народных традыцый Кацярыне Аляксееўне Панчэні.

У Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва (ЮНЕСКА) у 2020 г. уключана сумесная беларуска-польская намінацыя «Культура ляснога бортніцтва». Яе падрыхтоўцы папярэднічала ўключэнне ў 2017 г. у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь элемента «Лясное бортніцтва Беларусі на прыкладзе Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці».

Аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лельчыцкага райвыканкама сумесна з сельскімі выканаўчымі камітэтамі распрацаваны план па захаванню і папулярызацыі дадзенага элемента, створана база даных бортнікаў на тэрыторыі Лельчыцкага раёна. У Лельчыцкім раённым краязнаўчым музеі арганізавана выстава «Бортніцтва Лельчыцкага раёна».

Да Сусветнага Дня пчол (20 мая) установамі культуры і адукацыі Лельчыцкага раёна арганізуюцца тэматычныя мерапрыемствы, сярод якіх: экалагічная акцыя «Захаваем пчалу – захаваем планету!»; выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; тэматычныя майстэрні пад адкрытым небам «Творчы вулік»; конкурс дзіцячых малюнкаў «Пчолы ў прыродзе» і інш.

Традыцыя бортніцтва шырока папулярызуецца бортнікам-аматарам Іванам Осіпавым, у тым ліку праз сайт bortnictva.by, тэматычныя старонкі ў сацыяльных сетках, выступленні ў радыёперадачах, на замежных форумах, круглых сталах, шляхам прэзентацый традыцыі на розных мерапрыемствах. З праек-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

там «Месца бортнай сілы» ён прыняў удзел у конкурсе сацыяльных праектаў «SocialWeekend-15» у сакавіку 2020 г.

Традыцыю бортніцтва падтрымліваюць і папулярызуюць нашчадкі бортнікаў раёна, якія прымаюць удзел у здымках тэлеперадач, фільмаў, праводзяць майстар-класы, у тым ліку ў рамках Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» (г.п. Ляскавічы, Петрыкаўскі раён).

## ШЛЯХІ ЗАХАВАННЯ ВУСНЫХ ТРАДЫЦЫЙ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Лабука К. П.,***
*дырэктар дзяржаўнай установы*
*«Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»*

На Віцебшчыне захавалася нямала абрадаў, песень, танцаў, рамёстваў, якім неабходна надаць высокі статус «нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь». Кожны год спецыялісты метадычнага цэнтра сумесна з работнікамі культуры раёнаў адкрываюць для сябе новую старонку ў культурнай гісторыі краю. Спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у вобласці пачаўся з уключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь традыцыйнай гульні «Жаніцьба Цярэшкі».

«Жаніцьба Цярэшкі» – беларуская народная гульня для нежанатай моладзі. Даўней мела сакральнае значэнне, з'яўлялася рэпетыцыяй вясельных абрадаў (маладыя людзі выбіралі сабе пару і жартам жаніліся). Нярэдка пары, якія ўтвараліся падчас гульні, потым бралі шлюб.

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь «Абрад “Жаніцьба Цярэшкі”» быў уключаны ў 2010 г., але яго адраджэнне на Лепельшчыне пачалося значна раней, у 1994 г. (в. Велеўшчына).

У 2010 г. Лепельскі аддзел культуры выпусціў кнігу «Цярэшка – святое дзела: “Жаніцьба Цярэшкі” на Лепельшчыне» (аўтар Т. В. Валодзіна). У ёй зроблены структурны аналіз схемы абрадава-гульнявога дзеяння і вылучаны асноўныя элементы: выбар «бацькі» і «мамкі», складанне пар, «шлюб-танец», пасля якога ўдзельнікі атрымліваюць абрадавыя назвы – «дзед» і «баба», «уцёкі», «лаўленне» (лоўля) удзельнікаў, гульні – «мосцік», «вячэра»; заканчвалася ўсё «вячэрай» – агульным святочным застоллем са шчодрым пачастункам.

У кнігу ўвайшло больш за 200 «песень-цярэшак» і гульня-танец з рухамі, фігурамі, «каленцамі». З кожным годам традыцыйная калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі» набывае ўсё большую папулярнасць. Работнікі культуры актыўна супрацоўнічаюць з аграсядзібамі «Люкжына», «Поўсвіж», Лепельскім ваенным

санаторыем, дзе для турыстаў праводзяць абрадавую гульню «Жаніцьба Цярэшкі». У 2016 г. створаны праект «Захаваем Цярэшку разам», які рэалізуецца па сённяшні дзень. З 7 студзеня (Каляды) па 19 студзеня (Вадохрышча) народны фальклорны калектыў «Кругаверць» падарожнічае па ўстановах культуры раёна, дзе збіраюць моладзь і гуляюць у традыцыйную гульню «Жаніцьба Цярэшкі».

Традыцыі гэтай гульні беражліва захоўвае і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, узорны фальклорны калектыў «Сунічкі» (кіраўнік – Вераніка Аляксандраўна Хомбак), які выхаваў не адно пакаленне «носьбітаў» фальклору Лепельшчыны.

Народная гульня моладзі «Яшчар» в. Гута Пастаўскага раёна была распаўсюджана яшчэ ў сярэдзіне XX ст. Спецыялістамі ДУК «Цэнтр культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна», навуковым супрацоўнікам Людмілай Чатовіч і спецыялістам па фальклору Святланай Марозавай, праведзена вялікая даследчая праца па выніках фальклорных экспедыцый у аддаленыя куткі Пастаўшчыны. У 2018 г. элементу НКС «Народная гульня моладзі “Яшчар”» у в. Гута Пастаўскага раёна нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Гульня «Яшчар» мае старажытнае паходжанне, аб чым сведчаць як назва гульні, што ўвасабляе архаічную міфалагічную істоту, так і асноўныя прыметы. Яшчара (пераапранутага хлопца) садзяць у цэнтры карагода, а дзяўчаты з песняй ходзяць вакол яго. Падчас карагода Яшчару прапануецца выбраць сабе «панну». У яе, як і ў іншых дзяўчат, ён забірае хустку або вянок, а затым кожная дзяўчына спявае Яшчару песню і выконвае яго заданні, каб вярнуць сваю рэч. Гульня на Пастаўшчыне праходзіць у калядны, купальскі і велікодны перыяды, падчас правядзення вячорак з разнастайнымі народнымі гульнямі, песнямі, танцамі пад акампанемент мясцовых музыкаў.

Гульня рэканструявана работнікамі культуры Пастаўшчыны. Удзельнікамі фальклорнага калектыву Гуцкага сельскага культурнага цэнтра распрацаваны праект-акцыя «Святкуем па-беларуску», створаны для папулярызацыі народных гульняў, запісаных у этнаграфічных экспедыцыях на тэрыторыі раёна .

Віцебскае тэлебачанне і тэлеканал «Паставы ТБ» сумесна стварылі трохгадовы праект, прысвечаны Году малой радзімы, у межах якога падрыхтавалі відэафільмы па гісторыка-культурнай спадчыне Пастаўшчыны, у тым ліку па народнай гульні «Яшчар».

У 2020 г. работнікамі культуры ў школах раёна праводзіцца акцыя «Гадзіна народных гульняў», дзе моладзь гуляе ў «Яшчар», а паглядзець на дзеі прыходзяць бацькі, настаўнікі, старэйшыя жыхары вёсак.

У 2016 г. у Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны элемент «Традыцыйныя вясельныя звычаі Дубровенскага раёна», у які ўвайшлі гульні «драць зайца», «брахня», «ганяць сучку», «ганяць маладу на ваду», вясельны «рагаты» каравай. Дадзеная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапанова падрыхтавана на падставе матэрыялаў этнаграфічных экспедыцый, праведзеных з мэтай запісу і даследавання вясельных абрадаў Дубровенскага раёна супрацоўнікамі абласнога і раённага метадычных цэнтраў, а ў 2015 г. сумесна з прадстаўнікамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктарам філалагічных навук Т. В. Валодзінай і кандыдатам гістарычных навук Т. І. Кухаронак былі выяўлены цікавыя вясельныя звычаі, гульні, абрадавыя песні, мясцовыя асаблівасці вясельнага каравая. Уключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей вясельных звычаяў Дубровенскага раёна яшчэ раз паказала значнасць і неабходнасць дадзенага кірунку ў рабоце абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці для развіцця фальклору Віцебскай вобласці.

Абласны агляд-конкурс вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца» праводзіцца з 2012 г. адзін раз у два гады ў розных раёнах вобласці з мэтай падтрымкі і стымулявання фальклорных і аўтэнтычных калектываў, укаранення аўтэнтычных вясельных абрадаў Віцебшчыны ў сучасную практыку. Конкурс спрыяе адраджэнню, захаванню і папулярызацыі рэгіянальных вясельных традыцый. Кожны год выбіраецца новае месца правядзення, мерапрыемствы ўвасабляюцца ў новых формах.

У 2015 г. адбылася рэканструкцыя вясельнага абраду на этнаграфічных матэрыялах Дубровенскага, Гарадоцкага і Лiёзненскага раёнаў, на аснове якіх быў створаны відэафільм.

Падчас правядзення «Вялікай вясельніцы» ў г.п. Ушачы ў 2017 г. у конкурсе прынялі ўдзел 16 фальклорных калектываў, адбылася рэканструкцыя вясельных абрадаў заходняга рэгіёна – Ушацкага, Глыбоцкага і Шаркаўшчынскага раёнаў. Упершыню быў паказаны абрад «шанаванне ваўчыцы» з Глыбоцкага раёна. У рамках свята праходзіла выстава вясельных куткоў, з рознымі элементамі абрадаў, а таксама дэманстравалася нацыянальная кухня, гучалі вясельныя песні.

У 2018 г. адбыўся семінар-практыкум для спецыялістаў па фальклору ў Гарадоцкім раёне, на якім былі прадстаўлены прэзентацыі вясельных абрадаў і песень, асаблівасцей вясельнага строю Гарадоцкага раёна.

У 2019 г. «Вялікая вясельніца» адбылася ў Расонскім краі. Конкурс вясельных абрадаў уключаў у сябе наступныя намінацыі: вясельныя песні Віцебшчыны, вясельны стол, своеасаблівы турнір сваццяў. На свята былі запрошаны госці з Себежскага раёна Пскоўскай вобласці.

Работа па папулярызацыі, захаванню і выяўленню новых вясельных абрадаў і звычаяў не заканчваецца. Унікальная выстава «Вянок нявесты» ў выставачнай зале метадычнага цэнтра выклікала вялікую цікавасць моладзі, як і ўключэнне вясельных звычаяў у сучасны абрад. Усё больш маладых цікавяцца тым, як было раней, замаўляюць рагаты вясельны каравай. Фальклорныя калектывы спяваюць абрадавыя вясельныя песні, ставяць «рагаткі» і «дзяруць зайца».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Захаванне вусных народных традыцый патрабуе дакладнага этнаграфічнага вывучэння, якое дазваляе адраджаць іх ва ўсім багацці і разнастайнасці мясцовых праяў. На жаль, зусім мала застаецца аўтэнтычных носьбітаў культурных традыцый. Наш абавязак і адказнасць перад будучыняй – перадаць пакаленням бясцэнны культурны вопыт беларускага народа. Пры стварэнні ўмоў для іх захавання і развіцця важна зацікавіць найперш дзяцей і моладзь, а таксама мясцовае насельніцтва.

## ЗАХАВАННЕ І ПАДТРЫМКА РАМЕСНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Мурэня А. У.,***
*дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці»*

На сённяшні дзень 18 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – элементы) Гродзенскай вобласці занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: «традыцыйныя рамёствы» (10), «традыцыйная ежа» (4), «выканальніцкія мастацтвы» (2), «традыцыйныя цырымоніі» (1), «светапогляд людзей, міфалогія» (1). Элементы НКС «Поразаўская банкуха» і «Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення» былі разгледжаны на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Гэта вынік арганізаванай працы, якую можна ўмоўна падзяліць на некалькі этапаў:

I этап. Выяўленне і вывучэнне.

У 2009 г. першыя элементы Гродзеншчыны атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пазней быў складзены спіс элементаў, арыентаваны на перспектыву – «Рэгіянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны», які штогод абнаўляецца. Згодна з ім распрацоўваецца план работы па выяўленню, адраджэнню і зберажэнню традыцыйнай культуры.

II этап. Унясенне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Для ўнясення элементаў з рэгіянальнага інвентару ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс) была складзена Праграма па рэалізацыі рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг. Паводле праграмы кожны год ад вобласці ў Дзяржспіс павінны дадавацца два элементы. Гэта непасрэдная работа раённых устаноў культуры са спецыялістамі Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці (АМЦНТ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III этап. Захаванне.

Стварэнне «Лакальнай праграмы па выяўленню, фіксацыі, прапагандзе і арганізацыі пераемнасці традыцыйнай мясцовай культуры на 2019–2022 гг.». Тыпавая (прыкладная) форма была распрацавана спецыялістамі Гродзенскага АМЦНТ. На аснове яе раёны вобласці склалі свае лакальныя праграмы. У кожнай з іх прадугледжаны мерапрыемствы па папулярызацыі мясцовых элементаў НКС.

Стварэнне музеяў і музейных пакояў элементаў НКС на базе клубных установаў – добрая практыка, якая існуе на Гродзеншчыне. Сярод іх можна назваць:

музей пісанкі ў г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна;

музейны пакой драўляных музычных інструментаў народнага майстра М. А. Скрамблевіча ў аг. Адэльск Гродзенскага раёна;

музейны пакой аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУ «Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці», які прэзентуе белаўзорыстае ткацтва Панямоння.

IV этап. Развіццё і папулярызацыя.

Акрамя музеефікацыі, якая таксама спрыяе папулярызацыі элементаў, можна вылучыць яшчэ чатыры асноўныя кірункі дзейнасці:

1. Творчыя праекты.

У Лідскім раёне ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія–Літва–Беларусь рэалізуецца праект «Умацаванне самабытнасці сельскіх раёнаў шляхам развіцця традыцыйных рамёстваў і турызму». Арганізавана майстэрня па ткацтву, дзе вырабляецца тэкстыль для стварэння рэплік рэгіянальнага касцюма Гродзеншчыны і Лідскага строю, шырока практыкуецца тэхніка мясцовага белаўзорыстага ткацтва.

Значны рэзананс у грамадстве і сродках масавай інфармацыі выклікаў калектыўны праект па захаванню, развіццю, пераемнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны і стварэнні маштабнага габелена «Гісторыі жывая ніць», прысвечанага 75-годдзю Вялікай Перамогі. У ім прынялі ўдзел спецыялісты Гродзенскага АМЦНТ, майстар па вырабу габелена Алена Шунейка і пераемніца ткацкага рамяства Юлія Барадзіна. Рэалізацыя праекта стала новым этапам падтрымкі жыццядзейнасці і прэзентацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны.

2. Культурна-масавыя мерапрыемствы.

У абласных святах і мерапрыемствах абавязкова ўдзельнічаюць носьбіты элементаў. Яны папулярызуюць нематэрыяльную культурную спадчыну, дзеляцца ведамі і вопытам з іншымі ўдзельнікамі і гасцямі.

Напрыклад:

цыкл велікодных мерапрыемстваў: рэгіянальнае свята-кірмаш «Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня», выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Велікодны падарунак»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

штогод у рамках мерапрыемстваў арганізуецца выстаўка 12 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, – усе элементы ткацкіх традыцый, традыцыйнай ежы Гродзеншчыны, традыцыя вырэзвання з паперы («выцінанка-выбіванка») у Навагрудскім раёне, традыцыі роспісу велікодных яек г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна.

Рэгіянальны фестываль традыцыйнай культуры «Скарбы Гродзеншчыны» прадстаўляе традыцыйную культуру найбольш шматбакова.

У час правядзення прэзентацыі і майстар-класаў дэманструюцца ўсе элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці.

Развіццю мясцовых элементаў таксама спрыяюць раённыя святы і фестывалі, напрыклад, штогадовае свята пісанкі ў г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна, якое дае ўяўленне аб традыцыях роспісу велікодных яек, рэгіянальнае свята рамеснікаў «Казюкі» ў г. Гродна і інш.

У выставачнай зале Гродзенскага АМЦНТ штогод праходзяць справаздачныя выстаўкі і выстаўкі-конкурсы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якіх прымаюць удзел сучасныя майстры традыцыйных рамёстваў і носьбіты элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзенскай вобласці.

3. Правядзенне майстар-класаў, летнікаў, школ, у тым ліку для турыстаў – добрая практыка Гродзеншчыны.

«Летнікі-пленэры» – месца сустрэчы тых, хто цікавіцца і займаецца народнымі рамёствамі.

У аг. Гудзевічы Мастоўскага раёна кожны год праходзіць летняя школа «Майстэрня падвойнага ткацтва», у якой прымаюць удзел носьбіты і трансляматары ўсіх элементаў традыцыйнага ткацтва Панямоння. Удзельнікі маюць магчымасць не толькі падзяліцца вопытам, але і абмеркаваць хвалюючыя моманты па пераемнасці рамяства. Важным здабыткам па захаванню элементаў НКС на Гродзеншчыне з'яўляецца арганізацыя пераемнасці традыцый «з рук у рукі»: ад носьбітаў моладзі, дзецям і ўсім жадаючым праз навучанне ў гуртках, студыях і майстар-класах.

4. Комплексная турыстычная накіраванасць.

Музеі і элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўключаюцца ў турыстычныя маршруты, што станоўча адлюстроўвацца на ахове элементаў і іх папулярызацыі.

Яшчэ адзін элемент НКС «Традыцыя вырэзвання з паперы (“выцінанка-выбіванка”) у Навагрудскім раёне». Дадзены элемент даўно вядомы і папулярны далёка за межамі Гродзеншчыны. Нядаўна створаную музей-майстэрню выцінанкі-выбіванкі могуць наведваць турысты, якія трапілі на Навагрудчыну.

Турыстычнай прывабнасцю карыстаюцца элементы, якія размешчаны на тэрыторыі спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і горада Гродна: «Традыцыйная рэгіянальная кухня аг. Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці», «Традыцыі роспісу велікодных яек у г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна», «Творчасць майстра па вырабу музычных інструментаў Мар'яна Скрамблевіча з аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна», «Выраб велікодных вербаў на тэрыторыі паўночна-заходняй Гродзеншчыны».

Арэал распаўсюджвання мастацкіх практык саломапляцення на Гродзеншчыне шырокі: гэта 16 раёнаў і горад Гродна. У абласныя і раённыя выстаўкі народнага мастацтва і пастаянныя выставачныя экспазіцыі ўваходзяць лепшыя вырабы 50 сучасных майстроў саломапляцення, кожны з якіх мае свой творчы почырк.

## АСНОЎНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ І ЗАХАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ АБРАДАЎ НА БРЭСТЧЫНЕ

***Пракаповіч Г. В.,***
*вядучы метадыст па этнаграфіі і фальклору*
*дзяржаўнай установы культуры*
*«Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр»*

Брэсцкая вобласць славіцца сваімі традыцыямі, якія з'яўляюцца яркай візітнай карткай рэгіёна. Самабытныя народныя святы, звычаі і абрады Брэстчыны – значная частка духоўнай культуры. Мы ганарымся тым, што захавана так званая «палеская мова», традыцыйныя рамесныя тэхналогіі, многія абрады каляндарнага цыкла ад Нараджэння Хрыстова да Піліпаўскага посту.

У вобласці налічваюцца 17 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, сярод якіх 5 адметных традыцыйных абрадаў.

Абрад каляднага комплексу «Конікі» ў г. Давыд-Гарадок Столінскага раёна перарос у своеасаблівы карнавал з рознымі аўтэнтычнымі і сучаснымі персанажамі.

Штогод на першы дзень Вялікадня ў в. Бездзеж Драгічынскага раёна праходзіць абрад «Стрылка», які канцэнтруе ў сабе функцыю абярэгу вёскі і ўраджаю ад неспрыяльных прыродных з'яў і нядобрай сілы.

У цэнтры беларускага Палесся ў в. Пінкавічы Пінскага раёна існуе старажытная традыцыя вадзіць карагоды ў першы дзень Вялікадня і да панядзелка наступнага тыдня, накіраваная на вясновае абуджэнне прыроды.

Не менш цікавы абрад звязаны з абыходам двароў – «Ваджэнне Кусты», які праводзіцца на Сёмуху ў Лунінецкім раёне. На яго прыкладзе выразна бачыцца ўстойлівасць калектыўнай самасвядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікае значэнне ў вобласці надаецца сямейна-бытавым традыцыям і абрадам, сярод якіх каравайная традыцыя ў аг. Моталь Іванаўскага раёна. У Мотальскім музеі народнай творчасці ёсць асобная зала, экспазіцыя якой прысвечана лакальным звычаям і абрадам. На яе базе распрацаваны шэраг інтэрактыўных праграм для розных узроставых катэгорый.

У аг. Радзялавічы Ганцавіцкага раёна жыве традыцыя тройчага памінання продкаў.

Усе вышэйадзначаныя традыцыі падтрымліваюцца супрацоўнікамі культуры вобласці: ствараюцца спрыяльныя ўмовы для існавання калектываў з удзелам актыўных носьбітаў фальклору, вядзецца актыўная работа па далучэнню дзяцей і моладзі да сваёй «карэннай» культуры.

Адным з дзейсных сродкаў захавання і папулярызацыі традыцыйнага мастацтва з'яўляецца абласное свята фальклорнага мастацтва «Таночак», якое праводзіцца з 2013 г. перыядычнасцю раз у два гады ў аг. Бездзеж Драгічынскага раёна. На ім прадастаўлены розныя жанры фальклору: песенная і вусная народная творчасць, інструментальная музыка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, а таксама харэаграфія і інш.

Падчас свята праводзіцца абласны конкурс дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў. Колькасць удзельнікаў апошнім часам павялічылася ў два разы, таму паўстала неабходнасць праводзіць адборачныя туры сярод прэтэндэнтаў на ўдзел, што сведчыць аб павышэнні ўзроўню выканальніцкага майстэрства дзіцячых фальклорных калектываў.

Значную пазіцыю ў справе папулярызацыі ўнікальных культурных і гістарычных традыцый Палесся займаюць: Міжнародны пленэр ганчароў у в. Гарадная Столінскага раёна, які праводзіцца з удзелам патомных ганчароў вёскі і майстроў ганчарнай справы з далёкага і блізкага замежжа; абласныя пленэры мастакоў; абласныя пленэры разбяроў манументальнай драўлянай скульптуры.

У бягучым годзе у аг. Дзівін Кобрынскага раёна, адбыўся ў 17 раз пленэр разбяроў. Майстры ўвасобілі ў дрэве сюжэт Дзівінска-Леліказўскага вяселля. Галоўнай гераіняй кампазіцыі стала свацця з Лелікава ў незвычайным галаўным уборы.

Фальклор з'яўляецца сукупнасцю рознабаковых праяў творчасці: гэта песеннае мастацтва і вусная народная творчасць, танцы, побыт, архітэктура, рамёствы і інш. У працы з архаічным матэрыялам мы стараемся ўлічыць усе фактары, якія паўплывалі на станаўленне лакальных праяў культуры.

Разнастайным стаў этнапраект абласнога грамадска-культурнага цэнтра «Рух зямлі». Ён уяўляе сабой своеасаблівую каляндарна-абрадавую карту рэгіёна і ўключае ў сябе цыкл этнаграфічных канцэртаў, які адлюстроўвае гадавое кола жыцця нашых продкаў. Праект закранае асноўныя абрады сямейна-бытавога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і земляробчага календара, якія захаваліся ў Брэсцкай вобласці, і дае магчымасць носьбітам традыцый усвядоміць важнасць той справы, якой яны займаюцца.

На стварэнне праекта натхніла экспедыцыйная дзейнасць па кутках Брэстчыны, багатых этнаграфічнымі ўзорамі традыцыйнага мастацтва. Вынікам плённай працы супрацоўнікаў ДУК «Брэсцкі абласны грамадска культурны цэнтр» стала нотнае выданне «Рух зямлі», падрыхтаванае па матэрыялах фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў Столінскім раёне. Шырокай аўдыторыі прадэманстраваны фундаментальныя, архаічныя і яскравыя лакальныя асаблівасці рэгіёнаў Брэстчыны: старажытныя абрадавыя дзеянні, прыклады вуснай народнай творчасці, песні, бытавыя танцы ў выкананні фальклорных калектываў, сярод якіх шмат носьбітаў аўтэнтычнага фальклору.

Канцэртная частка праекта пачалася ў абласным грамадска-культурным цэнтры ў лістападзе 2009 г. з вялікага этнаграфічнага канцэрта «Палеска-Падляшскае вяселле», на якім былі адноўлены амаль усе этапы вясельнага дзейства.

Далей адбыліся камерныя этнаканцэрты, на якіх дэманстраваліся абрады Брэстчыны: абрад «Гатуха» в. Навіцкавічы Камянецкага раёна, знакаміты калядны абрадавы комплекс «Конікі» з г. Давыд-Гарадок Столінскага раёна, вясновы абрад абуджэння зямлі «Юр'я» з в. Перасудавічы Бярозаўскага раёна, велікодны карагод «Стрылка» з в. Бездзеж Драгічынскага раёна, траецкі абрад «Ваджэнне Куста» з в. Дзятлавічы Лунінецкага раёна, традыцыя збірання траў «Іванавы ягады» з в. Хаціслаў Маларыцкага раёна, «Дажынкі» в. Пажэжын Маларыцкага раёна і в. Ляплёўка Брэсцкага раёна, «Піліпаўскія Вячоркі» з в. Дарапеевічы Маларыцкага раёна і інш.

Камерныя этнаканцэрты аб'ядналіся ў адзінае відовішчнае абрадавае дзеянне, ахапіўшае ў рамках аднаго канцэрта ўвесь «сонцазварот» ад лета да лета, які паказаў моц народных традыцый.

Кожны наступны этнаканцэрт ахоплівае ўсё большую колькасць прыхільнікаў фальклору і этнаграфіі. Падчас праекта пачалі ладзіць этнадыскатэкі з удзелам лепшых дзіцячых фальклорных калектываў вобласці. Першая этнадыскатэка «Час вяртання» адбылася ў Кобрынскім Палацы культуры з удзелам узорнага фальклорнага калектыву «Дараносіца» Хмялеўскага сельскага дома культуры Жабінкаўскага раёна.

У этнаграфічных канцэртах цыкла «Рух зямлі» прымаюць удзел не толькі аўтэнтычныя калектывы, але і дзіцячыя калектывы. Дзеці маюць магчымасць убачыць лепшыя ўзоры традыцыйнай культуры, далучаюцца да традыцыйных танцаў, песень, размоўнага жанру.

Сярод адметных мерапрыемстваў цыкла неабходна адзначыць дэфіле-паказ этнакасцюмаў Брэсцкай вобласці, якое арганізавана ў рамках святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 1000-годдзю Брэста. На ім былі прадстаўлены больш за 200 аўтэнтычных строяў.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Кола праекта рухаецца, ахоплівае ўсё большую тэрыторыю Брэсцкай вобласці і паступова выходзіць за межы краіны. Сярод новых удзельнікаў – фальклорныя калектывы з Польшчы, Расіі, Літвы, Латвіі.

## ВОПЫТ ЗАХАВАННЯ СПЕЎНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Глуздаў А. М.,***
*начальнік аддзела традыцыйнага мастацтва і культурна-дасугавай дзейнасці установы культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы»*

Спеўныя традыцыі займаюць дамініруючыя пазіцыі ў фальклорнай спадчыне. Асобнае месца належыць народнай песні ў рытуальна-абрадавых дзействах каляндарна-земляробчага і сямейна-бытавога цыклаў, дзе яна часцей выконвала функцыю магічную, замоўна-заклінальную. Яна заўсёды суправаджала жыццё чалавека ў горы і радасці, спявалася ад сэрца.

У агульнай рэгіянальнай сістэме беларускага фальклору Магілёўшчына займае даволі значнае месца. Як носьбіт асобных якасцей народнай культуры Падняпроўя, яна мае на сённяшні дзень даволі разнастайную жанравую палітру амаль ва ўсіх напрамках народнага мастацтва. Гэта помнікі музычнага фальклору, вусна-паэтычнай народнай творчасці, тэхналогіі і вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Адметнае месца тут належыць музычнаму фальклору, увасобленаму ў народнай песні.

Узоры раннетрадыцыйнага, познетрадыцыйнага і сучаснага фальклорнага пластоў яшчэ існуюць па ўсёй тэрыторыі Магілёўшчыны, але, на жаль, ужо маюць меншую дынаміку распаўсюджвання.

Раннетрадыцыйны пласт прадстаўлены песнямі веснавога, восеньскага, летняга і зімовага цыклаў каляндарна-земляробчай песеннай культуры, сямейна-абрадавымі песнямі (вяселле, «хрэсьбіны») і шматлікімі ўзорамі пазаабрадавай культуры.

Для фальклорнай творчасці Падняпроўскага рэгіёна характэрны карагодныя гульні, песні, танцы, якія сінтэзаваны ў сюжэтна-драматычных дзеяннях, прымеркаваных да разнастайных каляндарных і сямейных свят: Юр'е, Сёмуха, Купалле, Спас, вяселле, радзіны. У гэтай сувязі найбольш характэрнымі для рэгіёна Падняпроўя лічацца песні веснавога цыкла (маслянкі, вяснянкі, «гуканні», вясновыя карагоды, Сёмуха, Тройца, Юрый).

Прыклады такіх песен мы знаходзім у вёсках Бабруйскага, Касцюковіцкага, Хоцімскага, Клімавіцкага, Клічаўскага, Чавускага, Чэрыкаўскага, Асіповіцкага, Бялыніцкага і Глускага раёнаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напевы песен адпавядаюць апісанням у існуючых выданнях, але многія з іх выдаюць мелодыка-інтанацыйныя і тэкставыя варыянты, што датычыць эвалюцыйных і творчых працэсаў у існаванні музычнага фальклору. Ёсць сярод песен купальскія, жніўныя, калядныя, якія адпавядаюць агульнабеларускім або агульнаславянскім традыцыям і сведчаць аб іх каранях.

На Магілёўшчыне існуюць старадаўнія традыцыі сямейна-бытавых абрадаў. Вяселле і хрэсьбіны – гэта тыя абрадавыя дзеянні, якія выяўляюць трывалую тэндэнцыю да захавання і ўзнаўлення. Жанравы склад вясельных песен вельмі разнастайны – ад велічальных да жартоўных.

Значная роля ў фальклорным мастацтве Магілёўскай вобласці адводзіцца карагодам. Карагоды – адзін з характэрных жанраў культуры Падняпроўя. У экспедыцыйных пошуках зафіксаваны абрадавыя і пазаабрадавыя танцы і гульні, карагоды.

Вельмі разнастайна прадстаўлены на Магілёўшчыне пазаабрадавыя песні. Гэта балады, каляндарныя песні працоўнага кола, сацыяльна-бытавыя, лірычныя. Усё гэта дае стракатую і багатую карціну фальклорных узораў Магілёўшчыны і з'яўляецца прыкладам глыбокіх і разнастайных традыцый, іх пераемнасці і эвалюцыі.

Цікавасць да глыбінных традыцый народнай культуры, якая не згасае і ў гарадах, – гэта знак яе запатрабаванасці на ўзроўні нацыі ў цэлым. У гэтым сэнсе фальклорна-этнаграфічныя звесткі, пададзеныя ў навуковых крыніцах, матэрыялах, асобных зборніках, аўдыятэках, тэматычных выданнях з'яўляюцца каштоўным навуковым сведчаннем такой характэрнай рысы беларускага менталітэту, як заглыбленасць у каранёвыя формы сваёй культуры, уяўляюць сабой крыніцу ведаў для ўсіх, хто хоча пазнаць гісторыю і мастацтва беларускага народа.

Адным з фундаментальным даследаванняў Магілёўскага Падняпроўя з'яўляецца першы том з серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Магілёўскае Падняпроўе». У аснову выдання пакладзены матэрыялы трохгадовага (1993–1995) шматаспектнага экспедыцыйнага абследавання тэрыторыі рэгіёна ў рамках Праграмы падтрымкі традыцыйнай культуры (1994–1996), якія дэманструюць вялікую збіральніцкую работу даследчыкаў.

Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі – гэта серыя навуковых анатаваных кампакт-дыскаў, ініцыяваная супрацоўнікамі кабінета традыцыйных музычных культур Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:

выпуск 8 серыі – «Этнамузычныя традыцыі ўсходнебеларускага рэгіёна: Чавушчына» – распрацаваны па выніках экспедыцыйнага даследавання народнай песеннай культуры Чавускага раёна Магілёўскай вобласці, праведзенага Т. Бярковіч, Т. Канстанцінавай і В. Прыбыловай у 2016 г.;

выпуск 9 серыі – «Народны спявак-карыфей са Шклоўшчыны Віктар Петакоў» працягвае тэматычную лінію, прысвечаную «партрэтам» выдатных носьбітаў народных музычных традыцый Беларусі, 2017 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Песні в. Цяхцін (Бялыніцкі р-н)» – электроннае выданне, створанае РМГА «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Падрыхтоўка аўдыятрэкаў – Марыя Варахоб, тэксты песень – Марыя Варахоб, Аляксей Крукоўскі, вокладка – Яўген Барышнікаў, 2019 г.

Аўдыявыданне «Песні традыцыйнага вясельнага абраду в. Клін Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці» – інвентар НКС «Жывая спадчына Беларусі».

Агульная аўдыятэка на базе Магілёўскага метадычнага цэнтра, зборнікі «Песні Магілёўшчыны», «Песні Глушчыны», «Беларуская вечарына» (падрыхтаваныя цэнтрам сумесна з аўтарам, выкладчыкам тэарэтычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага музычнага каледжу імя М. А. Рымскага-Корсакава Зыкавай Л. В.), зборнікі матэрыялаў па выніках абласных творчых праектаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Скарбніца Падняпроўя», «Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны», Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Песенное и танцевальное фольклорное наследие: от традиций до современности», «Песні з сялянскіх хат» (Краснаполле, РЦК, Марчанка В. А., 2015) яскрава сведчаць аб перспектывах захавання і адраджэння спеўных традыцый Магілёўскай вобласці.

Значную работу па захаванню песеннай спадчыны выконваюць калектывы Магілёўскай вобласці.

«Спеўную традыцыю выканання хрэсьбінных і вясельных песень в. Паршына Горацкага раёна» захоўвае народны фальклорны ансамбль «Паршынскія зоры», які працуе на базе Паршынскага цэнтра культуры ДУК «ЦКС Горацкага раёна» з 1986 г. і ў сакавіку наступнага года адзначыць 35 год сваёй творчай дзейнасці. Сёння ў яго склад уваходзіць 10 чалавек: 9 жанчын (45–70 гадоў) і 1 мужчына (45 гадоў). З 2006 г. ансамблем кіруе Уладыка Любава Васільеўна. Калектыў з'яўляецца пераемнікам песенных традыцый сваіх папярэднікаў, носьбітаў традыцыйнага абрадавага і песеннага фальклору сваёй мясцовасці. У ранейшым саставе калектыў «Паршынскія зоры» праіснаваў 30 год.

Улічваючы сталы ўзрост былых удзельніц, было зразумела, што перад кіраўніком стаяла надзённая задача – як мага больш зафіксаваць, запісаць, пераняць у чыстым выглядзе каштоўны матэрыял, які знаходзіўся на мяжы знікнення. На працягу многіх гадоў вялася карпатлівая работа па захаванню рэпертуару. Кожная песня запісвалася на папяровым і лічбавым носьбітах, апрацоўвалася па тэматыцы і кірунках, што паспрыяла стварэнню багацейшага архіва.

Правядзенне сумесных з удзельніцамі ансамбля народных песень «Суседкі» і дзіцячага фальклорнага ансамбля «Зорачкі» рэпетыцый і мерапрыемстваў дало магчымасць пераняць ад носьбітаў фальклор у аўтэнтычным выглядзе. На працягу многіх гадоў жанчыны-паслядоўнікі дасканала вывучалі аўтэнтычны фальклорны рэпертуар сваіх знакамітых зямлячак, пераймалі манеру выканання, своеасаблівасці меладычнага строю і каларыту, мясцовага моўнага дыялекту, таму не спынялася работа ансамбля нават на кароткі тэрмін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2017 год народны фальклорны ансамбль «Паршынскія зоры» сустрэў у поўнасцю аднаўленым саставе. На змену старэйшым удзельніцам прыйшлі маладыя, актыўныя, таксама ўлюблёныя ў сваю спадчыну і беларускую народную песню людзі. Новыя ўдзельнікі прынеслі ў калектыў новы подых, новае жыццё. Улічваючы творчыя здольнасці новага складу калектыву, з'явілася магчымасць значна пашырыць яго рэпертуар, у аснове якога перш за ўсё мясцовы песенны фальклор, а таксама творчыя і выканаўчыя рэсурсы.

Галоўная задача, якая стаіць па-ранейшаму перад калектывам-пераемнікам, – дасканальнае вывучэнне, захаванне і папулярызацыя багатай творчай спадчыны свайго рэгіёна. Дзякуючы гэтаму, цяперашні склад ансамбля «Паршынскія зоры» мае адметныя праграмы, адна з якіх складаецца з аўтэнтычных фальклорных песень сваёй мясцовасці – «Песні роднай зямлі», а таксама праграмы народных песень «Калі душа спявае», «Паршынская весялуха», «Гучыць песня – жыве вёска» і інш.

У выступленнях ансамбль часцей за ўсё выкарыстоўвае тэатралізацыю пры выкананні беларускіх народных песень, народны гумар, сабраны і запісаны ад землякоў.

Кожны раз на сцэнічных пляцоўках рознага ўзроўню калектыў пачынае свае выступленні з песень, якія дасталіся ў спадчыну ад Горацкіх знакамітых землякоў.

Пры ўзнікненні цяжкасцей і пытанняў пры вывучэнні мясцовага аўтэнтычнага фальклорнага матэрыялу ансабль звяртаецца (пакуль існуе такая магчымасць), да сваіх былых удзельніц-носьбітаў, якія з задавальненнем праводзяць майстар-класы.

Іх засталося толькі тры чалавекі, але да сённяшняга часу яны – нашы галоўныя настаўнікі і крытыкі. Заняткі і рэпетыцыі калектыву праходзяць рэгулярна, таму ў кожным новым выступленні можна прасачыць наяўнасць росту прафесіяналізму, навізну і разнастайнасць рэпертуару, павышэнне ўзроўню артыстызму ўдзельнікаў. Праграмныя выступленні сталі жывымі і цікавымі.

Дзякуючы амаладжэнню ўдзельнікаў калектыву «Паршынскія зоры» ў ім цесна пераплятаюцца даўніна і сучаснасць. У ансамблі пастаянна вядзецца работа над ўдасканаленнем вакальных магчымасцей удзельнікаў, калектыў знаходзіцца ў творчым пошуку розных інавацыйных форм дзейнасці. У апошні час пры выкананні фальклорных жартоўных песень і карагодаў ансамбль пачаў выкарыстоўваць шумавыя народныя інструменты (бубен, трашчоткі, стукалкі, гаршкі і інш.) Дзякуючы новым падыходам адбываецца далучэнне моладзі і школьнікаў да багацейшай і бясцэннай спадчыны свайго народа. Калектыў працуе ў цеснай сувязі з Паршынскай ДУА «Вучэбна-выхаваўчы комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Горацкага раёна», на базе якой працуе дзіцячы фальклорны калектыў «Зорачкі».

Удзельнікі дзіцячага калектыву вывучаюць рэпертуар калектыву «Паршынскія зоры», разам з дарослымі ўдзельнічаюць у правядзенні сумесных свят і абрадаў. Аднаўлены калектыў «Паршынскія зоры» даўно і цесна супрацоўнічае з творчымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектывамі ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Горацкага раёна», народным фальклорным ансамблем «Таямніцы», ажыццяўляе супрацоўніцтва з кафедрамі беларускай і рускай мовы, міжнародных сувязей і давузаўскай падрыхтоўкі БДСГА. На базе аграсядзібы «Радавое гняздо», якая размяшчаецца на ўскраіне г. Горкі, арганізуецца сямейная ўрачыстасць «Беларускае вяселле» на аснове матэрыялаў мясцовых фальклорных традыцый.

Сумесныя мерапрыемствы са школьнікамі і студэнтамі, у тым ліку з замежнымі, праводзяцца з мэтай зберажэння і папулярызацыі нацыянальнай культуры свайго рэгіёна, знаёмства моладзі і падрастаючага пакалення з лепшымі традыцыямі беларускай нацыянальнай культуры, а таксама замежных краін.

Традыцыйныя святы сяброўства і нацыянальных культур «Вянок творчасці і дружбы», сумесныя тэатралізаваныя святы, абрады, гульнёвыя праграмы з удзелам школьнікаў і замежных студэнтаў («Беларускія калядкі», «Гуканне вясны, «Беларускія вячоркі», «Мясцовыя пасядзелкі») выклікаюць усё большую цікавасць дзяцей і моладзі, што дае ўпэўненасць у тым, што песенны і вусны абрадавы фальклор будзе захоўвацца яшчэ не адным пакаленнем, і дзякуючы творчай сувязі з замежнымі студэнтамі БДСГА пра іх будуць ведаць далёка за межамі нашай краіны.

За апошнія 3 гады калектыў стаў удзельнікам народных свят і абрадаў, тэлевізійных праграм і праектаў нацыянальнага тэлебачання. Неаднаразова з поспехам выступаў на сцэнічных пляцоўках самага высокага ўзроўню.

Народны аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Паршынскія зоры» да сённяшняга дня быў і застаецца гонарам Горацкага краю.

Калектыў – пастаянны ўдзельнік раённых свят, шматлікіх тэматычных мерапрыемстваў, прысвечаных святочным датам каляндара, дзяржаўным святам Рэспублікі Беларусь. На працягу многіх год аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Паршынскія зоры» ажыццяўляе выязную канцэртную дзейнасць ва ўстановы культуры раёна, яго добра ведаюць як у горадзе, так і ў аддаленых і маланаселеных вёсках Горацкага раёна. Стала традыцыяй у канцы творчага сезону праводзіць навагодні справаздачны канцэрт калектыву аг. Паршына.

У праграмах такіх канцэртаў удала спалучаюцца песні старога і новага рэпертуару, народныя традыцыйныя абрадавыя дзеянні, тэатралізацыя і народны гумар, што робіць выступленні калектыву больш яркімі, запамінальнымі і цікавымі. Калектыў пастаянна вядзе работу па эстэтычнаму выхаванню гледачоў, далучае яго да сваёй спадчыны, папулярызуе традыцыйную беларускую нацыянальную культуру, якая яднае вясковую супольнасць, садзейнічае пераемнасці традыцый ад старэйшага пакалення да малодшага, а таксама захоўвае лакальную спеўную, абрадавую, харэаграфічную спадчыну. Канцэртныя выступленні калектыву адрозніваюцца сваёй даступнасцю, аб'яднаннем розных узроставых груп насельніцтва – ад дзяцей і моладзі да людзей сталага ўзросту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Высокую ацэнку і добрыя водгукі аб мастацкім узроўні выканаўчага майстэрства калектыву па захаванню своеасаблівасцей галасавога строю і рэгіянальнай манеры выканання аўтэнтычных фальклорных песень далі галоўныя спецыялісты і госці рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня-2018». На пасяджэнні круглага стала ў рамках фестывалю (пры абмеркаванні і падвядзенні вынікаў фестывалю) быў зроблены акцэнт на фальклорную праграму народнага аўтэнтычнага фальклорнага ансамбля «Паршынскія зоры», удалую пераемнасць, захаванне і папулярызацыю своеасаблівасцей традыцыйнай песеннай культуры. Песні, якія нарадзіліся на Паршынскай зямлі некалькі стагоддзяў назад, яшчэ доўга будуць гучаць і праслаўляць Горацкі край сваёй адметнасцю і прыгажосцю.

Элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Мясцовы стыль песеннай, танцавальнай і народна апавядальнай лакальнай традыцыі міжрэчча Сожа і Проні в. Галавенчыцы Чавускага раёна» прадстаўляе і захоўвае аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Незабудкі» культурна-спартыўнага цэнтра аг. Вусце ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна», мастацкі кіраўнік Кавалёва Людміла Канстанцінаўна. Ансамбль «Незабудкі» існуе з 1957 г.

Асаблівасці традыцый в. Галавенчыцы вылучаюцца шырынёй захавання разнастайных твораў, як народнай прозы, так і музычнай, і харэаграфічнай мясцовай традыцыі. Спадчына гэтая ва ўвасабленні творчага калектыву выразна адлюстроўвае мастацкія асаблівасці традыцыйнай культуры Галавенчыцаў і іх наваколля. Удзельніцы аўтэнтычнага гурта – яшчэ і выдатныя носьбіты мясцовых звычаяў, абрадаў, наогул светаразумення. Рэпертуар калектыву мае разнастайныя абрадавыя і пазаабрадавыя песні, традыцыйныя танцы, гульні, традыцыйныя веды абрадаў, звычаяў, казак, легенд, паданняў, былічак, прымет і павер'яў. Удзельнікам калектыву ўдалося захаваць мясцовы стыль, сваеасаблівую манеру выканання, традыцыйны ўнікальны рэпертуар каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых песен. Таксама яны ведаюць пахавальныя і памінальныя абрады, замовы, богамаленныя спевы, якія спяваюць на Міколу, Міхайла, Варвару, Нараджэнне Хрыстова і інш.

Акрамя таго, яны валодаюць тэхнікай ткацтва, вышыўкі працягам і крыжам, вязання, вырабаў карункаў, выцінанак, саламяных павукоў і г.д. У побыце маюць шмат вышытых рэчаў: абрусы, рушнікі, падкоўдранікі, прасціны, якімі карыстаюцца і зараз.

Ведаюць мясцовую традыцыйную кухню, старадаўні рэцэпт выпечкі хлеба, рэцэпт прыгатавання квасу і піва.

У 2015 г. у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ансамбль прыняў удзел у этнаграфічным канцэрце «Песенныя стылі ўсходняй Беларусі», прысвечаным XXIV Міжнародным чытанням памяці Л. С. Мухарынскай у рамках Міжнароднага фестывалю этнакультур, дзе былі прадэманстраваны матэрыялы, запісаныя ў час фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі па збору песенна-музычнага матэрыялу ў 2014 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У складзе экспедыцыі былі навуковыя супрацоўнікі аддзела музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі – Канстанцінава Таццяна Леанідаўна і Прыбылова Васіліна Міхайлаўна, загадчык кабінета традыцыйных музычных культур УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» Бяркові Таццяна Леанідаўна і метадыст па традыцыйнай культуры раённага цэнтра культуры і вольнага часу ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна» Далецкая Алеся Віктараўна.

У час работы ўдзельнікамі экспедыцыі зроблены запісы на відэа і аўдыяапаратуру твораў традыцыйнага мастацтва. Сярод іх – абрадавыя песні вясельнага і пахавальнага абрадаў, калядныя, вясновыя і восеньскія, траецкія, купальскія і жніўеньскія абрадавыя песні, бяседныя, хрэсьбінныя, а таксама шмат пазаабрадавых песен. Не абыйшлося і без цікавых расказаў, як у старыну святкавалі вяселле ці хрэсьбіны.

У в. Галавенчыцы акрамя разнастайнага песеннага матэрыялу запісаны традыцыйныя мясцовыя гульні, танцы, карагоды, казкі, легенды і паданні ад народнага фальклорнага гурту «Незабудкі». Увесь матэрыял апрацаваны і адпраўлены ў фонаархіў этнамузыкі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З пачатку 2016 г. гурт «Незабудакі» наведваюць настаўнікі і вучні з фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыяй па збору вуснай народнай творчасці з дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа №1 г. Чавусы» і «Вусцянскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа». У жніўні 2016 г. калектыў з'яўляецца ўдзельнікам Міжнароднага фестываля міфалогіі «У госці да Лепельскага Цмока» г. Лепель Віцебскай вобласці. У верасні 2016 г. да гурта завітала фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя сумесна з кіраўніком этна-гурта «Vuraj» Сяржуком Доўгушавым (г. Мінск). У мэтах прапаганды і папулярызацыі творчасці народнага гурта вынікі экспедыцыі ўнесены ў рэпертуар этна-гурта «Vuraj».

Гурт таксама прымаў удзел у абласным творчым праекце «Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны».

Па выніках экспедыцый года запісаны аўдыядыск «Этнамузычныя традыцыі ўсходнебеларускага рэгіёна: Чавушчына». Аб творчасці ансамбля Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Беларускі відэацэнтр» зняты відэафільм «Жорсткі раманс». Самы першы фільм быў зняты ў 1995 г. студыяй «Беларусьфільм» з удзелам фальклорнага гурта «У святыя вечары на Каляды» (сцэнарыст М. А. Козенка, навуковы кансультант Т. Б. Варфаламеева). Аб творчасці ансамбля публікуюцца артыкулы ў розных СМІ, з іх у апошнія гады – у раённай газеце «Іскра», рэспубліканскай газеце «Звязда». Таксама інтэрнэт-публікацыі на партале Mogilevnews.by (Інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці»).

У метадычным аддзеле Чавускага раённага Цэнтра культуры і ў культурна-спартыўным цэнтры аг. Вусце, пры якім дзейнічае ансамбль, сабраны тэкставыя матэрыялы песен, расшыфроўкі, відэа- і аўдыяматэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На дадзены момант ў ансамблі «Незабудкі» 3 носьбіты: Казлова Надзея Данілаўна (84 гады), Каханоўская Людміла Сцяпанаўна (83 гады), Філіпчэнка Валянціна Лявонцьеўна (82 гады).

Прыклады мерапрыемстваў, праектаў, праграм іншых мерапрыемстваў з удзелам носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны за перыяд 2020 г.:

урачыстае адкрыццё раённага Цэнтра культуры і вольнага часу г. Чавусы;

абласная калегія ўпраўлення культуры;

юбілей народнага ансамбля народнай музыкі і песні «Землякі» з удзелам народнага аўтэнтычнага фальклорнага ансамбля «Незабудкі».

Народны ансамбль народнай музыкі і песні «Землякі» ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Чавускага раёна» вывучае і выкарыстоўвае з мэтай захавання і папулярызацыі рэпертуар народнага аўтэнтычнага фальклорнага ансамбля «Незабудкі». Праводзяцца фотавыставы народнага аўтэнтычнага фальклорнага ансамбля «Незабудкі».

У в. Клін Хоцімскага раёна існуе аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Медуніца», які з'яўляецца носьбітам нематэрыяльна-культурнай спадчыны вясельных песень свайго рэгіёна («Песні традыцыйнага вясельнага абраду в. Клін Хоцімскага раёна»). Удзельніцамі калектыву з'яўляюцца жанчыны ад 49 да 83 гадоў.

У 2011 г. на момант надання вясельным песням в. Клін статусу нематэрыяльна-культурнай каштоўнасці ў склад калектыву ўваходзілі 7 удзельніц (ад 70 да 85 гадоў).

На сённяшні дзень у калектыве 10 удзельніц, з першага саставу засталіся 3 жанчыны – Ніна Афанасаўна Гаўрычэнка (1943 г.н.); Зінаіда Арцёмаўна Баландзенка (1947 г.н.); Ніна Паўлаўна Дземянкова (1937 г.н.).

Штогод раённым цэнтрам культуры праводзіцца фестываль «З крыніц жыватворных», дзе народны аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Медуніца» прымае ўдзел і выконвае песні вясельнага цыкла. Таксама штогод у раёне правозіцца злёт маладых спецыялістаў. У яго рамках з мэтай папулярызацыі і захоўвання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей на базе гісторыка-краязнаўчага музея сумесна з аўтэнтычным фальклорным ансамблем «Медуніца» в. Клін маладыя спецыялісты маюць магчымасць прыняць удзел у імпрэзе – абрадзе «Вяселле».

Песні калектыву выкарыстоўваюцца ў тэатралізаваных пастановах «Вяселле», «Заручыны», «Вячоркі», якія праходзяць падчас наведвання гасцей у в. Клін Хоцімскага раёна.

У маі 2020 г. аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Медуніца» прымаў удзел у тэлепраграме «Жывая культура» (тэлеканал «Беларусь-3»), дзе быў прадстаўлены ўрывак абраду «Вяселле», у якім гучалі вясельныя песні.

Сваё мастацтва калектыў перадае маладому народнаму фальклорнаму калектыву «Адраджэнне» раённага цэнтра культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работнікі метадычнага аддзела сумесна з кіраўніком ансамбля «Адраджэнне» Ю. А. Мамчанка праводзяць фальклорныя экспедыцыі па збору вясельных песен. На сённяшні дзень у скарбонцы калектыву «Адраджэнне» налічваецца шмат песен аўтэнтычнага фальклорнага ансамбля «Медуніца», і не толькі вясельнага цыкла.

Акрамя таго, што тэксты зафіксаваны і захоўваюцца на носьбітах рознага тыпу, новы састаў калектыву «Медуніца» разам з калектывам «Адраджэнне» практыкуюць іх выкананне.

Усяго ў Магілёўскай вобласці дзейнічае больш за 30 фальклорных калектываў.

Творчая дзейнасць калектываў аказвае вялікі ўплыў на захаванне фальклорнай спадчыны рэгіёна і яе актуалізацыю ў сучасным грамадстве. У тэкстах песень, у мове носьбітаў захоўваюцца галоўныя фанетычныя і лексічныя рысы ўсходнебеларускага дыялекту.

Значны ўклад у папулярызацыю фальклору ў маладзёжным асяроддзі ўносяць аўтэнтычныя фальклорныя калектывы. Эфектыўным сродкам з'яўляецца арганізацыя дзіцячых фальклорных калектываў, ансамбляў, гурткоў і іншых аб'яднанняў, дзе дзеці далучаюцца да розных відаў народнага традыцыйнага мастацтва, вывучаюць, пераймаюць і папулярызуюць аўтэнтычную мастацкую культуру свайго краю. Пераемнасць таксама здзяйсняецца шляхам стварэння калектываў-спадарожнікаў на базе дарослага фальклорнага калектыву.

Краснапольскі раён мае багатую фальклорную спадчыну, якая прадстаўлена песнямі, гульнямі, абрадамі і звязана з каляндарнымі і сямейнымі абрадавымі практыкамі. Клубныя работнікі СДК, кіраўнікі аматарскіх калектываў працягваюць даследчую работу па збіранню незабыўных фальклорных твораў і робяць усё магчымае па іх папулярызацыі і актуалізацыі.

На працягу 25-ці гадоў Марчанка Валянціна Аляксандраўна разам са сваім калектывам з в. Горы – народным фальклорным ансамблем «Горскія харашухі» Краснапольскага раёна мэтанакіравана займаецца пошукам, перайманнем і ўвядзеннем у культурнае жыццё свайго рэгіёна аўтэнтычнай народнай спадчыны Краснапольшчыны.

Спеўная манера калектыву «Горскія харашухі» характарызуецца натуральным, адкрытым, роўным гукам; моцным, яркім, гучным голасам; захаваннем асаблівасцей дыялекту і выканаўчай культуры; імправізацыяй выканання.

Гонарам ансамбля, яго сапраўднымі «зоркамі» з'яўляюцца старэйшыя ўдзельніцы Картузова Вера Пятроўна (1940 г.н.), Магілеўцава Лідзія Кузьмінічна (1938 г.н.) – носьбіты аўтэнтычных твораў. У іх рэпертуары шмат унікальных «жамчужын» песеннай творчасці сваёй малой радзімы: «Ой, белая лябёдачка ваду замуціла», «Удоль па вуліцы бяседа ідзе», «Шэра вутачка на моры купалася», «Каса мая русая», «Жыцечка яравое», «У садзе груша расла», «Ой, паходжана, ой, паброджана», «Ой, што ета за купец», «А чом, салавейка, ты смуцён, невясёл»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Як паехаў, ой, мой мілы ў дарогу», «Юр'е, уставай рана», «Расцвіла ў лузе лаза», «Ой, цёмная ночачка», «Дзяўчоначка па грыбы хадзіла», шмат вясельных.

На падставе напрацаванага матэрыялу ладзяцца тэматычныя праграмы і прэзентацыі, напрыклад, «Вясельная спадчына малой радзімы», «Лірыка кахання», «Пакроўскія вячоркі», «Песенная традыцыя вёскі Горы», «Гісторыя святой крыніцы», «Сівыя легенды мясцовага ўрочышча», «Родная хата працай багата» (знаёмства з этнаграфіяй), узнаўляюцца святочныя, абрадавыя фрагменты – свята Пасхі «Хрыстос уваскрос, сын Божы», вяселля, зажынак, дажынак, каляд.

Сённяшні састаў «Горскіх харашух» папаўняецца былымі выпускнікамі дзіцячага ансамбля «Крынічка».

Метадычным аддзелам Краснапольскага раённага Цэнтра культуры распрацаваны сацыяльна-творчы і практычна-даследчы праект «Забытае ўваскрашаецца». Ён мае сваёй мэтай і задачамі актывізацыю фальклорна-этнаграфічнай дзейнасці ўстаноў культуры па выяўленню, фіксацыі, захаванню і папулярызацыі ўнікальнай аўтэнтычнай, фальклорнай, этнаграфічнай спадчыны свайго краю, якая адлюстроўвае этнічныя і культурна-гістарычныя асаблівасці Краснапольшчыны; засваенне новых форм трансляцыі іміджавай культуры Краснапольшчыны.

Сярод абраных напрамкаў работы і мерапрыемстваў праекта – фальклорныя экспедыцыі, майстар-класы, семінары, распрацоўка і апрабацыя этнамаршруту, конкурс фальклорных калектываў і салістаў у розных намінацыях «Чары сівой даўніны», розныя формы папулярызацыі вынікаў праекта – адкрыццё і абнаўленне этнаграфічных куткоў у сельскіх Дамах культуры, публікацыі ў СМІ, выданне аўдыявідэаматэрыялаў, размяшчэнне матэрыялаў на сайтах.

Збіранне фальклору, беражлівыя адносіны да яго, імкненне захаваць жамчужыны народнай мудрасці і перадаць іх нашчадкам павінны прынесці станоўчыя вынікі, паспрыяюць захаванню і развіццю традыцыйнай культуры свайго рэгіёна, яго багатай песеннай спадчыны.

Безумоўна, пры захаванні спеўных лакальных традыцый нямала залежыць ад кіраўнікоў фальклорных калектываў, іх разумення і ўспрымання фальклору як нацыянальнай каштоўнасці, правільнага разумення перадачы гэтых каштоўнасцей. Бо менавіта кіраўнікі калектываў займаюцца фарміраваннем другасных носьбітаў і пераемнікаў фальклору.

Каб другіх навучыць, трэба самім шмат ведаць, дэталёва валодаць сакрэтамі фальклорнага мастацтва і творчасці.

Галоўнымі задачамі дзейнасці калектываў з'яўляюцца аднаўленне, захаванне і пераемнасць традыцыйнай вакальнай і танцавальнай спадчыны Магілёўшчыны; выхаванне падрастаючага пакалення сродкамі традыцыйнага мастацтва; далучэнне да мясцовых традыцый дзяцей, падлеткаў, моладзі, практычнае засваенне імі мясцовага вакальнага і танцавальнага фальклору, а таксама папулярызацыя мясцовага фальклору і рамёстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заслугоўвае ўвагі дзейнасць узорнага фальклорнага калектыву «Купалачка» Дмітрыеўскай дзіцячай школы мастацтваў Клічаўскага раёна, створанага ў 1996 г. і педагагічны вопыт у галіне народнага мастацтва кіраўніка калектыву Коктыш Наталлі Васільеўны.

У раёне вядзецца мэтанакіраваная работа па збору, апрацоўцы і сістэматызацыі твораў аўтэнтычнага фальклору, па выяўленню яго носьбітаў.

З гэтай мэтай кожны год выкладчыкі і вучні праводзяць фальклорна-краязнаўчыя экспедыцыі ў вёскі раёна, робяць запісы фальклорных твораў.

На базе дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Клічава» арганізаваны ўзорны фальклорны гурт «Купалачка», удзельнік і пераможца шматлікіх абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў. Удзельнікі гурта займаюцца зборам матэрыялаў на тэрыторыі свайго рэгіёна: тыпаў жылля, асаблівасцей абрадаў, мовы, фальклору.

Гуртоўцамі створаны невялікі гісторыка-краязнаўчы музей. Экспанаты, сабраныя вучнямі і настаўнікамі школы, знаёмяць наведвальнікаў з побытам, культурай беларусаў.

Гэта прадметы хатняга ўжытку, гліняны посуд, збаны, глякі, міскі, кубкі – неабходныя рэчы ў гаспадарцы, вышыўкі на святочным адзенні, ткацтва, вязанне шыдэлкам і пруткамі, разьба па дрэву, пляценне.

У ходзе даследаванняў па фальклору і этнаграфіі вывучаны дзіцячы калядны абрад «Куры».

Дзяўчаты з гурта «Купалачка» адрадзілі ў тэлевізійным праекце «Terra Historika» піліпаўскія вячоркі. У час спеваў яны працавалі на кроснах, якія былі адноўлены і прыведзены ў рабочы стан.

Даследавана «Тэхніка пляцення паясоў на дошчачках». Дзякуючы гэтаму выкладчыкі і дзеці асвоілі працэс вырабу беларускіх паясоў. Касуха Наталля Юр'еўна, выкладчык дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, разам з дзецьмі адраджае мясцовы строй ткацтва і вышыўкі.

Праведзена этнаграфічная экспедыцыя па пошуку і збору матэрыялаў па вясельнай абраднасці Клічаўшчыны. Падчас экспедыцыі наведалі 16 населеных пунктаў раёна. Выяўлены 23 тканыя і вышытыя рушнікі, якія мелі дачыненне да вясельнай абраднасці. У час экспедыцыі запісаны вясельныя звычаі, традыцыі, абрады. Сабраны матэрыял апрацаваны, сістэматызаваны. Выканана рэканструкцыя двух рушнікоў і вясельнага галаўнога ўбору.

Песенная лірыка ўвогуле стаіць асобна ў фальклорным мастацтве, таму што яна з'яўляецца адзіным жанрам, які літаральна пранізвае ўсе астатнія. І ў рэкруцкіх песнях, і ў пакосных, паходных, вясельных, гульнёвых і карагодных – паўсюль ёсць элементы лірыкі.

Калі праз інфармацыйны бок песень мы даведваемся аб абрадах, традыцыях, паводзінах у тых або іншых абставінах, то пры дапамозе лірыкі нам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

удаецца зразумець, як адчуваць і як выказваць свае пачуцці: дзе сумаваць, а дзе весяліцца, колькі заставацца ў журбе і як суцяшаць сябе, аб чым сумаваць, а на што след забыцца. Тыя інструкцыі, прысутнасць якіх мы адчуваем у песнях, якія ўваходзяць у душы праз каналы рытму, адкрываюць таямніцы таго, што зберагалася і захоўвалася вякамі.

На апошнім годзе навучання выкладчык ужо да драбніц ведае сваіх вучняў, заўважае асаблівасці кожнага дзіцяці, іх сімпатыі і антыпатыі, а таму і здольны аб'яднаць іх у дуэты, трыо, ансамбль.

Фальклорны ансамбль павінен улічваць сінкрэтычнасць падрыхтоўкі вучняў па напрамку дзейнасці «Народная творчасць», неабходна выкарыстоўваць народную песню ў сувязі з іншымі жанрамі: прыказкі, танцамі, элементамі фальклорнага тэатра і г.д.

Падчас заняткаў у фальклорных гуртах адным з галоўных момантаў павінна з'яўляецца выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў з экспедыцый, архіваў з узорамі рэальнага гучання. Для выканання напеву адпаведна яго гісторыка-стылявому кантэксту неабходна багатая слыхавая практыка, якая фарміруецца пры дэталёвым аналізе вакальна-тэхнічных сродкаў музычнай выразнасці, жанравых і стылявых асаблівасцей. Пры наяўнасці ў аўдыяілюстрацыях напеваў аднаго жанру і аднаго арэала ёсць магчымасць вывучэння яскравых індывідуальных стыляў таленавітых спевакоў з народнага асяроддзя.

Пры рабоце над народнай песняй паслядоўна здзяйсняюцца два падыходы: арыентацыя на арыгінальнае, аўтэнтычнае гучанне і на сцэнічны жанр, абмежаваны рамкамі эстрадна-тэатральнай эстэтыкі.

Праца з аўдыяматэрыяламі не носіць характару безумоўнага капіравання, але становіцца свядомай імітацыяй жывой песеннай інтанацыі.

Зразумела, што моладзь (як сацыяльна-дэмаграфічная група) з'яўляецца вызначальнай пры распрацоўцы падыходаў для захавання і пераймання традыцый беларускіх народных спеваў. Музыка аказвае ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці: адбываецца станаўленне сапраўднага грамадзяніна з актыўнай сацыяльнай пазіцыяй, з творчым пазітыўным падыходам да жыцця. Выхоўваецца культурна развіты, неабыякавы чалавек, здольны асэнсаваць нацыянальна-культурныя традыцыі і выкарыстоўваць атрыманыя веды ў сучасным жыцці.

Неабходна распрацоўка агульных рэспубліканскіх адукацыйных вучэбных праграм, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца вывучэнне беларускай песеннай традыцыі і захаванне нацыянальнай культуры ў тым ліку лакальных спеўных традыцый, у адпаведнай стылю і жанру манеры, авалоданне вакальнай тэхнікай і спецыфічнымі рысамі рэгіянальных традыцый выканання. Знаёмства з беларускімі песнямі патрэбна пачынаць у малодшым школьным узросце праз розныя актыўныя формы дзейнасці. Гэта зацікаўлівае дзяцей і стварае падмурак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для далейшага, больш глыбокога вывучэння народнай і прафесійнай музычнай культуры і гісторыі сваёй краіны ў старэйшых класах.

Больш таго, беражлівыя адносіны да традыцый нацыянальнай культуры з'яўляюцца адной з умоў пераемнасці культурна-гістарычнага вопыту народа. Засваенне спадчыны народнай традыцыйнай культуры служыць асновай творчага развіцця асобы, умацавання сувязей паміж пакаленнямі, кансалідацыі грамадства. Каб захаваўся этнас, традыцыйная культура павінна захоўвацца.

Неабходна вядзенне паслядоўнай работы па экспедыцыйнаму даследванню мясцовых фальклорных традыцый, стварэнне ў тым ліку агульнага рэспубліканскага фальклорна-этнаграфічнага фонду.

Важным з'яўляецца шырокае выданне фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў: гэта спрыяе больш актыўнай папулярызацыі народнай культуры.

Актуалізаваць фальклор – значыць перавесці яго ў сучасныя, даступныя і зразумелыя формы існавання ў грамадстве, аднавіць яго здольнасць да функцыянавання, знайсці дзейсныя сродкі і метады прыцягнення моладзі, сугучныя з сённяшнім днём.

Творчыя праекты, фестывалі і іншыя формы, якія былі арганізаваны Магілёўскім метадычным цэнтрам па захаванню і папулярызацыі фальклорнай спадчыны Магілёўшчыны, разглядалі фальклор у рамках адносін мінулае–цяперашняе.

Як паказала практыка работы метадычнага цэнтра народнай творчасці, актуалізацыя культурнай спадчыны патрабуе комплекснага падыходу і ўздзеяння праз свядомасць. Дзейсным механізмам сталі творчыя праекты.

Абласны творчы праект «Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны» рэалізоўваўся сумесна з тэлерадыёкампаніяй «Магілёў».

У рамках праекта на базе цэнтра адбыліся творчыя прэзентацыі 21 раёна вобласці: святы творчасці, тэатралізаваныя і тэматычныя канцэрты, паказы, выставы, а таксама тэатральныя гасціныя і многае іншае.

Ідэя праекта – паказаць шырокай аўдыторыі гледачоў разнастайнасць жанраў народнай творчасці як традыцыйнага, так і сучаснага, выявіць новыя таленты рэгіёна.

Фестываль стаў дзейснай формай падтрымкі аматарскай творчасці і яркай дэманстрацыяй талентаў Магілёўшчыны. Што даў праект?

Для гледачоў – жыхары і госці абласнога цэнтра (гледачы) мелі магчымасць пазнаёміцца і з творчасцю раёнаў вобласці, багатай спадчынай фальклору.

Для арганізатараў фестывалю – прааналізаваць творчы патэнцыял раёнаў, якасны і колькасны паказчык развіцця аматарскай творчасці.

Для ўдзельнікаў – даў магчымасць ацаніць сябе, прадэманстраваць выканальніцкі ўзровень, абмяняцца вопытам.

Абласны фестываль фальклорнага мастацтва «Скарбніца Падняпроўя» быў накіраваны на папулярызацыю фальклорнай спадчыны Магілёўскага Падняпроўя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фестываль праводзіўся ў мэтах вывучэння, аднаўлення і захавання мясцовых (лакальных) традыцыйных культур, фарміравання каштоўнасных арыенціраў беларускага грамадства ў кірунку асэнсавання значнасці традыцыйнага мастацтва ў сістэме сучаснай беларускай і сусветнай культуры, выхавання падрастаючага пакалення сродкамі народнай спадчыны.

Абавязковай умовай фестывалю быў удзел носьбітаў фальклорнай спадчыны, дзяцей і падлеткаў як «прыемнікаў» фальклорных традыцый. Другой умовай з'яўлялася наяўнасць матэрыялаў, прадукту творчых мерапрыемстваў, як вынік даследчай работы і этнаграфічных экспедыцый, праведзеных спецыялістамі клубных устаноў у розныя перыяды.

У фестывалі прынялі ўдзел звыш 80 творчых калектываў і асобных выканаўцаў: носьбіты традыцыйнай культуры і іх пераемнікі, дарослыя і дзіцячыя аўтэнтычныя, фальклорныя калектывы, калектывы народных бытавых танцаў, народныя музыкі, майстры традыцыйных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Па выніках рэалізацыі праекта на базе цэнтра прайшлі святы, тэатралізаваныя паказы па святах і абрадах зімовага, веснавога, летняга і восеньскага цыклаў народнага календара.

Міжнароднае супрацоўніцтва, якое ажыццяўляе цэнтр, мае досыць шырокую геаграфію і спрыяе паспяховай актуалізацыі традыцыйнай культуры з дапамогай супрацоўніцтва з замежнымі краінамі. Цэнтрам заключаны пагадненні аб культурным супрацоўніцтве з установамі культуры Літвы, Азербайджана, 7 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. З 2014 г. Магілёўская вобласць – член Міжнароднай асацыяцыі фальклору.

На базе цэнтра створана міжнародная пляцоўка па абмену вопытам работы па захаванню традыцыйнай культуры. Раз у два гады праводзіцца міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства», удзельнікамі якога сталі прадстаўнікі больш чым 20 краін.

За апошнія гады цэнтрам створана багатая база песеннага фальклору, які збіраўся і ў ходзе экспедыцый, і ў ходзе рэалізацыі творчых праектаў.

Рыгор Шырма лічыў, што «вышэй і прыгажэй за народную песню, калі гэта сапраўдная народная жамчужына, а не падробка пад яе, няма і быць не можа … Песня – душа народа. Але не толькі. Песня творыць народ, зbліжае людзей. Таму мы павінны ўсімі сіламі і сродкамі захоўваць і ахоўваць яе».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Памятка
# па ажыццяўленню мерапрыемстваў у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў 2021–2022 гадах для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў*

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) захаванне нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ўключае ў сябе сістэму арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і іншых мер, накіраваных на стварэнне ўмоў для бытавання, развіцця і перадачы нашчадкам нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Артыкуламі 14, 103, 107 Кодэкса, артыкуламі 17, 41 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» рэалізацыя мерапрыемстваў па захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ускладзена на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

У мэтах удасканалення сістэмы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, выканання патрабаванняў міжнародных дагавораў і нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, арганізацыі работы па захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у 2021–2022 гг. неабходна прадугледзець:

1. Безумоўнае выкананне прыярытэтных і актуальных задач у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку:

распрацоўку комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках рэгіянальных праграм, у тым ліку праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця;

планаванне фінансавых сродкаў на рэалізацыю комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2016 года № 289 «Аб парадку фарміравання, фінансавання, выканання і ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм», артыкулы 17, 41 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», артыкулы 21, 22, 209 Кодэкса);

выкананне пунктаў 1, 2, 4 рашэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 22.10.2020 № 111;

падрыхтоўку ў 2021 годзе перыядычнай справаздачы аб выкананні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА;

* Матэрыялы падрыхтаваны ўпраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўленне нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;

павышэнні ролі Дамоў культуры, рамёстваў, музеяў і іншых устаноў культуры ў захаванні нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

2. Распрацоўку комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны пры фарміраванні і зацвярджэнні рэгіянальных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021–2025 гады (Інструкцыя аб патрабаваннях да структуры дзяржаўнай праграмы і зместу справаздач аб выніках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы, зацверджаная пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 19 жніўня 2016 года № 51, Інструкцыя аб парадку прымянення бюджэтнай класіфікацыі, зацверджаная пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2008 года № 208). Пры гэтым неабходна ўключаць у комплексы мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей пры фарміраванні і зацвярджэнні рэгіянальных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021–2025 гг.:

аб'ёмы фінансавання;

маніторынг стану элементаў (мінімум 1 раз у 2 гады);

меры, накіраваныя на перадачу нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ад носьбіта да пераемніка (арганізацыя і падтрымка разнастайных форм пераемнасці);

даследаванне элементаў (супрацоўніцтва з навукова-даследчымі, адукацыйнымі арганізацыямі);

падрыхтоўку прапаноў аб уключэнні новых нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

заахвочванні (у тым ліку матэрыяльныя) носьбітаў нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

інвентарызацыю нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей з абавязковым накіраваннем актуальных звестак аб іх у адрас Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» для вядзення сайта «Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны»;

прафілактычныя мерапрыемствы (рэкамендацыі, семінары, канферэнцыі і інш.);

метадычную работу (культурна-асветную работу ўстаноў культуры);

меры, накіраваныя на захаванне адметных вартасцей элементаў;

папулярызацыю элементаў, у тым ліку на замежных мовах.

3. Пры распрацоўцы мер па ахове нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей улічваць парады асоб, якія ажыццяўлялі іх навуковую апрацоўку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і мастацкую ацэнку, пры неабходнасці прыцягваць спецыялістаў навуковага профілю (рэстаўратараў, этнамузыколагаў, фалькларыстаў, этнолагаў і г.д.) для забеспячэння захавання адметных асаблівасцей элемента, падтрымкі высокага ўзроўню мастацкага выканання і інш.

4. УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (факультэтам інфармацыйна-дакументных камунікацый, традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва) актуалізаваць вучэбныя планы і вучэбныя праграмы, у тым ліку тыя, у якіх разглядаюцца аспекты, звязаныя з нематэрыяльнымі праяўленнямі творчасці чалавека (народныя мастацкія рамёствы, абрады, традыцыя і г.д.), з улікам сучасных патрабаванняў аховы, захавання, выкарыстання, вывучэння і папулярызацыі нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

5. Выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці метадычныя матэрыялы рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Актуальныя пытанні аховы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей» ад 29 кастрычніка 2020 года, у тым ліку размешчаныя на сайце УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (http://buk.by/news_detail.php?ID=5585) і сайце «Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (http://livingheritage.by).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# II. ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў МЭТАХ РАЗВІЦЦЯ МУЗЕЙНАЙ І ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## АСНОЎНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫКАРЫСТАННЯ АДМЕТНЫХ ПРАЯЎ СВЕТАПОГЛЯДУ І МІФАЛОГІІ ЯК ЭЛЕМЕНТАЎ КУЛЬТУРНА-ПАЗНАВАЛЬНАГА ТУРЫЗМУ

***Скварчэўскі Д. В.,***
*кандытат гістарычных навук.,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэднixвякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, намеснік старшыні праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі*

Турызм з'яўляецца не толькі часткай эканамічнай сферы, але і сацыякультурным феноменам. Сёння турыстычная і экскурсійная дзейнасць – значны канал распаўсюджвання інфармацыі пра беларускую традыцыйную культуру, якая трансілюецца як жыхарам Беларусі, так і замежным гасцям. Акрамя таго, праз турыстычную дзейнасць магчыма падтрымка традыцый лакальных супольнасцей, прыроднага і культурнага ландшафту. Акрэслім асноўныя падыходы да выкарыстання адметных праяў народнага светапогляду і міфалогіі ў турызме. Прыведзеныя ў дадзенай публікацыі тэзісы сфармуляваны на падставе практычнага вопыту аўтара і тэарэтычнага асэнсавання прысутнасці міфалогіі ў турыстычнай справе Беларусі.

Традыцыйная культура і міфалогія – гэта папулярныя тэмы, да якіх звяртаюцца ў сваёй дзейнасці турыстычныя прадпрыемствы, экскурсаводы, музеі, аграсядзібы, прычым цікавасць да беларускай міфалогіі ўзрастае, пра што сведчыць з'яўленне новых турыстычных аб'ектаў, звязаных з гэтай тэматыкай. Найбольш актыўна да міфалагічнай спадчыны звяртаюцца ў рамках культурна-пазнавальнага і вясковага турызму. У гэтых кірунках міфалагічная спадчына выкарыстоўваецца, пераважна, у наступных формах:

інфармацыя па турыстычных маршрутах: экскурсаводы распавядаюць пра беларускую міфалогію, пераказваюць легенды і паданні, у якасці аднаго з тэматычна-інфармацыйных блокаў пры пераездах на турыстычных маршрутах;

тэматычная экскурсія: існуюць асобныя экскурсіі, якія звязаны з міфалогіяй і традыцыйнай культурай (напрыклад, «Музей валуноў»);

музейная экскурсія: некаторыя музейныя ўстановы маюць асобныя экспазіцыі, прысвечаныя дахрысціянскай гісторыі і культуры (напрыклад, Гродзенскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі), альбо значныя паганскія артэфакты (напрыклад, у Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі захоўваюцца тры каменныя ідалы);

адмысловыя турыстычныя аб'екты, прысвечаныя беларускай міфалогіі (Дзіцячы музей міфалогіі і лесу ў Заслаўі, Музей міфаў і экалагічная міфалагічная сцежка ў Бярэзінскім біясферным запаведніку);

асобныя тэматычныя зоны турыстычных аб'ектаў і аграсядзіб, прысвечаныя паганству і міфалогіі (напрыклад, парк гісторыі «Сула», Дукорскі маёнтак);

наведванне аўтэнтычных народных свят (напрыклад, турыстычная паездкі на калядны абрад «Цары» ў в. Семежава);

наведванне рознага кшталту этнічных і тэматычных свят, а таксама фэстаў гістарычнай рэканструкцыі (напрыклад, «Багач у Вязынцы», «У госці да радзімічаў», «Шлях Цмока»).

у турыстычнай дзейнасці выяўляюцца розныя падыходы і прынцыпы ў дачыненні да традыцыйнай духоўнай спадчыны. Можна вылучыць шэраг асноўных характэрных праблем, якія сталі тыповымі:

частае ігнараванне дасягненняў сучаснай акадэмічнай навукі пры выкарыстанні міфалогіі ў турыстычнай дзейнасці, недастатковая ступень камунікацыі з экспертнай супольнасцю ці адсутнасць такой камунікацыі;

пераважнае выкарыстанне і трансляцыя канструктаў «кабінетнай міфалогіі» XIX – пач. XX ст., выкладзеных, найперш, у творах П. Шпілеўскага, а таксама другой паловы XX ст., выкладзеных М. Кацарам, А. Лукшам і інш.;

выкарыстанне міфалагічных канструктаў і вобразаў, запазычаных у прадстаўнікоў розных сучасных расійскіх неапаганскіх рухаў (падобная інфармацыя масава прадстаўлена ў інтэрнэт-прасторы);

стварэнне ўласных міфалагічных канструктаў, пераважна на грунце недастатковай падрыхтоўкі і абазначанасці ў тэме, хаця мае месца і свядомая міфатворчасць;

нізкі ўзровень прадстаўленасці аўтэнтычнай традыцыйнай беларускай культуры (міфалагічнага пласта ў тым ліку) у турыстычнай дзейнасці. Напрыклад, аграсядзібы дэкларуюць, што знаёмяць гасцей з мясцовым фальклорам, святамі і абрадамі, кухняй, строямі, рамёствамі, аднак на самой справе ў лепшым выпадку дэманструецца абагульнены вобраз беларускай народнай культуры і яе элементаў, запазычаных з літаратуры.

Усё пералічанае стварае вялікую небяспеку замяшчэння аўтэнтычнай міфалогіі сучаснымі канструктамі, трансляцыі недакладнай ці памылковай інфармацыі, што стварае скажоны вобраз тутэйшай культуры як для беларусаў, так і для замежнікаў.

Сярод асноўных падыходаў да выкарыстання традыцыйнай духоўнай спадчыны ў турыстычнай дзейнасці можна вылучыць наступныя:

на этапе падрыхтоўкі турыстычнай праграмы і маршруту пажадана кансультацыя з экспертамі;

выкарыстанне сучаснай актуальнай навуковай інфармацыі пры падрыхтоўцы маршруту і кантрольнага / індывідуальнага тэксту экскурсіі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не ствараць уласныя міфалагічныя тэксты і дзеянні;

з улікам лакальнасці традыцыйнай культуры выкарыстанне той інфармацыі, якая адпавядае абранаму канкрэтнаму рэгіён (мясцовыя паданні, песні, святы, абрады і т.п.);

пры інтэрпрэтацыі міфалагічнай спадчыны праз сучасныя мастацкія творы (скульптуры, карціны, дызайн і т.п.) трэба абапірацца на вядомыя гістарычныя і этнаграфічныя ўзоры, стыль і мастацка-выяўленчыя каноны рэгіёна;

безумоўная перавага і падпарадкаванне інтарэсам мясцовай супольнасці, якая з'яўляецца носьбітам і захавальнікам традыцыі.

Экскурсіі, прысвечаныя міфалагічнай спадчыне, у тым ліку наведванне народных свят і абрадаў, прыродных святынь, не з'яўляюцца часткай масавага турызму. Яны разлічаны на падрыхтаваную зацікаўленую аўдыторыю.

Гэты кірунак мае шэраг асаблівасцей, з якіх вынікаюць пэўныя патрабаванні да арганізатараў тура / экскурсіі, экскурсавода і турыста. Экскурсаводы на дадзеных маршрутах павінны мець адпаведную падрыхтоўку, каб знаёміць турыстаў з тэмай.

Пры рэалізацыі тураў неабходна абавязкова тлумачыць экскурсантам правілы паводзін. Госць павінен разумець, дзе знаходзіцца, што бачыць, як можа ўспрымаць. Калі гаворка ідзе пра святы і абрады, то госць мусіць разумець сэнс падзеі і сваю ролю ў ёй. З гэтай мэтай па дарозе экскурсавод праз спецыяльная тэматычныя інфармацыйныя блокі раскрывае сутнасць свята/абраду, альбо паведамляе іншыя карысныя базавыя звесткі. Варта ўсведамляць, што ступень удзелу экскурсанта ў традыцыйных цырымоніях можа быць рознай, што неабходна ўлічваць пры стварэнні турпрадукт:

аўтэнтычныя святы і абрады ў традыцыйным асяроддзі, калі экскурсант можа быць толькі назіральнікам;

аўтэнтычныя святы і абрады ў традыцыйным асяроддзі, дзе экскурсант можа быць актыўным удзельнікам нароўні з мясцовымі жыхарамі ў выпадках, калі, напрыклад, падзея мае характар паломніцтва, альбо калі ў сілу дэмаграфічных ці іншых асаблівасцей мясцовая супольнасць не можа выканаць пэўныя дзеянні і дазваляе далучацца гасцям;

святы і абрады па-за традыцыйным асяроддзем.

Апошнія нярэдка адбываюцца ў форме рэканструкцыі, калі ўзнаўляецца толькі знешні бок без адпаведнага сэнсу, функцый і сувязі з духойнай сферай грамадства. Часта яны праводзяцца ў этнаграфічных музеях пад адкрытым небам і аграсядзібах.

Ажыццяўленне акрэсленых падыходаў на практыцы дазволіць суб'ектам турыстычнай дзейнасці і індустрыі пазбегнуць тыповых памылак, якія тут згадваліся. Дзякуючы гэтаму турыстычныя праграмы, элементамі якіх з'яўляецца традыцыйная духоўная спадчына, сапраўды будуць выконваць адукацыйна-асветныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

функцыі і спрыяць распаўсюджванню ведаў пра беларускую этнічную культуру, што таксама становча паўплывае на яе захаванне і наступнае развіццё.

# ТВОРЧАСЦЬ МАЙСТРОЎ ПА ТЭХНАЛОГІІ ВЫРАБУ ДРАЎЛЯНЫХ МУЗЫЧНЫХ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ У ДЗЕЙНАСЦІ КРУГЛЯНСКАГА РАЁННАГА ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

***Гапаева В. Э.,***
*дырэктар дзяржаўнай установы*
*«Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей»*

У вялікай фальклорнай спадчыне беларускага народа важнае месца займае інструментальная музыка. Адметныя і разнастайныя інструменты існавалі амаль па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Не з'яўляецца выключэннем і Магілёўшчына, рэгіён Прыдняпроўя. На Магілёўшчыне ставіліся да музыканта і майстра заўсёды з павагай.

Да такіх своеасаблівых і таленавітых майстроў належыць Аляксандр Антановіч Харкевіч, майстар драўляных народных музычных інструментаў з вёскі Ваўканосава, што на Круглляншчыне. Ён падбірае, апрацоўвае і вырабляе музычныя інструменты, якія былі распаўсюджаныя на тэрыторыі Круглянскага раёна. На сённяшні дзень майстры такога разраду сустракаюцца рэдка. Кожны інструмент вырабляецца ім з асаблівым падыходам, па чарцяжах, згодна параметраў, з улікам «гукавых» характарыстык і інш.

Творчасць майстра драўляных музычных інструментаў А. А. Харкевіча ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Яго інструменты, выробленыя ўручную, памятаюць цеплыню рук майстра і нясуць векавыя традыцыі, выяўляючы непаўторны голас роднай зямлі.

Народнае мастацтва глыбока ўздзейнічае на свет, валодае маральнай, эстэтычнай, пазнавальнай каштоўнасцю, увасабляе ў сабе гістарычны вопыт многіх пакаленняў. Азнаямленне з творамі народнай творчасці абуджае ў людзях адметнае ўяўленне аб Радзіме, яе культуры, спрыяе выхаванню патрыятычных пачуццяў.

Сёння не кожны мае магчымасць убачыць непасрэдны тэхналагічны працэс вырабу драўляных музычных інструментаў, дакрануцца да дадзенага рамяства, патрымаць у руках сапраўдныя драўляныя народныя інструменты.

Усё вышэйадзначанае паўплывала на пастаўленыя супрацоўнікамі музея мэты – падарыць наведвальнікам радасць творчасці, пазнаёміць з гісторыяй народных музычных інструментаў, з майстрам па вырабу драўляных народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментаў. Для яе рэалізацыі быў распрацаваны праект «Музычных спраў майстар», які дзейнічае на працягу 11 гадоў. Галоўнай аўдыторыяй праекта з'яўляюцца выхаванцы дашкольных і школьных агульнаадукацыйных устаноў раёна, удзельнікі клубаў «Яшчэ не вечар» і «Бяседа».

Рэалізацыя праекта ўключае ў сябе: супрацоўніцтва з адукацыйнымі ўстановамі, удзельнікамі клуба «Яшчэ не вечар» і афармленне серыі выстаў майстра Харкевіча А. А., збор інфармацыі, падбор наглядных дапаможнікаў, дэманстрацыйнага матэрыялу, правядзенне тэматычных музейна-педагагічных заняткаў, гутарак, майстар-класаў па вырабу музычных інструментаў, вечароў-сустрэч з майстрам, выстаў майстра, выязных выставак з КК «Аўтаклуб», «Бібліобусы» ў маланаселеныя пункты раёна, правядзенне выязных экскурсій у майстэрню Харкевіча А. А., дэманстрацыю відэафільма аб майстры, стварэнне прэзентацый («Беларускія народныя інструменты», «Творчасць майстра Харкевіча А. А.»).

У ходзе рэалізацыі праекта «Музычных спраў майстар» праходзіць азнаямленне наведвальнікаў з гісторыка-культурнай спадчынай краю. Праграма запатрабавана ў дашкольных і адукацыйных установах горада, паколькі тэматыка мерапрыемстваў цікавая і пазнавальная. У рамках праекта музей супрацоўнічае з дзіцячымі садамі, Круглянскай СШ, Цяцерынскай СШ, Комсеніцкім КПК, клубам «Яшчэ не вечар» пры Круглянскай ЦБМ. Наведвальнікі музея знаёмяцца з творчасцю майстра падчас правядзення выстаў, а жыхары Круглянскага раёна з цікавасцю назіраюць за працай майстра падчас майстар-класаў.

Захаваць мінулае для будучыні можна толькі падтрымліваючы да яго цікавасць у сучаснасці. А для гэтага спадчыну трэба вывучаць і паказваць так, каб гэта было цікава наведвальніку. Дадзены праект дапамагае вывесці музей «за сцены» да новых аўдыторый, гасцей Круглянскага раёна.

## ВЫКАРЫСТАННЕ Ў КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ ПРАЕКТАХ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ «ТРАДЫЦЫЙНАЕ БЕЛАЎЗОРЫСТАЕ ТКАЦТВА ПАНЯМОННЯ»

***Савіцкая М. В.,***
*малодшы навуковы супрацоўнік*
*аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры*
*ДУ «Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»*

Традыцыя белаўзорыстага ткацтва існавала пераважна на Панямонні. Менавіта тут белаўзорыстае ткацтва дасягнула найвышэйшага росквіту. Некаторыя тэхнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

белаўзорыстага ткацтва перыядычна існавалі і на іншых тэрыторыях Беларусі – у раёнах Падзвіння, Падняпроўя, Цэнтральнай Беларусі, але толькі ў Панямонні гэты від узорыстага ткацтва атрымаў шырокае развіццё і стаў адметнай рэгіянальнай з'явай.

Белаўзорыстае ткацтва было распаўсюджана ў сялянскім побыце на працягу XIX ст. і пераважнай часткі XX ст. Белаўзорыстыя ручнікі выкарыстоўваліся як у праваслаўных, так і ў каталікоў у радзільна-хрысціннай, вясельнай, сітуацыйнай і каляндарнай абраднасці, для святочнага прыбірання. Да пачатку XX ст. тканіны выраблялiся з самапрадзеных белых ільняных нітак, пазней сталі выкарыстоўвацца фабрычныя баваўняныя, шаўковыя ніткі.

Ад запраўкі ткацкага станка залежыць малюнак палатна. Таму майстар перш чым запраўляць аснову вызначаў тэхніку ткацтва. Белаўзорыстае ткацтва аб'ядноўвае розныя тэхнікі: аднаўточнае, двухнітовае з пераборам на дошкі (2, 3, 4, 5), двухнітовае ткацтва, чатырохнітовае аднаўточнае, чатырохнітовае двухуточнае, пяцінітовае, шасцінітовае, васьмінітовае аднаўточнае і васьмінітовае двухуточнае ткацтва, дванаццацінітовае, двухбаковы перабор, у выніку якіх утвараецца прыгожае белае палатно са складанай дробнаўзорыстай структурай паверхні і далікатнай фактурай, утворанай своеасаблівым перапляценнем нітак асновы і ўтку менавіта белага колеру. Пры іх вырабе менш увагі надавалася каляроваму ўзору, які ішоў толькі па краю вырабу, узорны малюнак часта быў сціплы або яго магло не быць увогуле – менавіта гэта адрознівае Панямонскі ручнік ад ручнікоў іншых рэгіёнаў Беларусі. Панямонскае белаўзорыстае ткацтва адрозніваецца ад вырабаў з другіх рэгіёнаў менавіта белізною палатна.

Дакладныя звесткі пра гэты элемент Яўген Яўгеньевіч Маркевіч атрымаў ад сваёй бабулі Кузьмы Надзеі Якаўлеўны (1934–2014 гг.), якая жыла ў в. Ачукевічы Навагрудскага раёна і пераняла майстэрства ад матулі. Яна навучыла ўнука Яўгена прыёмам снавання асновы і вырабу белаўзорыстых тканін. У сваю чаргу Яўген падзяліўся ведамі з майстрамі аддзела рамёстваў Валянцінай Сільвановіч і Дар'яй Банушэвіч, якія практыкуюць гэтае рамяство.

У аддзеле рамёстваў праходзяць мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю і развіццё традыцыйных тэхнік ткацтва. Арганізуюцца аўтарскія выстаўкі, прысвечаныя мясцовым традыцыям ткацтва. Кожны год праходзіць свята ткацтва, у рамках якога праводзяцца аглядныя майстар-класы. Для групы турыстаў ладзяцца экскурсіі, якія знаёмяць з мясцовымі рамёствамі, святамі, звычаямі. Майстры заўсёды расказваюць пра мясцовыя адметнасці ў тэхніках ткацтва. У сувенірнай краме для знаўцаў і аматараў ткацкага рамяства прапануецца калекцыя вырабаў: абрусы, сурвэткі, вясельныя ручнікі. Усім жадаючым і здольным да рамяства прапануюць курсы па ткацтву.

У 2017 г. калектыў аддзела рамёстваў стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за адраджэнне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

традыцыйных тэхналогій ткацтва Панямоння і рэалізацыю праекта «Ад мінулага да сучаснага» (дзве калекцыі адзення, калекцыя з народных строяў прадстаўляе 7 камплектаў жаночай, 3 мужчынскай і 2 камплекта дзіцячага адзення.)

У 2019 г. распрацаваны праект «Умацаванне самабытнасці сельскіх раёнаў шляхам развіцця традыцыйных рамёстваў і турызму» ў рамках Праграмы транспамежнага супрацоўніцтва Латвія–Літва–Беларусь на 2014–2020 гг. У рамках праекта зроблена ткацкая майстэрня (закуплена мэбля, ткацкія станкі, выставачнае абсталяванне), прайшлі семінары-практыкумы па ткацтву на базе аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУ «Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці» і клубных устаноў Лідскага раёна для дарослых і дзяцей сярэдніх школ. Запланавана стварэнне трох турыстычных маршрутаў.

## КОМПЛЕКС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА АХОВЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ТРАДЫЦЫІ ПАЛОМНІЦТВА ДА «БЛАКІТНАЙ КРЫНІЦЫ»

***Воранава А. В.,***
*галоўны спецыяліст аддзела*
*ідэалагічнай работы, культуры*
*і па справах моладзі Слаўгарадскага райвыканкама*

Слаўгарад – адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі, які ўпершыню згадваецца ў 1136 г. Слаўгарадчына мае свой непаўторны вобраз, шматгадовую гісторыю і маляўнічыя краявіды.

Гісторыка-культурная спадчына Слаўгарадскага раёна прадстаўлена 22 нерухомымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі і 1 нематэрыяльнай – «Традыцыя паломніцтва і пакланення "Блакітнай крыніцы" жыхарамі ўсходніх раёнаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей, сумежных раёнаў Расіі», якой пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 2016 г. № 607 нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

«Блакітная крыніца» знаходзіцца каля в. Кліны Слаўгарадскага раёна і з'яўляецца самай вялікай (па паступленню падземных вод) на ўсёй усходнееўрапейскай раўніне; яна мае 120 ключоў, якія ўтвараюць возера. Сюды кожны год на фестываль «Макавей» (14 жніўня) збіраюцца турысты з розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі і іншых краін. Павер'е распавядае, што ў гэты дзень сіла вады валодае лячэбнымі ўласцівасцямі, і таму людзі прыязджаюць, каб аздаравіцца душой і целам. На крыніцы праводзіцца вячэрняе богаслужэнне, малебныя спевы, літургія. Завяршаецца служба хрэсным ходам, асвячэннем вады і мёду, хрышчэннем. Людзі набіраюць ваду, пераходзяць ад берага да берага тры разы туды і назад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя цалкам акунаюцца ў халодную ваду, каб быць здаровымі. Іншыя прыкладваюцца да Святога каменя на беразе.

Неад'емным атрыбутам фестывалю з'яўляецца кірмаш розных гатункаў мёду. У рамках фестывалю праводзіцца агляд-конкурс «Спас – усяму час», у якім прымаюць удзел самабытныя фальклорныя калектывы раёна і вобласці, замежныя гурты з Расійскай Федэрацыі. Ладзіцца канцэртная праграма «Даюць наказы святыя Спасы» з выкарыстаннем духоўных спеваў, народных песень. Суправаджае фестываль выстава-продаж вырабаў народных майстроў раёнаў Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Каля крыніцы размяшчаецца кірмаш, дзе можна набыць мёд і прадукцыю пчалярства, якія па традыцыі асвячаюцца на Макавей. Гандлёвыя рады прадстаўлены вырабамі майстроў-сыравараў Слаўгарадскага раёна, харчовымі і прамысловымі таварамі.

У мэтах захавання элемента з 2016 г. каля крыніцы ладзіцца абрадавае свята «Вадохрышча», у рамках якога праводзяцца набажэнствы, водаасвячэнне. Раённым цэнтрам культуры і народнай творчасці створана тэматычная праграма «Хрышчэнне – Калядам прашчэнне» з абрадавымі песнямі, гульнямі, карагодамі, арганізуюцца выставы-продажы вырабаў мясцовых рамеснікаў і народных майстроў, прадукцыі сыравараў.

Эка-этна-фестываль «Песні пра Крыніцу» праводзіцца з 2017 г. Фэст заснаваны на культурных традыцыях, народных промыслах і прыроднай спадчыне Слаўгарадчыны. Рэалізацыя ініцыятывы правядзення фестывалю накіравана на папулярызацыю і прасоўванне здабыткаў культурнай спадчыны рэгіёна, спрыяе павышэнню прэзентабельнасці Слаўгарадскага раёна як тэрыторыі з самабытнай культурай, прывабнай для турыстаў, а таксама дазваляе пашыраць творчыя межы мерапрыемства і яго глядацкую аўдыторыю. Эка-этна-фэст «Песні пра Крыніцу», які штогод праводзіцца на тэрыторыі помніка прыроды рэспубліканскага значэння «Блакітная крыніца», стаў яшчэ адным складнікам візітнай карткі раёна.

У 2019 г. па ініцыятыве Слаўгарадскага райвыканкама і фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза ў рамках праекта «Мост як пілотная эка-бізнес-мадэль для мясцовага і рэгіянальнага эканамічнага росту» ўпершыню праведзены кулінарны фестываль «Гаспадыня “Крыніца” запрашае».

Правядзенне такога ўнікальнага праекта – гэта магчымасць дакрануцца да свайго гістарычнага багацця, пазнаёміцца з мясцовым рамяством, асаблівасцямі і самабытнасцю Слаўгарадскага краю.

На фэсце прадстаўлены не толькі гастранамічныя традыцыі раёна, але і святочныя канцэртныя праграмы, майстар-класы, што сведчаць аб багацці і разнастайнасці форм творчай дзейнасці жыхароў раёна.

Асаблівае месца ў фестывальнай праграме займаюць конкурсы майстроў па разьбе і мастацкай апрацоўцы дрэва, страваў нацыянальнай кухні «Усім да смаку нашы прысмакі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уключэнне традыцыі пакланення і паломніцтва крыніцы ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, правядзенне фестываляў, шырокае асвятленне падзей у СМІ, інтэрнэт-публікацыях, тэлеперадачах штогод павялічвае колькасць паломнікаў да крыніцы. У цяперашні час на тэрыторыі раёна праводзіцца будаўніцтва моста праз р. Сож, які злучыць два раёны – Слаўгарадскі і Краснапольскі, забяспечыўшы паміж імі бесперабойны рух, дазволіць паломнікам беспорашкодна наведваць крыніцу зімою.

У раёне распрацаваны праект па развіццю левабярэжжа Сожа. Тут будзе створаны эка-турыстычны парк «Амулет Прысожжа», у які ўвойдуць вёскі, пешыя і веласіпедныя турыстычныя маршруты, а таксама будзе закладзены ландшафтны парк каля крыніцы. Плануецца стварыць умовы для адпачынку сем'ямі, а таксама развіць інфраструктуру для «жывых» пасёлкаў.

## ПРАКТЫКІ ЗБЕРАЖЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ГРОДЗЕНСКАГА РАЁНА ЯК ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА РАЗВІЦЦЯ ТУРЫЗМУ І МУЗЕЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РЭГІЁНЕ

***Рамановіч Н. І.,***
*вядучы метадыст па рэалізацыі культурна-дзелавых праектаў*
*і развіцці турызму дзяржаўнай установы культуры*
*«Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр»*

Культура Гродзенскага раёна славіцца сваімі традыцыйнымі святамі, абрадамі, звычаямі, рамесніцкімі, дэкаратыўна-прыкладнымі мастацкімі традыцыямі, носьбітамі старажытнай народнай культуры. Захаванне, умацаванне і развіццё народных традыцый – аснова паспяховага існавання культуры рэгіёна.

Значнае нарошчванне культурнага патэнцыялу забяспечана тым, што пачынаючы з 2017 г. на тэрыторыі раёна ўсталяваны бязвізавы парадак уезду і выезду замежных грамадзян, дзякуючы чаму фестывальны рух з кожным годам набывае ўсё большы размах, прыкметна стымулюе культурнае жыццё не толькі аграгарадкоў, але і гасцей нашага рэгіёна. Напрыклад, XI Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у 2018 г. адбыўся на Аўгустоўскім канале, яго наведалі 25 тысяч турыстаў.

Адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці ўстаноў культуры раёна – захаванне і развіццё элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь з Гродзенскага раёна занесены пяць элементаў: «Творчасць майстра па вырабу музычных інструментаў М. А. Скрамблевіча (аг. Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці», 2012 г.), «Традыцыі роспісу велікодных яек» (г.п. Сапоцкін, 2013 г.), «Выраб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

велікодных вербаў (пальмаў)» (тэрыторыя паўночна-заходняй Гродзеншчыны: у г. Гродна, аг. Адэльск, Індура, г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці, 2014 г.), «Традыцыйная рэгіянальная кухня» (аг. Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці, 2016 г.), «Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення» (г.п. Сапоцкін, в. Новая Гожа Гродзенскага раёна, 2020 г.).

Лакальная традыцыя роспісу велікодных яек у г.п. Сапоцкін з'яўляецца адным са старажытнейшых народных відаў роспісу – гэта нанясенне спецыяльным самаробным інструментам «шпількай» васковага ўзору на паверхню яйка пры пагружэнні ў натуральны фарбавальнік чорна-карычневага колеру з настою кары дуба, альхі, альховых шышак і ржавага жалеза.

Велікодныя вербы (пальмы) на тэрыторыі Гродзенскага раёна – гэта не толькі святочны атрыбут Вербнага тыдня, але і твор народнага мастацтва з адметнай тэхналогіяй вырабу раслінна-кветкавых кампазіцый. Выраб велікодных вербаў – яркі прыклад запатрабаванасці абрадавай атрыбутыкі ў сувязі з адраджэннем традыцыйных абрадаў, характэрных для сучасных культурных працэсаў.

Значны асабісты ўклад у захаванне традыцыйнай народнай культуры, развіццё беларускай народнай творчасці і адраджэнне традыцыйных рамёстваў у такім рамястве як выраб драўляных музычных інструментаў унёс Мар'ян Антонавіч Скрамблевіч – майстар народных мастацкіх промыслаў Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці.

З глыбіні стагоддзяў у аг. Адэльск існуе самабытная і шыкоўная традыцыйная кухня, якая зберагла свае асаблівасці ў складніках, рэцэптуры і тэхналогіі гатавання. За прастатой адэльскіх страў – вопыт многіх пакаленняў адэльчан. Іх хлеб і пірагі, вяндліну і клінковы сыр ведаюць і па-за межамі аграгарадка, а турысты з задавальненнем дэгустуюць гэтыя стравы. Прыгатаванне кожнай стравы складаецца з пэўных этапаў, заснаваных на старажытных тэхналогіях, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца вяскоўцамі і работнікамі Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці.

У 2020 г. распачалі працу этнаграфічныя кулінарныя майстэрні: упершыню кухаркі з Сапоцкіна і Адэльска паказалі рэканструкцыю святкавання «Першай, вялікай куцці» і абраду «Ламанне аплаткам».

Носьбітамі нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці «Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення», якая была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, у Гродзенскім раёне з'яўляюцца Краўчук В. І. і Шавельская І. Ф. – майстры народных мастацкіх рамёстваў аддзела этнаграфіі, фальклору і рамёстваў, якім належыць значная роля ў вывучэнні, даследаванні і папулярызацыі традыцыйнага саломапляцення.

Усе нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Гродзенскага раёна паспяхова выкарыстоўваюцца ў турыстычнай і музейнай дзейнасці, рэалізуюцца падчас align рознабаковых мясцовых ініцыятыў і практык з уключэннем інтэрактыўных,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурна-пазнавальных форм знаёмства, музейна-педагагічных заняткаў і іншых мерапрыемстваў.

Музей пісанкі ў Сапоцкінскім культурна-турыстычным цэнтры – адзіны ў Беларусі. Гэта тры экспазіцыі, аб'яднаныя адной тэмай «Вялікдзень у жыцці нашых продкаў»: калекцыя з звыш 1700 яек, распісаных традыцыйна «па-сапоцкінску» і ў іншых тэхніках, этнаграфічны пакой з прадметамі хатняга ўжытку канца XIX–XX стст., «Гродзенскія вербы» – з адметнай тэхналогіяй вырабу раслінна-кветкавых кампазіцый да Вербнай (пальмавай) нядзелі.

У створаным М. Скрамблевічам музейным пакоі драўляных музычных інструментаў прадстаўлена звыш 130 вырабаў майстра, а ўнікальная калекцыя драўляных акарын у выглядзе птушак і рыб – адзіная ў Еўропе. У 2019 г. да 80-годдзя народнага майстра М. А. Скрамблевіча адкрыта абноўленая экспазіцыя, бо невялікі музей не ўмяшчаў зацікаўленых турыстаў.

З мэтай папулярызацыі традыцыйнай беларускай культуры, а таксама прыцягнення дадатковых фінансавых сродкаў паспяхова вядзецца праца па напісанню транспамежных і гуманітарных праектаў.

Падрыхтаваны да разгляду праект «Захаванне і папулярызацыя творчасці М. А. Скрамблевіча як элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» для удзелу ў конкурсе на атрыманне гранту Пасольскага Фонду па Зберажэнню Культурнай Спадчыны 2020 (U.S.Ambassadors Fund of Cultural Preservation, далей – «AFCP-2020»).

Па выніках 2019 г. у рамках праграмы транспамежнага супрацоўніцтва «Польша–Беларусь–Украіна, 2014–2020» па тэматычнай мэце «Спадчына» прайшлі другі конкурсны набор два праекты, накіраваныя на развіццё і папулярызацыю гісторыка-культурных каштоўнасцей і народнага традыцыйнага мастацтва:

1) Праект «Традыцыя звязвае народы» – накіраваны на прыцягненне дзяцей і моладзі н.п. Гміны, Ліпск, г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна ў творчую дзейнасць, звязаную з захаваннем і прасоўваннем традыцыйнай культуры дзвюх дзяржаў. У выніку будуць створаны прома-відэаролікі, а ў г. Ліпск пройдзе фестываль традыцыйнай культуры «Фальклор без межаў», дзе дэманструюцца такія рамёствы, як саломапляценне, роспіс пісанак, а таксама гучаць аўтэнтычныя фальклорныя песні.

2) Праект «Вектар мастацтваў уздоўж Аўгустоўскага канала» – арыентаваны на развіццё міжрэгіянальных, культурных і эканамічных сувязей, брэндзіраванне тэрыторыі Аўгустоўскага канала па абодвух баках мяжы, рост унутранага турызму. У рамках праекта запланавана правядзенне на Аўгустоўскім канале «Анлайн школы этна-экалагічных свят» – з рэканструкцыяй абрадаў «Масленіца», «Купалле», «Калядныя забавы».

У студзені 2019 г. у Індурскім цэнтры культуры адчыніўся музей лялькі «Лялька ў карагодзе жыцця», у Сапоцкінскім культурна-турыстычным цэнтры –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспазіцыя «Нам засталася спадчына», дзе прадстаўлена каля 2-х дзясяткаў паменшаных копій архітэктурных помнікаў рэгіёна з керамікі.

Пад адным дахам размясціліся 5 экспазіцый у музеі «Код памяці» ў Зарачанскім доме народнай творчасці. Звыш 100 адзінак ручнікоў у лепшых традыцыях вышыванага мастацтва, каля 50 адзінак дываноў, у тым ліку ў тэхніцы падвойнага ткацтва, а таксама іншыя саматканыя вырабы набылі ў музеі другое жыццё. Акрамя экспазіцыі ваеннай формы з'явіўся пакой, прысвечаны быту партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны, і экспазіцыя «Нараджэнне хлеба» стала цэнтральным кампанентам аднайменнага турыстычнага маршруту, які злучыў аг. Адэльск і в. Зарачанка. 25 верасня 2020 г. новыя экспазіцыі адкрыліся для турыстаў.

З 2020 г. музеі дэманструюць новы праект – «Музей і дзеці».

Эпідэміялагічнае становішча ўнесла карэктывы ў культурнае жыццё раёна: арганізаваны каларытныя event-туры для невялікай колькасці зацікаўленых. Абрадавы турызм – гэта «малады» напрамак у шэрагу падзейных тураў раёна, выдатны спосаб пазнання этнічных, рэлігійных і культурных асаблівасцей народаў. У адной дзеі адразу можа раскрыцца мноства аспектаў: традыцыйныя архітэктура, касцюмы, прадметы побыту, кухня, музыка і да т.п. Прывабнасць гэтага напрамку заключаецца і ў тым, што ўсе падзеі, прадстаўленыя ў ім, – розныя і ўнікальныя. Кожнае традыцыйнае свята можа быць адзначана толькі раз на год і з захаваннем непарыўных канстант: спалучэнне месца, часу і дзеянняў, што фарміруе яго непаўторнае аблічча і гарантуе выключныя ўражанні. Святы і абрады могуць быць як шырока распаўсюджанымі, так і лакальнымі. Напрыклад, на Аўгустоўскім канале ўпершыню ў 2020 г. правялі традыцыйнае Купалле для невялікай колькасці турыстаў.

Выкарыстанне адноўленых і рэканструяваных народных традыцый у культурным жыцці аграгарадкоў і вёсак раёна, пошукавая дзейнасць і фальклорныя экспедыцыі пакладзены ў аснову з'яўлення адметных мерапрыемстваў-брэндаў, якія пабудаваны на самабытным матэрыяле, з элементамі нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. Свята пісанкі ў г.п. Сапоцкін, Адэльскі фэст і абласное свята млынароў у аг. Адэльск, свята лялькі ў аг. Індура, свята вэндліны ў аг. Капцёўка, аднайменны фестываль фальклору «Вяртанне да вытокаў» і іншыя фэсты ўвайшлі ў адзіны фестывальны праект вясковых свят «Аграфэст» – шырокі грамадскі агляд культурных вясковых традыцый з паказам цыкла святочных мерапрыемстваў, аб'яднаных галоўнай ідэяй, скіраванай на фарміраванне вясковых «святочных брэндаў», падтрымку жыццёвасці традыцый, наданне новых культурных імпульсаў.

Супрацоўнікі Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці рэканструявалі свята «Адэльскі фэст», якое ладзяць 13 чэрвеня, на старажытнай кірмашовай плошчы. Прымеркавана свята да дня Святога Антонія Падуанскага – апекуна Адэльска, свята млынароў – да дня Святога Марціна, заступніка ўсіх млынароў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(калісьці ў ваколіцах Адэльска існавала каля 14 млыноў). На мерапрыемствах арганізаваны майстар-класы па традыцыйных рамёствах: ткацтва, вышыўка, выраб народных драўляных музычных інструментаў.

Установы культуры Гродзенскага раёна паспяхова выкарыстоўваюць гісторыка-культурную спадчыну рэгіёна ў турыстычнай дзейнасці. Рэалізуюцца 15 гісторыка-культурных турыстычных маршрутаў, багатых і разнастайных: яны спалучаюць у сабе наведванне музеяў з інтэрактыўнымі праграмамі і майстар-класамі, аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, самабытных, адроджаных у фальклорных экспедыцыях брэндавых святаў, абрадаў, што з'яўляюцца найбагацейшай крыніцай пазнавальнага і маральнага развіцця чалавека, у тым ліку і замежнага турыста.

Пра значныя мерапрыемствы раёна ў рэспубліканскіх, абласных і раённых сродках масавай інфармацыі змешчаны 213 публікацый за перыяд з лістапада 2019 г. па лістапад 2020 г.

З удзелам устаноў культуры Гродзенскага раёна запісаны цыклы перадач «Наперад у мінулае», «Жывая культура», праграмы праекта «Надзея на сяло».

Дзякуючы ўсталяванаму бязвізаваму рэжыму на тэрыторыі Гродзенскага раёна, мерапрыемствы і музеі наведалі 18 тысяч гасцей з розных куткоў Рэспублікі Беларусь, з іх 5179 – замежных турыстаў.

Высокая якасць культурнага прадукту, разнастайны і непаўторны культурны асяродак робяць раён інвестыцыйна прывабным, спрыяюць прытоку фінансавага і чалавечага капіталу. А падзейныя мерапрыемствы з кожным годам ператвараюцца ў месца прыцягнення сотняў тысяч вандроўнікаў, што робіць іх магутным лакаматывам для турыстычных патокаў у раён, горад і краіну.

## ВЫКАРЫСТАННЕ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ПАСТАЎШЧЫНЕ

***Чатовіч Л. Я.***,
*метадыст цэнтра культуры*
*і народнай творчасці Пастаўскага раёна*

На Пастаўшчыне налічваюцца 5 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей: «Народная гульня моладзі “Яшчар”» (в. Гута Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці), «Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я», «Традыцыйная страва “Клёцкі з душамі”» Віцебскай вобласці», «Інсітнае (наіўнае) мастацтва Віцебшчыны» і «Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення». Усе гэтыя адметныя праявы НКС выкарыстоўваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як у культурна-асветнай дзейнасці, падчас культурна-масавых мерапрыемстваў, у мастацкім афармленні памяшканняў, так і ў турыстычнай практыцы. Асабліва задзейнічанымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца наступныя маршруты – «Край казак і легенд» аддзела спорту і турызму Пастаўскага райвыканкама (з наведваннем Пастаўскага Дома рамёстваў) і «Край азёраў, касцёлаў, паркаў» Пастаўскага цэнтра турыстычных паслуг. Апошні зацверджаны ў Нацыянальным агенстве па турызму і ўключае ў сябе не толькі экскурсіі па экспазіцыйных залах Дома рамёстваў, але і анімацыйную праграму «На госці да пастаўскага млынара», частаванне мясцовымі стравамі ад народнага клуба нацыянальнай кухні, гульні і абрад «Традыцыя» Курапольскага СДК. У ходзе праграмы па папярэдняй замове могуць быць прапанаваны таксама «клёцкі з душамі», якія з'яўляюцца навінкай для гасцей клуба, асабліва замежных (у апошні час найчасцей з Расіі, Латвіі і Літвы) . У маі 2019 г. з удзелам аматарскіх аб'яднанняў Цэнтрам культуры і народнай творчасці (далей – ЦКіНТ) праведзена раённае «Свята клёцак» у Паставах, якое выклікала шырокі станоўчы рэзананс сярод жыхароў і гасцей горада, інтэрнэт-блогераў і было адлюстравана ў тэлепраграме «Паставы-ТБ». У 2018 г. клуб «Традыцыя» стаў удзельнікам Дзён Рэзекнянскага краю (Латвія), дзе правёў дэманстрацыю прыгатавання страў беларускай кухні і быў узнагароджаны спецыяльным дыпломам. У 2019 г. сумесна з Лынтупскім культурным цэнтрам «Культыватар» распачаты новы беларуска-польскі праект «Кулінарны шлях» – «Смакі Беларусі: інавацыйныя турыстычныя прадукты як спосаб усебаковага развіцця сельскага прадпрымальніцтва», у ходзе рэалізацыі якога аматарскае аб'яднанне паказвае спосабы прыгатавання страў беларускай кухні, уключаючы элемент НГКК – «клёцкі з душамі». Прадстаўнікі «Традыцыі» былі накіраваны ў мэтавы кулінарны тур у Польшчу з наведваннем аграсядзіб таварыства «Падляскія смакі», дзе з поспехам былі праведзены майстар-класы па прыгатаванню беларускіх дранікаў на аграсядзібе «Чырвоны каралі» ў Падляскім ваяводстве і традыцыйных клёцак Пастаўшчыны (элемент НКС) у Лынтупскім культурным цэнтры «Культыватар» (2019 г.).

Яшчэ за тры гады да падрыхтоўкі дакументаў для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці народнай гульні моладзі «Яшчар» у в. Гута Пастаўскага раёна супрацоўнікі ЦКіНТ імкнуліся аднавіць яе пры правядзенні ў летніках пастаўскіх школ, дзе ладзіліся «Гадзіны народных гульняў» з абавязковым уключэннем у іх праграму мясцовых варыянтаў «Яшчара» і іншых маладзёжных і дзіцячых забаў. «Яшчар» выкарыстоўваецца падчас раённага свята Купалля ў Пастаўскім гарпарку, у купальскіх імпрэзах (найчасцей у аг. Камаі і в. Гута), дзе прысутнічаюць часта і госці краю. Таксама яна праводзілася прадстаўнікамі калектыву Гуцкага СКЦ на «Шляхецкім балі» ў в. Дунілавічы (2018 г.). У 2019 г. у аг. Лынтупы культурным цэнтрам «Культыватар» быў упершыню арганізаваны фестываль эксперыментальнай керамікі «Дым» з пленэрам па гэтаму віду

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкай творчасці. У заключных мерапрыемствах фестывалю прынялі ўдзел Саветнік па праектах развіцця Амбасады Рэспублікі Польшча сп. Магдалена Сідаровіч, прадстаўнікі асацыяцыі «Падляскія смакі» Падляскага ваяводства, а таксама керамісты з Балгарыі і Расіі. Увазе гасцей імпрэзы і мясцовых жыхароў Пастаўскім Домам рамёстваў і Гуцкім СКЦ былі прадстаўлены элементы НГКК – выстава традыцыйнай маляванкі і народная гульня моладзі «Яшчар». ЦКіНТ ажыццяўляе доўгатэрміновы праект «Святкуем па-беларуску», створаны для папулярызацыі гэтага элемента НКС, падчас якога ўдзельнікі фальклорнага гуртка Гуцкага СКЦ выязджаюць у іншыя ўстановы культуры, дзе ладзяцца вячоркі, прымеркаваныя да народных свят, калі па этнаграфічных звестках Пастаўшчыны магла праводзіцца гэтая гульня (Каляды, Вадохрышча, Вялікдзень, Купалле).

Элементы НКС у дэкаратыўна-прыкладной творчасці папулярызуюцца сярод турыстаў рознымі шляхамі: яны ўпрыгожваюць палаткі Пастаўскага Дома рамёстваў падчас правядзення міжнародных фестываляў «Славянскі базар у Віцебску» і «Звіняць цымбалы і гармонік». Гэтыя праявы традыцыйнага мастацтва выкарыстоўваюцца ў афармленні культурна-масавых мерапрыемстваў, рыхтуюцца выставы з майстар-класамі носьбітаў і майстроў гэтых тэхнік у Пастаўскім Доме рамёстваў, а таксама яны дэманструюцца на святах працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, экспануюцца ва ўстановах культуры, адукацыі і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Пастаўскага раёна. У Пастаўскім Доме рамёстваў дзейнічаюць выставы маляваных дываноў, паўдываннікаў, макатак, пано, традыцыйнага саломапляцення, праводзяцца выставы мастакоў-аматараў, якія працуюць у стылі «інсіта». У Варапаеўскай бібліятэцы размешчана выстаўка мясцовай самадзейнай мастачкі Я. Б. Ліманоўскай. Створаны фонд адметных работ па саломапляценню і народнаму роспісу. Метадыст Пастаўскага Дома рамёстваў В. М. Гукава атрымала Гран-пры на Міжнародным конкурсе майстроў традыцыйнага і сучаснага мастацтва роспісу «Фарбы нябёсаў», які праводзіўся ў рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (2020 г.). Яе работа ў тэхніках маляванкі і інсітнага мастацтва стала лагатыпам абласнога свята-конкурсу «Вялікая Вясельніца». Брэндавыя сувеніры, уключаючыя НКС, прапануюцца наведвальнікам Дома рамёстваў у праграмах турыстычных маршрутаў «Край казак і легенд» аддзела спорту і турызму Пастаўскага райвыканкама і «Край азёраў, касцёлаў, паркаў» Пастаўскага цэнтра турыстычных паслуг.

У 2018 г. сумесна з рэдакцыяй праграмы тэлебачання «Паставы-ТБ» ЦКіНТ быў распачаты трохгадовы творчы праект, прысвечаны Году малой радзімы, пад назвай «Сам сабе рэжысёр». За гэты час былі падрыхтаваны 3 відэафільмы аб нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях Пастаўшчыны і 1 – аб пачатку адраджэння ў рэгіёне народных мастацкіх рамёстваў у 90-х гг. XX ст., якія дэманстраваліся на мясцовым тэлебачанні, размешчаны на сайце «Паставы-ТБ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і «Youtube». У 2019 г. пачаў ажыццяўляцца і новы культурна-асветны праект «Ведай свой край. Народная культура», прысвечаны Году малой радзімы. Адпаведныя тэматычныя артыкулы друкуюцца ў газетах «Пастаўскі край», «ЛіМ», «Культура», на сайце «Жывая спадчына Беларусі».

Ва ўстановах адукацыі для вучняў старэйшых класаў дзейнічае Школа актыўнага грамадзяніна, дзе разглядаюцца разам з іншымі тэмамі і асаблівасці культуры свайго роднага краю. Узнікла ідэя выкарыстаць гэтую магчымасць для папулярызацыі мясцовых элементаў НКС сярод школьнікаў, што і здзяйсняецца ў цяперашні час шляхам вусных аглядаў традыцыйнай культуры Пастаўшчыны з відэапрэзентацыямі, якія ўключаюць мясцовыя праявы НГКК.

Для папулярызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Цэнтрам культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна прадугледжваецца далейшае правядзенне раённага «Свята клёцак» у г. Паставы. Супрацоўнікі цэнтра прапануюць уключаць у меню «клёцкі з душамі» ў буйных кропках грамадскага харчавання, усталяваць садовую скульптуру «Гаспадар з клёцкамі» каля рэстарана «Світанак» у г. Паставы.

Для папулярызацыі народнай гульні моладзі «Яшчар» будзе мець працяг акцыя «Святкуем па-беларуску».

Праз арганізацыю выстаў традыцыйнага роспісу, твораў самадзейных мастакоў, якія працуюць у стылі «інсіта», вырабаў у мясцовых тэхніках саломапляцення, распрацоўку і выраб сувеніраў спосабамі мастацкіх практык са статусам нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей яны будуць папулярызавацца сярод турыстаў і гасцей горада. Плануецца ажыццяўляць далейшае афармленне элементамі нематэрыяльных гісторыка-культурнай каштоўнасцей інтэр'ераў аграсядзіб, паляўнічых домікаў, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, грамадскага харчавання, будынкаў сацыяльнага карыстання, а таксама выданне буклетаў па адпаведнай тэматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ФЕСТЫВАЛЬНЫ ФАЛЬКЛОРНЫ РУХ «БЕРАГІНЯ» ЯК КРЫНІЦА ПЕРАЕМНАСЦІ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У РЭГІЁНЕ

***Курсевіч К. А.,***
*галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы,*
*культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама*

У 2018 г. адбыўся юбілейны X Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» – унікальны і самабытны фестываль, які за перыяд свайго існаванняператварыўся ў важную падзею культурнага жыцця Беларусі.

Удзельнікі фестывалю – лепшыя аўтэнтычныя гурты, дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы Рэспублікі Беларусь, а таксама самабытныя маладзёжныя калектывы замежжа, інструментальныя ансамблі народнай музыкі, калектывы і індывідуальныя выканаўцы народна-побытавага танца, майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

У 1999 г. «Берагіня» пачала свой шлях на Рудабельшчыне як рэгіянальны, а затым рэспубліканскі фестываль. Перыядычнасць яго правядзення – раз у два гады. Фестываль ладзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога і Акцябрскага раённага выканаўчых камітэтаў, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры», пад патранатам ЮНЕСКА. Фестываль арганізуецца з мэтай падтрымкі народнай творчасці, захавання рэгіянальнай і мясцовай мастацкай культуры, выяўлення і далучэння да фестывальнага руху новых фальклорных калектываў, пераемнасці нацыянальных культурных традыцый, выкарыстання народнай спадчыны ў выхаванні моладзі, далучэнні яе да культуры свайго краю.

Аўтар ідэі і кіраўнік фестывалю – Мікола Аляксеевіч Козенка, этнахарэограф, які ўбачыў сярод творчых работнікаў культуры і жыхароў Акцябрскага раёна аднадумцаў, натхніў на працу па адраджэнню і захаванню самабытнай народнай культуры і мастацкай творчасці Рудабельшчыны, аб'яднаў дарослыя і дзіцячыя фальклорныя калектывы рэспублікі, стварыў свята «Берагіня». Удзельнікі на працягу ўсяго фестывалю знаходзяцца ў атмасферы адзінства, творчасці, сяброўства. Дзесяць фестываляў прайшло на Акцябрскай зямлі, Яны ахапілі найбольш значныя жанры традыцыйнай культуры – музыку, песні, танцы, гульнявы фальклор, народныя рамёствы і промыслы.

Формы далучэння дзяцей і моладзі да культурных традыцый радзімы могуць быць рознымі. Найбольш эфектыўнай з'яўляецца форма спецыяльных фестываляў, як «Берагіня».

Фестываль накіраваны на вылучэнне і папулярызацыю на навуковай аснове аўтэнтычных форм традыцыйнага народнага мастацтва.

На першым этапе арганізацыі і правядзення фестывалю ўстановамі культуры Акцябрскага раёна ажыццяўляўся шэраг мерапрыемстваў па вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны свайго краю (абрадаў, звычаяў, танцаў, песень, гульнявых форм, народных строяў, рамёстваў і інш.)

Мэтанакіраванае вывучэнне традыцыйнай спадчыны раёна пачалося ў 80-х гг. XX ст. Даследчыя фальклорныя экспедыцыі супрацоўнікаў арганізацыйна-метадычнага аддзела, музея, раённага дома рамёстваў, цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, этнаграфічныя дэсанты ўдзельнікаў краязнаўчых аматарскіх аб'яднанняў і фальклорных калектываў паказалі, што песенная, абрадавая, танцавальная спадчына – жывая з'ява ў нашым раёне.

Вялікая роля ў арганізацыі вывучэння, даследавання і папулярызацыі традыцыйнай мастацкай культуры належыць аддзелу ідэалагічнай работы, культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама. Значную дапамогу ў вывучэнні традыцыйнай культуры аказаў Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры (сёння – Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»). Распачалося маштабнае дасканалае вывучэнне народнай спадчыны, да якой далучыліся вядомыя ў краіне навукоўцы – М. А. Козенка, І. В. Мазюк, Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, І. Ю. Смірнова, В. А. Лабачэўская, В. І. Басько, Т. І. Кухаронак, а таксама выкладчыкі факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва В. В. Калацэй, Т. А. Пладунова, Э. В. Палякова і інш.

Арганізацыйна-метадычны аддзел ДУК «Цэнтр культурна-адпачынкавай дзейнасці Акцябрскага раёна» (раней – Акцябрскі раённы метадычны цэнтр народнай творчасці) з 1990 г. мэтанакіравана вядзе працу па даследаванню традыцыйнай культуры краю, распаўсюджванню рэгіянальнага мастацтва ў розных яго формах, а таксама па павышэнню прафесійнага майстэрства работнікаў культуры ў галіне народнай творчасці.

Падчас рэалізацыі падпраекта «Даследаванне народнай спадчыны» спецыялісты Акцябрскага раённага метадычнага цэнтра за перыяд 2001–2003 гг. працавалі ў 19 фальклорных экспедыцыях, абследавалі 36 населеных пунктаў, запісалі больш за 1000 адзінак абрадавых і пазаабрадавых песень, гульняў, танцаў, твораў народнай прозы, звесткі аб народных святах і абрадах, інфармацыю аб 392 носьбітах, якія працуюць у розных відах традыцыйнага мастацтва. Спецыялістамі метадычнага аддзела, раённай бібліятэкі распрацавана карта свят і абрадаў. Выдадзены буклеты, зборнікі па зберажэнню народнай спадчыны: «Гульні Рудабельшчыны», «Традыцыйнае вяселле Рудабельскага краю», «Традыцыйная кухня Рудабельшчыны», «Купальскі карагод», «Каляды». Сабраны матэрыял для зборніка «Народная проза Рудабельскага краю». Створаны і папаўняецца банк даных па традыцыйнай культуры, сістэматызуецца фотавідэааўдыяархіў, вядзецца картатэка носьбітаў.

Дзеля таго, каб дзеці і моладзь перанялі мастацкія традыцыі сваёй мясцовасці, неабходна далучаць іх да работы па вывучэнню і захаванню народнай спадчыны. З 1993 г. штогод праводзілася дзіцячае свята фальклору «Бабулін куфэрак», фальклорнае свята «Вытокі», удзельнікамі якіх сталі юныя і дарослыя артысты фальклорных гуртоў клубных устаноў, навучэнцы школ раёна, гурткоўцы Дома дзіцячай творчасці.

Правядзенне фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» садзейнічала рэалізацыі рэспубліканскага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці», першым этапам якога стала адраджэнне старадаўніх танцавальных традыцый і пераемнасць іх ад народных носьбітаў. Пачынаючы з 1994 г. у раёне праводзіліся конкурсы паміж дарослымі танцавальнымі калектывамі, пасля – конкурсы дзіцячых гуртоў. Падчас правядзення першага фестывалю ладзіліся конкурсы танцавальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пар – выканаўцаў народных побытавых танцаў. Фальклорныя калектывы раёна рыхтавалі мастацкія праграмы вясенне-летняга цыкла.

Задачы развіцця народнай творчасці рэалізуюцца праз раённыя семінары, семінары-практыкумы, творчыя лабараторыі, школу фалькларыста, майстар-класы з удзелам носьбітаў мастацкіх традыцый. На семінары-практыкуме «Народныя святы як сродак маральнага выхавання і культурна-адпачынкавай дзейнасці насельніцтва» прадстаўлена прэзентацыя народных свят. Раённы семінар «Перспектывы дзейнасці ўстаноў культуры раёна па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны» даў магчымасць прааналізаваць дзейнасць устаноў культуры раёна па ахове спадчыны і абазначыць перспектывы работы ў гэтым кірунку.

Метадычнай службай праводзяцца раённыя творчыя лабараторыі: «Агульныя прынцыпы арганізацыі і асаблівасці работы з фальклорным дарослым калектывам», «Агульныя прынцыпы арганізацыі і асаблівасці работы з фальклорным дзіцячым калектывам», «Народныя абрады і сучаснасць. Абрадавая культура маёй вёскі», дзе кіраўнікі фальклорных калектываў маюць магчымасць набыць неабходныя веды для практычнай дзейнасці.

Захаванне і развіццё самадзейнай народнай творчасці, адраджэнне народных промыслаў і рамёстваў з'яўляецца прыярытэтным напрамкам у рабоце сельскіх устаноў культуры. Спецыялісты ўстаноў імкнуцца захаваць самабытнасць і традыцыйнасць фальклору роднага краю.

У раёне дзейнічаюць 7 сельскіх дамоў народнай творчасці. Іх работа будуецца па трох напрамках: адраджэнне абрадаў і свят народнага календара; адраджэнне рамёстваў раёна; падтрымка, развіццё аўтэнтычных калектываў, стварэнне дзіцячых фальклорных калектываў. Прыкладам гэтага з'яўляюцца Валосавіцкі, Пратасаўскі, Ляскавіцкі, Краснаслабодскі, Ламавіцкі дамы народнай творчасці і інш. На базе сельскіх клубных устаноў працуюць 14 фальклорных гурткоў, 97 удзельнікаў і 3 аўтэнтычныя гурты, 49 удзельнікаў.

У сваёй дзейнасці клубныя работнікі надаюць вялікую ўвагу вяртанню народных традыцый у сучасную практыку. Некаторыя з іх ужо сабралі творы каляндарна-абрадавага і сямейна-бытавога цыклаў, а таксама песень, якія выкарыстоўваюцца ў канцэртных праграмах. Такім чынам праводзяцца канцэрты, тэатралізаваныя прадстаўленні, і самае галоўнае – абрады. З удзелам калектыву «Купалінка» быў адноўлены абрад «Вяселле», арганізаваны праграма выступлення ў аглядзе-прэзентацыі аўтэнтычных гуртоў фестываля «Берагіня–2016», удзел у другім туры абласнога конкурсу аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах «Захапленні на любы густ», створана інтэрактыўная выстава «Запрашаем на вяселле» (узорны дзіцячы фальклорны калектыў «Некрашынка» паказаў фрагмент вясельнага абраду, а кожны элемент суправаджаўся абрадавымі песнямі). Аўтэнтычным калектывам «Перазвоны» ў в. Гаць адноўлены абрад «Вяселле» ў традыцыі вёскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сельскімі ўстановамі культуры ўзноўлены многія абрады і святы зімова-восеньскага цыкла. Згодна карты прастольных свят у вёсках раёна зафіксаваны 17 адзінак. Сумеснымі намаганнямі работнікаў культуры і жыхароў в. Слабодка адроджана прастольнае свята «Ушэсце», падчас якога штогод з вялікай пашанай з адной хаты ў другую пераносіцца ікона «Узнясенне» – заступніца вёскі. Калектывам Парэцкага цэнтра вольнага часу адноўлены восеньскі абрад «Багач».

Своеасабліва адзначаецца свята «Троіца» ў в. Рассвет. За аснову ўзята традыцыйнае прастольнае свята, але сучаснасць дыктуе свае правілы і народны абрад набыў новае жыццё, стаў больш яскравым, вясёлым, дынамічным.

Аўтэнтычны калектыў «Шчадрухі» Забалацкага сельскага клуба захоўвае традыцыю правядзення «Каляд».

Шмат знойдзена адметных носьбітаў старадаўніх песень і самабытных танцаў. У практыку вернуты танцы «Дзева ў сенях стаяла», «Хадося», полькі «З адбоем», «З камандамі», «Трасуха», «Люлечка», адкрыты цудоўныя народныя галасы і музыкі ў вёсках Гаць, Пратасы, Забалацце, Валосавічы, Новая Дуброва, Дзербін, Харомцы, г.п. Акцябрскі і інш.

З 1995 г. па 2000 г. у раёне дзейнічалі праграмы «Жывая памяць Акцябршчыны», «Рамёствы Акцябршчыны». Мэтанакіраванасць праграм садзейнічала выхаванню беражлівых адносін да народнай спадчыны, надавала імпульс да вывучэння, адраджэння і развіцця народных рамёстваў. Дзеля гэтага была распрацавана карта існуючых рамёстваў, створана картатэка майстроў.

Сёння вядзецца навучанне дзяцей і моладзі мастацтву ткацтва, вышыўкі, салома- і лозапляцення, іншым напрамкам народнай творчасці, характэрным нашай мясцовасці. У 24 гуртках сельскіх устаноў культуры займаюцца 179 удзельнікаў.

У в. Пратасы жыве майстар, які вырабляе лялькі, шые для іх нацыянальнае адзенне. Пры гэтым кашулі вышыты працягам, у свахі на галаве чапец і намітка. Калекцыя розных па памерах лялек, зробленая рукамі Веры Леанідаўны Сілівончык, дэманстравалася на рэспубліканскіх, абласных і раённых мерапрыемствах.

Жыхар в. Майсееўка Іван Пятровіч Вежнавец ад бацькі пераняў майстэрства ігры на гармоніку і пляцення з прыродных матэрыялаў. Сакрэты вырабу кошыкаў, карзін і іншых плеценых рэчаў ён перадае сваім вучням.

Майстар па лозапляценню Васіль Іванавіч Удовін (в. Красная Слабада, 1944 г.н.) перадае сваё майстэрства удзельнікам аматарскага аб'яднання «Пошук» (Краснаслабодская бібліятэка) на майстар-класах.

Вылучылася новая плеяда майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Кіруюць майстэрнямі РДР і яго філіялаў вопытныя метадысты-майстры: Марыя Іванаўна Сарнаўская, майстар па ткацтву і пляценню паясоў, у 2017 г. ёй прысвоена званне «Народны майстар Рэспублікі Беларусь»; Тамара Іванаўна Станіслаўчык,

метадыст-майстар па пашыву традыцыйнай вопраткі і вырабу абрадавых лялек (член Саюза майстроў Беларусі); Наталля Уладзіміраўна Малаковіч (вышыўка), Таццяна Мікалаеўна Кавалёва (кераміка), Дабранская Ірына Уладзіміраўна (ганчарства), Жанна Іванаўна Серык (вышыўка), Іна Іванаўна Яцкевіч (саломапляценне), Кацярына Уладзіміраўна Пась (розныя віды), Юлія Аляксандраўна Кісялёва (інкрустацыя саломкай, роспіс) і інш. Творча адораныя людзі, майстры сваёй справы, носьбіты народных традыцый, таленавітыя спецыялісты ДУК «Акцябрскі раённы дом рамёстваў», перадаюць дзецям і падлеткам сакрэты рамёстваў, любоў і павагу да культурнай спадчыны свайго народа.

У культурным жыцці раёна значная роля належыць бібліятэкам. Яны з'яўляюцца не толькі захавальнікамі, але і папулярызатарамі крыніц па традыцыйнай культуры, актыўна вядуць краязнаўчую дзейнасць, арганізуюць розныя выставы па традыцыйнаму мастацтву, арганізуюць працу па захаванню і развіццю культурнай спадчыны, садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнага гонару і патрыятызму.

Дзейнасць бібліятэк у гэтым напрамку ажыццяўляецца праз даследчую работу і сувязь з мясцовымі носьбітамі. Шэраг этнаграфічных экспедыцый «Сцяжынкамі рудабельскіх традыцый» праведзены бібліятэкарам Любанскай сельскай бібліятэкі Людмілай Сцяпанаўнай Гардзей. Папоўніўся фонд запісаў краязнаўчых матэрыялаў аб знікаючым у в. Падветка ўнікальным свяце «Іван-Галавасек». У выніку экспедыцый у в. Любань, Дзербін, Мікуль-Гарадок сабраны каштоўны этнаграфічны матэрыял, пакладзены ў аснову даследчай работы «Ткацтва Рудабельскага краю». На сустрэчах з мясцовымі носьбітамі назапашваюцца матэрыялы вуснай народнай творчасці, якія афармляюцца ў краязнаўчых папках («Песенная спадчына краю», «Носьбіты духоўнасці», «Ад прадзедаў спакон вякоў…», «Народныя святы і абрады», «Моўныя самацветы» і інш.), а таксама выкарыстоўваюцца ў практыцы ўстаноў, калектываў.

Цікавы вопыт работы па адраджэнню народнай культуры маецца ў Лаўстыцкай сельскай бібліятэцы. Бібліятэкар Раіса Канстанцінаўна Вайцяхоўская праводзіць серыю ўрокаў-даследаванняў «Сімволіка беларускага арнаменту». Тэарэтычны матэрыял пакладзены ў аснову тэматычнай папкі «Азбука беларускага арнаменту», а работы юных майстрыц – лялькі-абярэгі – прадстаўлены на бібліятэчнай выставе «Цуды сваімі рукамі». Наладжана добрая сувязь з мясцовай захавальніцай бацькоўскай спадчыны Марыяй Мікалаеўнай Мухінай (1948 г.н., в. Кавалі), якая ў хаце бацькоў арганізавала хату-музей.

На базе Забалацкай сельскай бібліятэкі больш за 10 год дзейнічае «Музей сельскай жанчыны», мэтай якога з'яўляецца захаванне самабытнай культурнай спадчыны рэгіёна, перадача наступным пакаленням традыцый і звычаяў, сямейных каштоўнасцей, быту сельскай жанчыны, аўтарытэту жанчыны-маці ў сям'і і грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэкары раёна праводзяць работу па збору матэрыялаў для інфармацыйных зборнікаў X Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» і рыхтуюць ўдзельнікаў да конкурсу апавядальнікаў фестывалю.

Адметная роля ў працэсе захавання традыцыйнай культуры належыць Цэнтру гісторыі і культуры Акцябрскага раёна. Свой уклад у справу аховы НКС робіць музей, ствараючы экспазіцыі адпаведных рэчыўных, дакументальных, ілюстрацыйных і іншых матэрыялаў на базе навуковай працы як па збору і вывучэнню матэрыялаў для экспазіцый, так і па арганізацыі самой экспазіцыі. Музейнымі работнікамі сабраны ўсе элементы традыцыйнага касцюма жаночага строю. Складзены асобныя калекцыі спадніц, кашуль, фартухоў, сабраны цікавыя калекцыі ручнікоў і посцілак. Але ж справа музея заключаецца ў тым, каб аднавіць раней існаваўшыя прадметы традыцыйнай культуры, выкарыстоўваючы старажытныя тэхналогіі. Гэты адноўлены прадмет, які мае поўнае права звацца экспанатам, мае таксама і сваю назву – «навадзел», і такі экспанат падчас займае зусім не апошняе месца ў экспазіцыі музея.

З 2001 г. ДУК «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна» працуе па музейна-педагагічнай праграме «Музей і дзеці», задача якой – адраджэнне нацыянальнай аўтэнтычнай культуры і традыцый, абуджэнне ў дзяцей цікавасці да беларускай традыцыйнай культуры. Для гэтага выкарыстоўваюцца розныя формы работы:

дыдактычныя гульні («Сялянская хата», «Народны касцюм» – дзеці з асобных элементаў павінны скласці поўную карцінку);

ролевыя гульні (дзеці праігрываюць ролі ўсіх членаў сялянскай сям'і, ужываюцца ў ролі моладзі, якая варожыць у калядныя святы, ладзяць абрад нараджэння і выкупу нявесты ў «Сялянскай хаце» і г.д.), якія дапамагаюць абудзіць творчую энэргію;

занятак-пошук (знайсці прадмет, не толькі указаць на яго, але разгледзець, выказаць сваю асабістую думку);

занятак-тэатралізацыя, драматызацыя (напрыклад, дзеці перапранаюцца ў калядных персанажаў і ладзяць калядаванне, валачобніцтва);

занятак-рэканструкцыя.

У малодшых падгрупах пераважае гульнёвы пачатак. Гульня – адзін з найважнейшых шляхоў навучання і выхавання. Для дзяцей распрацавана гульня «Ці ведаеш ты рамёствы продкаў?» У сярэдніх падгрупах праводзяцца заняткі даследчага характару: «Цікавыя і невядомыя рэчы ў сялянскай хаце», «Адкуль узялася кашуля?» і інш. Яны дазваляюць сістэматызаваць веды, атрыманыя на ўроках, навучыць прымяняць іх у жыцці, знаёміць з рознымі формамі народнай творчасці.

На працягу многіх гадоў працуе этна-студыя «Батлейка». Наведвальнікі музейнай установы спачатку знаёмяцца з гісторыяй яе ўзнікнення, затым удзельнічаюць у майстар-класе па вырабу лялек, а пасля самі з'яўляюцца артыстамі падчас паказу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

батлеечных прадстаўленняў: «Траецкі кірамаш», «Пшанічны каласок», «Бабка-шаптуха», «Калядная зорка» і інш. Батлейка – жывая сувязь адзінства культур, традыцый, вераванняў славянскіх народаў, звязаных з асаблівасцямі мовы, побыту, гісторыі і культуры.

Значнае месца адводзіцца выставачнай дзейнасці. Падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» былі прадстаўлены выставы: народных касцюмаў з розных мікрарэгіёнаў раёна, творчых работ супрацоўнікаў музея «Скарбы Рудабельскага краю», «Беларускія народныя музычныя інстументы», «Вясельныя строі Рудабельшчыны і ваколіц», «Рудабельская «Берагіня» ў 20-ці гадовай прасторы»; філіялам «Карцінная галерэя імя Л. М. Дробава падрыхтаваны фотавыставы «Спадчына», «Берагіня ў прасторы і часе» , «Берагіня ў фотааб'ектыве ўдзельнікаў і гасцей фестывалю», «Берагіневы раскрэсы», «Асоба ў народнай культуры беларусаў».

Вялікая ўвага надаецца даследаванням, пошукам аўтэнтычных твораў традыцыйнага мастацтва метадыстамі-майстрамі ДУК «Акцябрскі раённы дом рамёстваў».

Ажыццяўляліся даследаванні, вёўся пошук і збор узораў старадаўняга адзення, ткацтва, вышыўкі, прадметаў хатняга ўжытку: вывучаны і апрабіраваны спосаб выканання зборкі на аснове шва «ўперад іголку» ў элеменце традыцыйнай жаночай кашулі в. Пружынішчы, распрацаваны апытальнік па традыцыйнай лялькі Акцябрскага раёна «Лялька ў народнай культуры», завершана праца па збору матэрыялаў аб саламяных птушках веснавога абраду «Гуканне вясны», знойдзены і зафіксаваны старажытны жаночы касцюм – Калінкавіцкі строй 2-й паловы XIX ст., які знаходзіцца ў прыватнай калекцыі жыхара г.п. Акцябрскі.

На базе творчых майстэрняў адноўлены і створаны калекцыі тканых і вышываных ручнікоў, браных паясоў на «дошчачках», бердзечку, лялек-абярэгаў, лялек у традыцыйным адзенні, малых архітэктурных форм з гліны, апрабаваны і праведзены ў сучасным вяселлі традыцыйны звычай «Перапын». Адноўлены і створаны вясельны ручнік з сімваламі «ключа сямейнага шчасця» в. Чорныя Брады, асвоена тэхніка пляцення пояса «на шнурах», папоўнена міні-калекцыя лялек у традыцыйным адзенні, распачата праца па вырабу саламяных лялек, стылізаваных касцюмаў з ужываннем элементаў этнічна-народнага характару, серыя керамічных пано з сюжэтамі сялянскага быту.

Калектыўнай працай стала стварэнне 5 калекцый традыцыйных касцюмаў Акцябрскага раёна, што дапамагло фальклорным калектывам Акцябршчыны вырашыць праблему набыцця касцюмаў для выступленняў у дні заключных мерапрыемстваў фестывалю «Берагіня».

Па выніках даследчых экспедыцый створаны рэкламныя выданні, буклеты, наглядныя папкі, альбомы-дапаможнікі, стэнды з фотаздымкамі, замалёўкамі, ілюстрацыйнымі матэрыяламі. Пры Забалацкім філіяле створаны музейны куток

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Скарбы Забалацкай зямлі», а ў выставачнай зале дома рамёстваў распачата праца над экспазіцыяй «Традыцыйныя строі ў святах і абрадах Рудабельшчыны».

На базе раённага Дома рамёстваў дзейнічаюць 10 творчых майстэрняў: ткацтва і пляценне паясоў, саломапляценне, вырабы з саломкі, традыцыйная вышыўка, пашыў нацыянальнага традыцыйнага касцюма, ганчарства, керамікі, разьба па дрэву, роспіс па дрэву, выцінанкі, бісерапляцення, а таксама крама сувенірнай прадукцыі. У майстэрнях установы і яго 5 сельскіх філіялах (н.п. Чырвоная Слабада, Парэчча, Рассвет, Забалацце, Гаць) займаюцца і набываюць практычныя навыкі майстэрства дэкаратыўна-прыкладной творчасці 88 чалавек дзяцей і моладзі, працуюць дарослае аматарскае аб'яднанне, майстэрня па прапагандзе народнай спадчыны (8 чалавек).

Творчая праца праводзілася метадыстамі-майстрамі дома рамёстваў па падрыхтоўцы ўдзельнікаў адкрытага конкурсу праграмы «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» на працягу ўсіх гадоў існавання Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Па-майстэрску выраблены творы, прадстаўленыя на конкурс, адзначаны членамі экспертнага савета. Арыгінальныя вырабы метадыстаў-майстроў і ўдзельнікаў творчых майстэрняў сталі своеасаблівай візітоўкай Акцябрскага раёна.

Дасягненні кіраўнікоў творчых майстэрняў і іх выхаванцаў дэманстраваліся на прэзентацыі Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г. Мінск), Рэспубліканскім фестывалі-кірмашы «Вясновы букет» (г. Мінск), Міжнародным навуковым форуме «Традыцыйны беларускі касцюм у Еўрапейскай культурнай прасторы» і інш. Калектыў у студзені 2018 г. стаў лаўрэатам спецыяльнай Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Дзеці і моладзь – самая дынамічная частка любога грамадства. Развіццё народных традыцый, лёс матэрыяльнай, духоўнай спадчыны ў многім залежыць ад маладога пакалення, таму настаўнікі дзіцячай школы мастацтваў г.п. Акцябрскі надаюць вялікую ўвагу далучэнню дзяцей да пераемнасці, захавання, развіцця традыцыйнай спадчыны.

Авалодваючы музычнымі навыкамі, дзеці адначасова прыцягваліся да даследавання свайго радаводу, гісторыі вёсак. Вывучалі мясцовыя танцы, спевы і іншыя мастацкія традыцыі. Ладзіліся фальклорныя вандроўкі, ішоў актыўны працэс узаемаадносін з носьбітамі народных традыцый і навучэнцамі дзіцячай школы мастацтваў. Многа матэрыялаў выкарыстоўвалася з фондаў метадычнага аддзела. Усё гэта паспрыяла ўтварэнню дзіцячага фальклорнага калектыву «Праменьчыкі».

Адначасова з хлопчыкамі і дзяўчынкамі ўключаліся ў педагагічны працэс бацькі і бабулі. Дапамагалі ў стварэнні касцюмаў, вырашалі арганізацыйныя пытанні. Многія бацькі разам з настаўнікамі школы мастацтваў вышывалі касцюмы пад кіраўніцтвам майстроў дома рамёстваў. Агульнымі намаганнямі пры дапамозе аддзела культуры ў хуткім часе кожны ўдзельнік калектыву меў касцюм мясцовага строю.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбна-выхаваўчы працэс у калектыве арганізаваны такім чынам, што кожны яго ўдзельнік у залежнасці ад сітуацыі можа быць вучнем ці настаўнікам, носьбітам ці даследчыкам народных традыцый. Кіраўнік ганарыцца тым, што вучань умее танцаваць, спяваць, іграць на музычных інструментах.

Значная работа па папулярызацыі народнай спадчыны, у падрыхтоўцы і арганізацыі заключных мерапрыемстваў фестывалю «Берагіня» належыць ДУК «Акцябрскі цэнтр вольнага часу». На працягу многіх год на базе ўстановы праходзяць конкурсы-агляды танцавальных, дарослых і дзіцячых фальклорных калектываў, танцавальных пар.

У час правядзення заключных мерапрыемстваў фестывалю ва ўстанове праходзяць намінацыі: адкрыццё фестывалю, конкурс тацавальных пар і салістаў, майстар-класы, навукова-практычныя канферэнцыі і круглыя сталы.

Акцябрскі цэнтр вольнага часу з'яўляецца культурным цэнтрам творчага жыцця «Берагіні».

На тэрыторыі Акцябрскага раёна створаны творчыя фарміраванні. На базе ўстаноў культуры раёна працуюць 22 фальклорныя гурткі, 234 удзельнікі, з іх 8 калектываў са званнем «народны», «узорны», 122 удзельнікі: народны ансамбль народных інструментаў «Элегія» (кіраўнік А. Л. Савіч) ДУК «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі», народны ансамбль танца «Весніца» (кіраўнік А. Я. Сарнаўскі), народны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Рудабельская пацеха» (кіраўнік В. У. Беняк), узорны ансамбль танца «Верасок» ДУК «Акцябрскі цэнтр вольнага часу».

Вядомы і аўтэнтычныя гурты: «Пераздвоны» (кіраўнік А. І. Агейчык) ДУК «Цэнтр культурна-адпачынкавай дзейнасці Акцябрскага раёна» в. Гаць; «Купалінка» (кіраўнік С. М. Катлярова, у 2017 г. калектыў адзначыў 30-гадовы юбілей) Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці; калектыў «Шчадрухі» (кіраўнік Г. І. Тукач) Забалацкага сельскага клуба.

Па выніках удзелу ў фестывалі «Берагіня» атрымалі званне «ўзорны» фальклорныя калектывы: «Рудабельскія зорачкі» (2000 г., кіраўнік В. Г. Дульская, у 2018 г. калектыў адзначыў 20-гадовы юбілей), «Некрашынка» (2005 г., кіраўнік А. М. Бялько), «Цярэшкавы шчодрыкі» (2005 г., кіраўнік С. М. Галавачэнка), «Праменьчыкі» (2013 г., кіраўнікі Т. Э. Сайкоўская, І. В. Семілет). Калектывы імкнуцца захаваць самабытнасць і традыцыйнасць фальклору роднага краю, выкарыстоўваюць мясцовыя народныя гульні, абрады, танцы, песні. Некаторыя з іх ужо сабралі творы каляндарна-абрадавага і сямейна-бытавога цыклаў, а таксама песень, якія выконваюцца ў любы час.

Калектывы атрымалі папулярнасць не толькі ў сваім рэгіёне, але і далёка за яго межамі, у кожнага ансамбля свой адметны і вельмі багаты рэпертуар песень, танцаў, інструментальных найгрышаў і гульняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1995 г. Вольга Гаўрылаўна Дульская разам з дырэктарам школы № 3 Л. С. Шэйка і настаўнікамі (цяпер раённая гімназія) стварылі фальклорны гурток, які затым атрымаў назву ансамбль «Рудабельскія зорачкі». Была праведзена работа з удзельнікамі ансамбля, іх бацькамі па збору фальклорных песень, танцаў, гульняў, паданняў у раёне ад носьбітаў: А. І. Яфрэмавай (в. Новая Дуброва), А. А. Юрчак (аг. Валосавічы), В. Д. Верас (в. Граб'ё), С. Д. Селіванава, А. Ф. Куляя (г.п. Акцябрскі). Некаторы час Аляксей Фёдаравіч Куляй, Варвара Данілаўна Верас не толькі перадавалі свае музычныя навыкі, але і з'яўлялася ўдзельнікамі і выступалі на канцэртах з калектывам. У праграме калектыву каляндарна-абрадавыя святы «Каляды», «Гуканне вясны», «Лявоніха па-Граб'ёўску», «Пікантная полька», «Кадрыля» на 12 каленаў, «Нарэчанька» – танец тройкамі, «Прыпеўкі», беларускія народныя песні «З-пад дуба, з-пад бярозы», «Пайду ў лясочак» і інш. Актыўна ўкараняецца ў практыку работы з калектывам ўсё здабытае, праводзіцца мэтанакіраваная дзейнасць па аднаўленню, захаванню і папулярызацыі народнай спадчыны сярод школьнікаў.

Узорны фальклорны калектыў «Цярэшкавы Шчодрыкі» створаны ў 1998 г. на базе Рассветаўскага культурна-спартыўнага цэнтра. Удзельнікі валодаюць гармонікамі, шумавымі інструментамі. Вывучаюць народныя рамёствы, вышыўку, тканне паясоў, выразанне выцінанак, пляценне з саломкі, народна-побытавыя танцы. У рэпертуары калектыву веснавыя, летнія, карагодныя песні – «А мы проса сеялі», «Таўкачыкі», «Камар лазню тапіў», «У карагодзе мы былі»; гульня «Журавель»; абрадавая вясельная «Малады ды памочнічак»; каляндарна-абрадавыя песні – «Як на нашай ніўцы», «Граюць скачуць на двары», «Ой, каля сяла грушка стаяла»; танцы – «Лысы», «Каваль».

Узорны фальклорны ансамбль «Некрашынка», арганізаваны ў 1998 г. на базе Валосавіцкага сельскага дома народнай творчасці, праводзіць вялікую працу па аднаўленню мясцовых народных свят, песень, танцаў. Удзельнікі гурта імкнуцца захаваць мясцовы стыль, манеру выканання абрадавых песень, якія выконвае народны майстар Настасся Астапаўна Юрчак (в. Валосавічы).

Узорны фальклорны ансамбль «Праменьчыкі», створаны ў 2006 г. на базе ДУК «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі», вывучае песенныя традыцыі сваёй мясцовасці, прымае актыўны ўдзел у святочных мерапрыемствах, вядзе канцэртную дзейнасць. Рэпертуар гурта адлюстроўвае багацце і разнастайнасць танцавальнага, гульнявога і музычнага фальклору Акцябрскага раёна. Калектыў выконвае каляндарныя сямейна-абрадавыя песні, выкарыстоўваючы матэрыял, сабраны спецыялістамі метадычнага цэнтра. У рэпертуары народныя танцы – «Кракавяк», «Падыспань», «Сербіянка», гульні «Апанас», «Явар», «Квактуха», карагоды – «Вяснянка», «У карагодзе мы былі». Удзельнікі калектыву вучацца вышываць, плесці, ткаць паясы. Таму ўсе яны апрануты ў адноленыя па мясцовых традыцыях строі, зробленыя сваімі рукамі і з дапамогай бацькоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фальклор дыктуе асаблівыя падыходы да работы з дзецьмі, нават у дзіцячых садках. Так, у Акцябрскім раёне існуюць 18 устаноў адукацыі, з іх 1 раённая гімназія, 3 сярэднія школы, 1 пачатковая школа-дзіцячы сад, 4 дзіцячыя сады-сярэднія школы, 5 базавых школ-садкоў і 4 дзіцячыя садкі.

З 2001 г. дзейнічае праграма «Традыцыйная культура і дзеці», у ходзе рэалізацыі якой прадугледжана стварэнне сістэмы выхавання дзяцей і моладзі на традыцыйнай культуры, стварэнне умоў для трансляцыі мастацкіх традыцый вусным шляхам і ўключэнне ў выхаваўчы працэс агульнаадукацыйных школ заняткаў па знаёмству з мастацкімі традыцыямі.

Да вывучэння народнай спадчыны актыўна далучыліся настаўнікі, дзеці. Вандроўкі па роднаму краю падчас школьных канікул паказалі, што песенная, танцавальная, абрадавая спадчына нашых бабуль – жывая з'ява. Матэрыялы экспедыцый становяцца дапаможнікамі ў працэсе навучання і далучэння дзяцей і падлеткаў да народнай спадчыны.

Дзеці і моладзь у выніку даследавання матэрыялаў аб носьбітах, майстрах, аб сваім краі рыхтуюць даклады для выступлення на навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання», удзельнічаюць у конкурсе на лепшую даследчую работу пад дэвізам «Адвечнае».

Да ўрокаў гісторыі вучні рыхтуюць рэфераты, паведамленні, даклады аб народных святах, абрадах, звычаях, носьбітах, аб сваіх радаводах, якія грунтуюцца на ўспамінах бабуль і дзядуль.

З мясцовымі традыцыямі, з гісторыяй сваіх вёсак, гульнямі, легендамі вучні знаёмяцца на факультатыве «Гісторыя роднага краю». На базе школ працуюць аматарскія аб'яднанні «Спадчына» (Рассветаўская СШ, Парэцкая сярэдняя школа-сад, СШ № 1 г.п. Акцябрскі).

Пры школах дзейнічаюць музеі (Краснаслабодская, Рассветаўская сярэднія школы, Парэцкая сярэдняя школа-сад, сярэдняя школа № 1, раённая гімназія г.п. Акцябрскі і інш.), пакоі сялянскага побыту (Гацкая, Гарохавіцкая базавыя школы), працуюць гурткі дэкаратыўна-прыкладной творчасці і традыцыйных рамёстваў (Рассветаўская СШ, СШ №1, СШ №2, раённая гімназія г.п. Акцябрскі і інш.).

Да навучання танцам далучаюцца выхаванцы не толькі малодшага і старэйшага школьнага ўзросту, але і дзіцячых садкоў. Ужо ў малым узросце яны ведаюць такія побытавыя танцы як «Какетка», «Лысы», «Падэспань», «Полька-бабачка», «Лысы», «Кракавяк», «Месяц», «Каханачка», «Ночка» і інш.

У раёне склалася пэўная сістэма правядзення раённых фестываляў, конкурсаў, канцэртаў, якія садзейнічаюць падтрымцы народных майстроў, выканаўцаў народных песень, музыкі, танцавальнага фальклору, пошуку новых талентаў, стварэнню спрыяльных умоў для развіцця творчай дзейнасці жыхароў.

Метадычны цэнтр арганізуе правядзенне традыцыйных мерапрыемстваў: заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва «Берагіня», адкрытага фестывалю-конкурсу маладзёжных творчых работ «Крокі» (уваходзяць намінацыі «народны танец», «народны вакал», а таксама спецыяльны прыз і дыплом «за любоў да народных традыцый і «за вернасць нацыянальным традыцыям»), раённага конкурсу дзіцячай творчасці «Вясновая карусель», аглядаў-конкурсаў фальклорнага мастацтва, танцавальных пар-выканаўцаў народных бытавых танцаў, мерапрыемстваў фестывальнага праекта вясковых свят «Аграфэст», які праводзіцца ў маштабе аграгарадкоў і вёсак раёна. Фестываль задуманы як шырокі грамадскі агляд культурных вясковых традыцый з паказам цыкла святочных мерапрыемстваў, аб'яднаных галоўнай ідэяй – фарміраваннем вясковых «святочных брэндаў».

Да спадчыны продкаў дзеці, падлеткі, моладзь далучаюцца, прымаючы ўдзел у днях майстра, гадзінах дзіцячага фальклору, конкурсах юных майстроў, днях спадчыны і інш. Экскурсіі, урокі пазнання, майстэрства, фальклорныя гадзіны адкрываюць падрастаючаму пакаленню свет, у якім жылі продкі, чым карысталіся ў побыце і ў сваёй паўсядзённай працы.

Знаёмства, сустрэчы з носьбітамі народных традыцый заўжды выклікаюць зацікаўленасць, даюць магчымасць пры непасрэдным кантакце вусным шляхам пераймаць сакрэты рамёстваў, манеру выканання песень, танцы «з нагі ў нагу» і музыку – «з рукі ў руку»; вывучаць іх не па падручніках, а па ўспамінах сталых людзей.

Шырокае распаўсюджванне атрымала правядзенне мерапрыемстваў у «Беларускай хаце» (у раённым музеі) у рамках абласной акцыі «Ноч музеяў». Тут ладзяцца тэатралізаваныя прадстаўленні з удзелам вядомых у раёне ўзорных фальклорных калектываў: «Рудабельскія зорачкі», «Некрашынка», «Цярэшкавы Шчодрыкі», «Брачынскія музыкі» раённай гімназіі. Яны прадставілі праграмы: «Рудабельскі фэст», «Вясельны абрад», «Запрашаем на вячоркі», «Прамень гісторыі». Праграмы ўключалі ў сябе не толькі пазнавальныя мерапрыемствы, але і дэгустацыю страў нацыянальнай кухні, майстар-класы па выкананню беларускіх народных танцаў, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, традыцыях адраджэння фальклорных свят.

Развіццё лакальных культурных традыцый ажыццяўляецца з дапамогай брэндаў раённага дома рамёстваў, пабудаваных на самабытным матэрыяле з элементамі традыцыйнай культуры: IV раённы фестываль-конкурс «Вянок рудабельскіх талентаў» (2016), раённая выстава-конкурс творчых работ «Мой край, зямля майго натхнення» (2016), раённая выстава жаночай вопраткі з падручных і прыродных матэрыялаў «У свеце жаночай прыгажосці» (2017), раённая выстава-прэзентацыя традыцыйнага касцюма «Восеньскі калаварот» (2017).

Спецыялістамі дома рамёстваў апрабаваны новыя формы працы: фестываль-конкурс «Вянок Рудабельскіх талентаў», «Край майстроў і творцаў», «Рудабельскі сувенір», майстар-клас «Майстар года», выстава-прэзентацыя традыцыйнай народнай вопраткі «Водгукі далёкай старажытнасці», тэатралізаваныя выставы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раённыя конкурсы па традыцыйных відах рамёстваў (вышыўцы, пляцення паясоў, выцінанкі), дзіцячыя пленэры.

Штогод праходзяць цыклы мерапрыемстваў па папулярызацыі народнай культуры ў бібліятэках раёна. Праводзяцца віншавальныя акцыі са святамі народнага календара, на мясцовым матэрыяле арганізоўваюцца святы, краязнаўчыя гадзіны, майстар-класы, выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. Клубам аматараў казкі «Церамок» (дзіцячы аддзел раённай бібліятэкі) арганізаваны паказ лялечных пастановак казак «Коцік і пеўнік», «Каза-дзераза», тэкст якіх запісаны ад мясцовых носьбітаў. У працэсе экскурсій у «Музеі сельскай жанчыны» в. Забалацце дзеці даведваюцца аб мясцовых традыцыях, аб прымяненні прадметаў народнага быту, тут ладзяцца мерапрыемствы: «Свята бабулінага ручніка», урокі радзімазнаўства, традыцыйнай культуры і інш.

Папулярнасцю карыстаюцца вясковыя падворкі ў рамках свята горада, свята «Дажынкі» (выставы па народных абрадах «Беларускі каларыт», «Вясковыя пачастункі» і інш.)

Значную ролю ў развіцці традыцыйнай культуры маюць інавацыйныя формы.

Семінар-практыкум «Этнатурызм як рэсурс культурнай ідэнтыфікацыі раёна» паказаў ролю этнатурызму ў фарміраванні духоўна-маральнага свету падрастаючага пакалення, стварэнні ўмоў для далучэння да гісторыка-культурнай спадчыны свайга краю. Распрацавана этнаграфічная карта «Культурна-гістарычная спадчына Акцябрскага раёна» з пазначэннем асноўных культурных брэндаў, мясцін і ўстаноў для наведвання іх турыстамі.

Пазнаёміцца з традыцыйнай культурай Акцябрскага раёна мела магчымасць і больш шырокая аўдыторыя. Калектыў Белтэлерадыёкампаніі запісаў цыкл перадач праграмы «Наперад у мінулае», прысвечанай спрадвечнай песеннай культуры Беларусі. Кожны выпуск – штотыднёвая справаздача экспедыцыі ў глыбінку, дзе яшчэ захавалася фальклорная беларуская спадчына і самабытныя абрады, у тым ліку і ў нашым раёне.

Запісана і выпушчана серыя перадач аб творчай дзейнасці калектываў «Цярэшкавы Шчодрыкі» Рассветаўскага культурна-спартыўнага цэнтра, «Перазвоны» ДУК «Цэнтр культурна-адпачынкавай дзейнасці Акцябрскага раёна» в. Гаць, «Купалінка» Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці, а таксама носьбіта традыцыйнай культуры Марыі Ігнатаўны Ягур з в. Валосавічы.

Аўтэнтычныя калектывы прынялі ўдзел у запісу радыёпраграмы «Беларуская этнафонія» канала «Культура» (г. Мінск, у Міжнароднай турыстычнай выставе «Тур-бізнес–2017» (аўтэнтычны гурт «Купалінка»).

Многія жыхары і госці Акцябрскага раёна маюць магчымасць пазнаёміцца з традыцыйнай культурай і калектывамі на старонках мясцовай газеты «Чырвоны кастрычнік», дзе знаходзяць адлюстраванне пытанні адраджэння і развіцця народнай культуры; перадачы майстрамі сакрэтаў рамёстваў, песеннага, танцавальнага мастацтва дзецям і падлеткам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтары артыкулаў – спецыялісты арганізацыйна-метадычнага аддзела, метадысты-майстры раённага Дома рамёстваў, спецыялісты музея, бібліятэкары, клубныя работнікі, настаўнікі школьных устаноў. За 20 гадоў у газеце надрукавана больш за 120 артыкулаў разнастайных па тэматыцы, але аднолькавых па задачах – знаёмства жыхароў і гасцей раёна са спадчынай продкаў, з тым, як агульнымі намаганнямі ўстаноў аддзела культуры і адукацыі адраджаюцца і развіваюцца традыцыі народа.

У лістападзе 2017 г. раён наведалі ўдзельнікі творчай стажыроўкі беларусаў замежжа з 9 краін, якую праводзіў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. З вялікім захапленнем і энтузіязмам госці навучаліся беларускім рамёствам, народным песням, танцам. Удзельнікі творчай дэлегацыі былі прыемна здзіўлены ўмовамі, якія створаны на Рудабельшчыне для развіцця народнай культуры.

Развіццё народных традыцый, лёс матэрыяльнай, духоўнай спадчыны ў многім залежыць ад маладога пакалення. Таму работнікі клубных, бібліятэчных, школьных, пазашкольных устаноў надаюць вялікую ўвагу далучэнню дзяцей і моладзі да працэсу пераемнасці, захавання, развіцця традыцыйнай спадчыны.

Фестываль «Берагіня» падштурхоўвае моладзь больш дасканала вывучаць і ўкараняць у жыццё звычаі і побыт нашых продкаў. За ўсю гісторыю свайго існавання фестываль стаў важным крокам, штуршком у засваенні, захаванні, трансляцыі і перадачы мастацкага вопыту продкаў сённяшняму пакаленню.

Традыцыйная народная культура Акцябрскага раёна з'яўляецца арганічнай часткай сучаснага культурнага жыцця. Стратэгічнымі кірункамі дзейнасці ў галіне традыцыйнай культуры сталі вывучэнне, захаванне, пераемнасць, папулярызацыя (трансляцыя).

Папулярызацыі традыцыйнай культуры спрыяе правядзенне рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» з перыядычнасцю адзін раз на два гады. Для захавання, аднаўлення і пераемнасці народнай культуры важнае значэнне мае выставачная дзейнасць, якая на сённяшні дзень плённа развіваецца: з'яўляюцца новыя формы арганізацыі экспазіцый, узбагачаюцца жанры і змест выставачнай дзейнасці.

Значная роля ў захаванні і падтрымцы традыцыйнай народнай творчасці належыць дамам народнай творчасці і дому рамёстваў, яго філіялам, якія вызначаюць мясцовыя і рэгіянальныя традыцыі, сістэматызуюць сабраны матэрыял па відах мастацтва. Спектр работы гэтых устаноў культуры даволі шырокі: ад збіральніцкай работы ў галіне этналогіі і фальклору да апрабавання атрыманых матэрыялаў у метадычнай і практычнай дзейнасці фальклорных калектываў, гурткоў, майстэрняў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вядома, што там, дзе не арганізаваны працэс пераемнасці, аўтэнтычная традыцыя знікае разам з яе носьбітамі. Дзякуючы «Берагіні», у рэчышчы методык «вуснага перайманне» і «дэманстратыўнай антрапатэхнікі» традыцыйная культура Акцябрскага раёна становіцца аб'ектам якаснай пераемнасці, творчых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самавыяўленняў, педагагічнага пераасэнсавання. Сярод удзельнікаў фестывальных імпрэз – маладыя спевакі і танцоры, студэнты творчых устаноў вышэйшай адукацыі краіны, пераможцы міжнародных конкурсаў, выкладчыкі фальклору, даследчыкі традыцыйнай культуры, магістранты і аспіранты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дзякуючы ім фальклор Рудабельшчыны будзе жыць далей і перадавацца праз пакаленні беларусаў.

Трэба рабіць усё магчымае, каб традыцыйная культура не знікла, а дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы, аўтэнтычныя гурты, ансамблі народнай музыкі і далей пераймалі і папулярызавалі аўтэнтычную мастацкую культуру.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ЭКСКУРСІЙНА-ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БРЭСЦКАГА РАЁННАГА ДОМА РАМЁСТВАЎ

***Мартыновіч Ф. А.,***
*супрацоўнік Брэсцкага раённага Дома рамёстваў*

Брэсцкі раённы Дом рамёстваў – месца, дзе кожны наведвальнік зможа даведацца шмат новага і цікавага аб традыцыйнай культуры, промыслах і рамёствах, гісторыі побыту жанчын Прыбужжа. Тут арганізуюцца экскурсіі па розных напрамках народнай творчасці.

Сярод найбольш распаўсюджаных тыпаў экскурсій, якія праводзяцца на базе установы, вылучаюцца наступныя.

Першы тып – аглядныя. Дадзены тып экскурсій дапамагае гасцям, якія ўпершыню наведалі Дом рамёстваў у агульных рысах даведацца пра асноўныя рамёствы і промыслы, без якіх нельга было ўявіць паўсядзённае жыццё і народную культуру з даўніх часоў на Прыбужскай зямлі.

Другі тып – тэматычныя. Для наведвальнікаў дэманструецца матэрыял па напрамку традыцыйнай творчасці, які цікавіць наведвальніка, распавядаецца гісторыя рамёстваў, разнавіднасці работ у пэўным відзе промыслаў. Тэматычных экскурсій можа быць распрацавана шмат. Падобныя экскурсіі праводзяцца, як правіла, для тых, хто ўжо пабываў на аглядной экскурсіі.

Дом рамёстваў распрацаваў экскурсіі для некалькіх пляцовак – выставачная зала, музейная экспазіцыя цэнтра падтрымкі ініцыятыў жанчыны «Гаспадыня Прыбужжа». Таксама распрацавана спецыяльная экскурсія гісторыка-краязнаўчага кірунку «Вуліца Астрамечава», дзе можна даведацца, у гонар якіх людзей названы вуліцы ў населеным пункце.

Аднак спынімся на двух найбольш папулярных відах экскурсій. Гэта экскурсіі па выставачнай зале і па музейнай экспазіцыі цэнтра падтрымкі ініцыятывы жанчыны «Гаспадыня Прыбужжа».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выставачная зала раённага Дома рамёстваў дэманструе, наколькі разнастайнай была гістарычная культурная спадчына на тэрыторыі Прыбужжа. Тут прадстаўлены работы ў розных традыцыйных беларускіх промыслах і рамёствах, такіх як саломапляценне, карункапляценне, ткацтва, вышыўка, разьба па дрэву, роспіс па шклу, ганчарства, таксама прадстаўлены традыцыйныя лялькі і цацкі.

Экскурсія па зале, што знаходзіцца ў Астрамечава, была б няпоўнай без аповеду пра краязнаўчы альманах «Астрамечаўскі рукапіс». Ён выдаецца раз у квартал і збірае інфармацыю пра гістарычныя падзеі, людзей, месцы, якімі славіцца не толькі Астрамечаўская зямля, але і ўсё Прыбужжа. Назва альманаха пайшла ад музычнага твора.

У экспазіцыі работ па вышыўцы прадстаўлены рэканструяваны традыцыйны касцюм Брэсцкага раёна Дамачаўскага строю адзення. Рэканструкцыя выканана Пракаповіч Нінай Сафронаўнай, кіраўніком гуртка па вышыўцы. Экспазіцыя таксама змяшчае розныя ручнікі, сурвэткі, карціны. Большасць з гэтых работ выканана ў традыцыйным беларускім стылі: на белым палатне малюнак складаецца з чырвонага і чорнага колераў. Чорным колерам на палатну пачалі вышываць адносна нядаўна, а да гэтага малюнак на белай тканіне быў выключна чырвоным.

У экспазіцыі па саломапляценню прадстаўлена велізарная колькасць работ у разнастайных тэхніках: пляценне з саломкі, вязанне, камбінацыя вязання і пляцення, інкруставанне. Гэта творы рознай ступені складанасці і памераў. Важкая частка экспазіцыі з саломкі – работы майстра Марыі Мікалаеўны Барысюк. З саломы выконваліся не толькі сувеніры, але і прадметы гардэроба, такія як саламяны капялюш, саламяны абутак (лапці), велізарная колькасць разнастайных саламяных абярэгаў-павукоў. Здаўна лічылася, што саламяны павук ўбірае у сябе ўсю негатыўную энергію ў доме. Ён вешаўся пад столлю з яшчэ дахрысціянскіх часоў, і ў канцы кожнага года стары павук разам з усёй негатыўнай энергіяй знішчаўся агнём, а яго месца займаў новы чысты. Іх памеры таксама адрозніваліся адзін ад аднаго.

Адметнай з'яўляецца экспазіцыя «Разьба па дрэву». Ніякае жыллё нельга было ўявіць без рознага начыння і ўпрыгожванняў. Беларусь багатая на лясы. Драўніна – сапраўдная знаходка для умельцаў. Здаўна ёй займалася пераважна моцная палова чалавецтва, і з дрэва атрымліваліся сапраўдныя шэдэўры. Самымі распаўсюджанымі прадметамі з'яўляўся посуд: лыжкі розных памераў, талеркі, розныя ўпрыгажэнні і прадметы хатняй гаспадаркі. Дрэва – вельмі трывалы матэрыял, таму з яго можна было зрабіць практычна ўсё. Посуд і ўпрыгажэнні – толькі дробная частка. Вялікая колькасць жылля будавалася менавіта з дрэва з даўніх часоў. Драўляную частку экспазіцыі выканаў Іван Міхайлавіч Карабейка.

Ёсць таксама экспазіцыйны куток з прадметамі, выкананымі мясцовымі ганчарамі. Розны посуд, які можна было адправіць у печ, здаўна рабіўся з гліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сам працэс вытворчасці глінянага посуду быў даволі займальны. Вырабы, прадстаўленыя ў выставачнай зале, выкананы майстрамі-ганчарамі са Столінскага раёна і перададзеныя ў дар для Дома рамёстваў.

Нельга не згадаць і пра ткацтва. Гэта рамяство перадавалася ад маці да дачкі, ад пакалення да пакалення. Менавіта ткацтва давала вопратку, ручнікі, прадметы побытавага ўжывання, а таксама ўпрыгожвала жыллё. У кожнай сялянскай хаце быў ткацкі станок – кросны, на якіх ткала гаспадыня. Працэс ткацтва быў насычаным і працаёмкім, і майстрыха аддавала многа часу на адзін выраб, але гэта таго каштавала. З-пад кроснаў выходзілі не проста прадметы адзення, а сапраўдныя творы мастацтва.

Варта згадаць і пра ткацтва паясоў. Здаўна лічылася, што пояс быў своеасаблівым дакументам кожнага чалавека. Ён тлумачыў паходжанне людзей, сямейнае становішча, статус, іншыя прыметы. Выраблялiся паясы на розныя святы народнага календара, да вяселля, жалобных падзей і г.д. Без пояса чалавек не мог выйсці нават на вуліцу. Тэрмін «распеperазацца» меў негатыўнае значэнне, і да чалавека без пояса здаўна ставіліся з пагардай. Беларускія паясы – асобны пласт культуры. На ўвесь свет вядомыя Слуцкія паясы, якія ўславілі краіну. Іх выраблялі мужчыны, у даўжыню яны дасягалі да 4–5 метраў. Таму і недзіўна, што ва ўсіх рэгіёнах Беларусі гэты прадмет гардэроба, нягледзячы на нязначныя памеры, меў каласальнае значэнне.

Свая адметнасць – у экспазіцыі традыцыйных лялек і цацак. Нішто так не цікава для дзяцей, як цацкі. Цацкі выконваліся практычна з любых падручных матэрыялаў як для дзяўчынак, так і для хлопчыкаў. Лялькі першапачаткова былі татэмнымі сімваламі. Дзяўчынкі ў асноўным гулялі з палатнянымі лялькамі, а хлопчыкі – драўлянымі, якія мелі розную ступень складанасці вырабу. Асабліва цікава, што лялькі людзей з даўніх часоў было прынята рабіць без чалавечага твару. Лічылася, што ў яе не маглі ўсяліцца злыя духі, і такім чынам яна была ад іх абаронена разам з яе гаспадаром, бо была абязлічанай. Беларуская лялька ўпрыгожвалася беларускай вопраткай, што выконвалася ў трох колерах – белае палатно аздаблялася малюнкамі-засцярогамі з чырвоных і чорных кветак. У далейшым з'явіліся і іншыя колеры, сярод якіх можна вылучыць сіні і зялёны.

Існавалі яшчэ лялькі-неразлучнікі, якія сімвалізавалі моцную сям'ю, каханне і бесперапыннасць роду чалавечага. Лялькі-рванкі, якія суправаджалі дзіця ад нараджэння і да таго часу, як лялька парвецца. Варта згадаць і пра такую цацку, як скарбонка-траўніца: яна была напоўнена лекавымі травамі і змяшчалася ў дзіцячым ложку.

Акрамя забаўляльных і сакральных мэт, лялькі неслі выхаваўчую функцыю: па ляльках дзяўчынкі навучаліся хатняй гаспадарцы, дапамагалі дзяўчынкам рыхтавацца да будучай ролі маці, робячы лялечку-пеленашку, на ёй вучыліся спавіваць дзіця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заключным элементам выставачнай залы з'яўляецца «Чырвоны кут» – месца сакральнае ў кожным доме, дзе стаяла ікона і першы сноп ураджаю, побач знаходзіўся куфар і гардэроб.

Музейная экспазіцыя цэнтра падтрымкі ініцыятывы жанчыны «Гаспадыня Прыбужжа» такама заслугоўвае ўвагі. Музей быў урачыста адкрыты 24 лютага 2018 г. пры матэрыяльнай падтрымцы краіны і такіх сусветна вядомых арганізацый, як Арганізацыя Аб'яднаных нацый (ААН) і Еўрапейскі Саюз (ЕС), дзякуючы працы праекта ЕС / ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Музей з'яўляецца складовай часткай Цэнтра падтрымкі ініцыятыў жанчын, які носіць аднайменную назву, тут таксама ёсць магчымасць для правядзення рознага роду трэнінгаў, майстар-класаў з удзелам рамеснікаў і г.д. Наведвальнікаў навучаюць ткацтву, шыццю, вышыўцы, валенню, карункапляценню і іншым відам рамеснай дзейнасці. Ініцыятыва накіравана на стымуляванне самазанятасці жыхарак Брэсцкага раёна на аснове традыцыйных рамёстваў.

Заяўнікам ініцыятывы, якая перамагла ў асноўным конкурсе праекта ЕС / ПРААН «Садзеянне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» выступіў Лышчыцкі сельскі выканаўчы камітэт. Ключавая ідэя заключаецца ў пашырэнні магчымасцей для працаўладкавання і дадатковага заробку жанчын, садзеянні развіццю прадпрымальніцтва. Партнёрамі сельскага выканкама выступілі раённы Дом рамёстваў, аддзяленне саюза жанчын, мясцовыя прадпрымальнікі-рамеснікі.

Тут праходзяць экскурсіі, трэнінгі, майстар-класы, сустрэчы з экспертамі, паспяховымі жанчынамі раёна, іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне кампетэнцый мэтавай групы і атрыманне новых ведаў і вопыту. У перспектыве ўстанова таксама будзе выкарыстоўвацца як пляцоўка для працы зарэгістраваных жанчын-рамеснікаў і прадпрымальнікаў.

У адкрыцці цэнтра прынялі ўдзел прадстаўнікі мясцовых органаў улады, грамадскіх арганізацый.

Старшыня абласнога аддзялення Беларускага саюза жанчын Валянціна Пух і намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама Павел Валынец звярнулі ўвагу на сімвалізм падзеі: цэнтр «Гаспадыня Прыбужжа» адкрыўся ў Год малой радзімы ў аг. Астрамечава, якому выпаў гонар стаць першай вёскай будучыні ў Брэсцкім раёне.

Сама экспазіцыя музея нагадвае пра тое, як выглядала жыллё сельскіх жыхароў на працягу многіх стагоддзяў на нашых землях, з якіх памяшканняў яно складалася і якія прадметы з даўніх часоў былі неабходныя ў сям'і і кожным доме. Першы пакой – сенцы. Менавіта праз сенцы можна было ўвайсці ў хату, менавіта ў сенцах размяшчалася вялікая колькасць прадметаў працы. Тут таксама маглі захоўвацца зёлкавыя культуры. У саміх сенцах яшчэ было мноства прадметаў побыту і хатняй гаспадаркі: лямпы, прасы, маслабойкі, куфар, у якім захоўваліся рэчы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Далей трапляем у памяшканне, якое ўвабрала ў сябе шматлікія элементы дамоў у вёсцы. Тут можна пабачыць элементы кухні: куханы стол, полка для прыправаў, посуду, і вядома ж печ з чыгунамі, віламі для іх. Сама печ насіла для ўсяго дома велізарнае значэнне, без яе нельга было ўявіць жыллё. Яна была прызначана не толькі для прыгатавання рознай ежы, але таксама і для абагрэву дому ў холад, а таксама як спальнае месца. У гэтым памяшканні прысутнічаюць элементы пакоя гаспадыні, а таксама рэканструкцыя традыцыйнага касцюма Брэсцкага раёна для жанчын і мужчын, які прадстаўляе Дамачаўскі традыцыйны строй адзення.

Паколькі раней было прынята мець шмат дзяцей у сем'ях, як памочнікаў у хатняй гаспадарцы для сваіх бацькоў, то ў хатах былі прадметы, якія вучылі дзіця стаяць на нагах, хадзіць, актыўна перамяшчацца, а таксама стаялі дзіцячыя ложкі.

Сакральнае месца меў «Чырвоны кут», які знаходзіўся непадалёк ад месца прыёму ежы, тут узносіліся малітвы. Непадалёку звычайна ставілі куфар, у якім захоўваліся розныя рэчы: ручнікі, посцілкі, якімі ўпрыгожваўся дом у розныя святочныя або жалобныя дні, адзенне і інш.

Апошнім памяшканнем у музеі з'яўляецца экспазіцыя, у якой сабраны сельскагаспадарчыя прадметы працы на зямлі, прадметы працы са льном, пасаг нявесты, кросны і месца для правядзення майстар-класаў, пасяджэнняў, трэнінгаў. Важнае месца займае экспазіцыя лёну. Лён меў значнае месца ў жыцці людзей, бо гэта быў найкаштоўнейшы матэрыял, які прызначаўся для корму жывёл, для вытворчасці прадуктаў харчавання, а таксама вырабу адзення. Паколькі раней не мелі магчымасці вырабляць лён на паўнавартасных фабрыках, неабходна была досыць працяглая ручная апрацоўка. У вытворчасці адзення з дадзенага матэрыялу, што атрымаў імя «паўночны шоўк», лён праходзіў мноства стадый апрацоўкі, якія прадстаўлены ў музеі.

У экспазіцыі ёсць куток з «пасагам нявесты», дзе захоўваліся прадметы, што выраблялі дзяўчаты перад шлюбам. Маецца таксама традыцыйны ткацкі станок (кросны), на якім працавала жанчына, вырабляючы ручнікі, посцілкі, тканіну для аддзення. Падобныя кросны знаходзіліся ў многіх нашых дамах да апошніх дзесяцігоддзяў. Зараз ткацкія станкі рэдка знойдзеш. Аднак ткацтва страціла сваю адметнасць. Наадварот, на працягу гадоў, калі прагрэс імкнецца наперад, прадметы, зробленыя на кроснах, глядзяцца вельмі аўтэнтычна.

Гісторыя існуе не толькі як дысцыпліна ў школах, але і для таго, каб мы на ўроках мінулага стваралі будучыню. Нездарма мудрыя людзі казалі: «Без мінулага няма будучыні». Аднак варта памятаць і не забываць пра тое, праз што прайшло чалавецтва, каб дасягнуць высокага ўзроўню жыцця.

РЭПАЗІТОРЫЙ БрГУ

# АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКАРЫСТАННЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў МУЗЕЙНАЙ І ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Гамзовіч Р. С.,***
*грамадскі эксперт па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны*

Па выніках аналізу існуючага вопыту могуць быць сфармуляваны пэўныя прапановы па павышэнню эфектыўнасці работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай у музейнай і турыстычнай дзейнасці.

*Прапановы па выкарыстанню НКС у музейнай дзейнасці:*

1. Калі ў рэгіёне, гісторыю і культуру якога адлюстроўваюць матэрыялы гісторыка-краязнаўчага музея, узяты пад ахову элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны, ён павінен быць адлюстраваны ў экспазіцыі дадзенага музея. Гэта ж натуральнае сведчанне жывой этнічнай культуры, якім ганарацца жыхары гэтага рэгіёна.

2. Дзейнасць музея па ахове НКС пажадана паставіць на комплексную аснову: працаваць не толькі з установамі культуры, але і адукацыі, аддзелам па справах моладзі, турызму, зацікаўленымі грамадскімі арганізацыямі, краязнаўцамі. Калі ў раёне некалькі элементаў НКС, праводзіць пасяджэнні пры ўдзеле прадстаўнікоў розных арганізацый, размеркаваўшы кірункі дзеянняў па захаванню гэтых элементаў.

3. Выкарыстоўваць інфармацыю, медыяматэрыялы пра традыцыйныя веды і практыкі ў дзейнасці экскурсаводаў (не толькі ў экскурсіях у музеі, але і выязджаць разам з турыстамі ў тую ці іншую вёску, каб мець зносіны з захавальнікамі традыцыі).

4. Музей павінен быць мабільным, актыўным, выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці інтэрактыўныя формы абслугоўвання наведвальнікаў. Асабліва гэта датычыцца прэзентацыі НКС у музейнай прасторы.

5. Ствараць умовы захавальнікам народнай культуры для знаёмства з тымі экспанатамі музея, якія страчаны ў жывой традыцыі, але іх можна аднавіць па ўзорах, якія захоўваюцца ў музеі.

6. Актыўна папулярызаваць экспанаты музея, якія датычацца НКС, сярод мясцовага насельніцтва, вызначаць іх каштоўнасць у гістарычнай памяці рэгіёна, пабуджаць да перадачы ў музей экспанатаў пры пагрозе іх знішчэння (праз раённыя СМІ, у школах, сярод наведвальнікаў, на святах вёсак і іншых мерапрыемствах, арганізоўваць для гэтай мэты асобныя акцыі музея).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Падтрымліваць і папулярызаваць захавальнікаў традыцыі, арганізоўваючы выставы, продаж праз кіёск рамесных вырабаў або буклетаў пра НКС, паштовак і інш. Дарэчы, гэта будзе прыцягваць наведвальнікаў, а для ўязднога турызму забяспечыць рэкламу музея.

*Прапановы па выкарыстанню НКС у турыстычнай дзейнасці:*

1. Уключаць элементы НКС у турыстычныя маршруты.

2. Сфарміраваць праграмы з наведваннем носьбітаў традыцый.

3. Захоўваць этычныя нормы паводзін у зносінах з носьбітамі падчас сустрэчы з імі, а таксама падчас абрадаў, якія яны праводзяць, выкананне імі традыцыйных дзеянняў. Паведамляць пра гэтыя нормы турыстам падчас экскурсіі.

4. Фарміруючы асобны экскурсійны маршрут, прысвечаны НКС, выкарыстоўваць прынцып культурнага кластара (знаёмства з прыродным і гісторыка-культурным асяроддзем, наведванне музеяў, выстаў, іншых культурных і адукацыйных устаноў, якія звязаны з НКС).

5. Распрацоўваць інтэрактыўныя формы ўзаемадзеяння разам з носьбітамі традыцыі і экспертамі, каб знаёмства з НКС засталося ў памяці і было зразумелым.

6. Актыўна выкарыстоўваць базу даных сайта «Жывая спадчына Беларусі» (http://livingheritage.by), які вядзе Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», парады экспертаў НКС, інфармацыю ў СМІ пра той ці іншы элемент НКС, што захоўваецца ў вашым рэгіёне.

7. Клапаціцца пра падрыхтоўку экскурсаводаў, якія будуць распавядаць у турах пра НКС. У гуртках экскурсаводаў – выхоўваць цікавасць дзяцей і моладзі да такой працы, сярод дзеючых экскурсаводаў – наладзіць навучанне і кансультацыі.

8. Захоўваць інтэлектуальныя правы носьбітаў традыцыі і іх права на матэрыяльную падтрымку ад турыстычнай дзейнасці. Пры гэтым не дапускаць празмернай камерцыялізацыі НКС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЫНІКІ АНКЕТАВАННЯ, ПРАВЕДЗЕНАГА Ў РАМКАХ МАНІТОРЫНГУ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ВЫКАРЫСТАННЮ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ


***Лапцёнак І. Б.,***
*дырэктар*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***Каліноўская А. Т., Гумінская А. В.,***
*вядучыя спецыялісты аддзела інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*


Інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» у верасні 2020 г. быў праведзены збор і аналіз звестак аб выкарыстанні турыстычнага патэнцыялу нематэрыяльнай культурнай спадчыны праз уключэнне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у разнастайныя праграмы культурна-пазнавальнага турызму на працягу 2017–2020 гг.

Уключэнне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычную дзейнасць садзейнічае выкананню мэт Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сярод якіх – прыцягненне ўвагі на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях да важнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны і яе ўзаемнага прызнання. У 2019 г. прыняты План мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па развіццю культурна-пазнавальнага турызму, адзін з пунктаў якога – маніторынг дзейнасці па захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія выкарыстоўваюцца ў турыстычнай дзейнасці.

Колькасць праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці павялічваецца штогод, адпаведна расце ўвага грамадства да знакавых праяў нацыянальнай культуры, яе адметных і ўнікальных праяў.

У 2020 г. у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс) уключаны 145 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, з іх 94 адметныя праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Найбольш актыўна ў турыстычную дзейнасць уключаны традыцыйныя абрады, рамёствы, адметныя праявы мясцовай кухні. Частка звычаяў, рэлігійных абрадаў і практык не разлічана на масавы ўдзел наведвальнікаў, таму да турыстычнай дзейнасці яны могуць быць далучаны толькі апасродкавана праз звесткі ў даведніках, інфармацыйных буклетах, тэкстах экскурсій, музейных экспазіцыях.

У кожнай вобласці вылучаецца пэўная колькасць нематэрыяльных каштоўнасцей, турыстычны патэнцыял якіх выкарыстоўваецца найбольш актыўна. У цэлым па краіне 52 % нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей мэтанакіравана ўключаны ў розныя формы турыстычнай дзейнасці (гл. табл. 1).

Значна большы паказчык – у Віцебскай і Гродзенскай абласцях, што сведчыць пра сістэмную работу, якая праводзіцца ўстановамі культуры па вывучэнню і выкарыстанню турыстычнага патэнцыялу адметных праяў мясцовай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, як да надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, так і пасля ўключэння ў Дзяржспіс.

Пры гэтым неабходна ўлічваць, што любая дзейнасць, звязаная з турызмам, якая арганізуецца дзяржаўнымі, грамадскімі структурамі ці прыватнымі асобамі, прызначана забяспечваць павагу да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, адпавядаць памкненням і спадзяванням мясцовых супольнасцей носьбітаў традыцый. Уключэнне ў турыстычную дзейнасць не павінна ствараць пагрозу жыццядзейнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, перашкаджаць выкананню яе сацыяльных функцый.

Аналіз паказаў, што сярод элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія амаль не выкарыстоўваюцца ў турыстычнай дзейнасці, акрамя мясцовых рэлігійных абрадаў, разлічаных на невялікую мясцовую супольнасць, аказалася і большасць выканальніцкіх мастацтваў, сярод якіх адметныя спеўныя, танцавальныя, апавядальныя традыцыі. Беларускімі і замежнымі этнамузыколагамі заўсёды адзначалася асаблівая роля песеннай культуры ў народнай творчасці Беларусі, падкрэслівалася яе цэласнасць, устойлівасць, захаванасць найбольш старажытнага гістарычнага пласта. Таму выклікае занепакоенасць недастатковая прадстаўленасць форм прэзентацыі традыцыйнага спеўнага мастацтва для шырокіх колаў грамадства.

Турыстычны патэнцыял некаторых гісторыка-культурных каштоўнасцей застаецца пакуль па-за ўвагай многіх устаноў культуры. Напрыклад, мастацкія практыкі саломапляцення, якія ўключаны ў Дзяржспіс у 2020 г., шырока распаўсюджаны ў кожнай вобласці і могуць паслужыць асновай для мноства выставачных і інтэрактыўных турыстычных праграм. Нярэдка адказнасць за захаванне жывых форм культурнай спадчыны ў раёнах перадаецца музеям або мясцовым установам культуры, а на абласным узроўні ім удзяляецца недастаткова ўвагі.

*Табліца 1*

**Уключэнне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычную дзейнасць**

| Вобласць | Колькасць нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | агульная | якія актыўна выкарыстоўваюцца ў турыстычнай дзейнасці | | якія не могуць актыўна выкарыстоўвацца ў турыстычнай дзейнасці | | маюць нявыкарыстаны турыстычны патэнцыял | |
| | | колькасць | % | колькасць | % | колькасць | % |
| Брэсцкая | 18 | 7 | 39 | 5 | 28 | 4 | 22 |
| Віцебская | 17 | 11 | 65 | 6 | 35 | 0 | 0 |
| Гомельская | 12 | 5 | 42 | 2 | 17 | 5 | 42 |
| Гродзенская | 18 | 13 | 72 | 5 | 28 | 0 | 0 |
| Магілёўская | 14 | 6 | 43 | 4 | 29 | 4 | 29 |
| Мінская | 15 | 7 | 47 | 6 | 40 | 2 | 13 |
| Усяго: | 94 | 49 | 52 | 27 | 29 | 16 | 17 |

Пэўная колькасць турыстычных маршрутаў, якія ўключаюць інтэрактыўныя формы знаёмства з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, распрацавана ў кожнай вобласці. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях створаны па дзве інтэрактыўныя праграмы з уключэннем нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (у Іванаўскім і Бярозаўскім раёнах на Брэстчыне, у Ельскім і Жыткавіцкім раёнах на Гомельшчыне). Па тры цікавыя маршруты можна знайсці ў Віцебскай (у Пастаўскім і Докшыцкім раёнах) і Мінскай абласцях (у Валожынскім і Капыльскім раёнах). У Гродзенскай і Магілёўскай абласцях прапануецца больш інтэрактыўных форм знаёмства з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі для турыстаў (у Гродзенскім, Лідскім, Ваўкавыскім і Навагрудскім раёнах на Гродзеншчыне, у Дрыбінскім, Клічаўскім, Слаўгарадскім, Чэрыкаўскім раёнах на Магілёўшчыне).

Сярод масавых культурных мерапрыемстваў абласнога ўзроўню, на якіх найбольш шырока прадстаўлены нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, вылучаюцца фестывалі і святы, прысвечаныя адметным праявам нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія арганізаваны ў Гродзенскай і Віцебскай абласцях:

рэгіянальны фестываль традыцыйнай культуры «Скарбы Гродзеншчыны» (праводзіцца ДУК «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» раз у два гады ў розных раёнах вобласці);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласны фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямоння жыватворныя крыніцы» (праводзіцца ДУК «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» раз у два гады ў розных раёнах вобласці);

рэгіянальнае свята-кірмаш вырабаў рамеснікаў «Велікодны кірмаш» (праводзіцца ДУК «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» штогод у г. Гродна);

адкрыты конкурс традыцыйнай свістулькі «Салавейка» (праводзіцца ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» штогод у г. Дуброўна, г. Віцебск);

абласное свята-конкурс вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца» (праводзіцца ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» раз у два гады ў розных раёнах вобласці);

абласны пленэр маляванага дывана «Райскі сад» (праводзіцца ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» штогод у г. Глыбокае, г. Віцебск).

У Брэсцкай, Мінскай, Магілёўскай абласцях нематэрыяльная культурная спадчына ўключана ў фестывалі і конкурсы народнай творчасці і фальклорнага мастацтва, якія ахопліваюць разнастайныя формы работы не толькі з традыцыйнай спадчынай, але і з сучаснымі формамі народнай культуры. Сярод буйных абласных мерапрыемстваў вылучаюцца наступныя:

этнапраект «Рух зямлі», мерапрыемствы якога ладзяцца некалькі разоў на год з 2009 г. (праводзіцца ДУК «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр» штогод у г. Брэст і іншых раёнах вобласці);

абласное свята фальклорнага мастацтва «Таночак» (праводзіцца ДУК «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр» і аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Драгічынскага райвыканкама раз у два гады ў в. Бездзеж Драгічынскага раёна);

свята народных мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы» (праводзіцца ДУК «Мінскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» ў г. Слуцк);

свята-конкурс майстроў ткацтва «Матчыны кросны» (праводзіцца ДУК «Мінскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» ў г. Старыя Дарогі);

фестываль фальклорнага мастацтва «Фальклорная талака» (праводзіцца ДУК «Мінскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» ў г. Барысаў);

абласны фестываль фальклорнага мастацтва «Скарбніца Падняпроўя» (праводзіцца УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы»);

абласны творчы праект «Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны» (праводзіцца УК «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы»).

На падобных мерапрыемствах нярэдка адсутнічае акцэнт на нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і іх наведвальнікі не заўсёды маюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць даведацца, што пэўныя традыцыі ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Турыстычны патэнцыял такіх свят не выкарыстоўваецца ў поўнай меры, бо галоўная ўвага надаецца конкурсным праграмам удзельнікаў, а не прыцягненню наведвальнікаў з дапамогай творчых праграм.

Больш турыстаў наведвае агульнавядомыя абласныя святы «Дажынкі», «Купалле», у «Гарадах майстроў» падчас розных фестываляў, дзе амаль заўсёды бываюць прадстаўлены розныя традыцыйныя рамёствы і выканальніцкія мастацтвы, у тым ліку ўключаныя ў Дзяржспіс. На падставе выкарыстання мясцовай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ствараюцца цікавыя раённыя мерапрыемствы. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці прадстаўлены для турыстаў, гасцей і мясцовых жыхароў у шэрагу раёнаў Беларусі (гл. табл. 2).

*Табліца 2*

**Лепшыя культурныя мерапрыемствы раённага ўзроўню, створаныя з мэтай папулярызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей**

| Раён, месца правядзення | Культурная падзея |
|---|---|
| | ***Брэсцкая вобласць*** |
| Маларыцкі раён, г. Маларыта | Раённы агляд-конкурс абрадавага фальклору «Спадчына зямлі Маларыцкай» |
| Столінскі раён, г. Давыд-Гарадок | Рэгіянальнае свята зімовых абрадаў «Конікі» |
| Драгічынскі раён, в. Бездзеж | Раённае свята «Велікодны вернісаж» |
| Пінскі раён, в. Мерчыцы | Адкрыты рэгіянальны фестываль фальклорнага мастацтва «Фальварак мінулага» |
| | ***Віцебская вобласць*** |
| Глыбоцкі раён, г. Глыбокае | Раённае свята «Квітней, Глыбоччына» |
| Гарадоцкі раён, г. Гарадок | Раённае свята народнай творчасці беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас» |
| Пастаўскі раён, г. Паставы | Раённае «Свята клёцак» |
| Полацкі раён, вёскі раёна | Культурны праект «З народнай скарбонкі Полаччыны» |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Раён, месца правядзення | Культурная падзея |
|---|---|
| ***Гомельская вобласць*** | |
| Веткаўскі раён,<br>аг. Неглюбка | Свята неглюбскага ткацтва<br>«Кросенцы» |
| Веткаўскі раён,<br>г. Ветка | Адкрытае раённае свята фальклору<br>«Траецкі карагод на Веткаўшчыне» |
| Ельскі раён,<br>г. Ельск | Раённы кірмаш народных талентаў<br>«Фарбы спадчыны маёй» |
| ***Гродзенская вобласць*** | |
| Свіслацкі раён,<br>г. Свіслач | Рэгіянальнае свята<br>«Свіслацкі кірмаш» |
| Лідскі раён,<br>г. Ліда | Творчая сустрэча майстроў і аматараў рамяства<br>«Свята ткацтва» |
| Мастоўскі раён,<br>аг. Гудзевічы | Летняя школа<br>«Майстэрня падвойнага ткацтва» |
| Слонімскі раён,<br>в. Паўлава | Фестываль<br>«Паўлаўскі каравай» |
| ***Магілёўская вобласць*** | |
| Бабруйскі раён,<br>п. Глуша | Раённы фестываль народнай творчасці і рамёстваў<br>«Глушанскі хутарок» |
| Быхаўскі раён,<br>г. Быхаў | Раённы фестываль дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва<br>«Саламяны павук» |
| Дрыбінскі раён,<br>г.п. Дрыбін | Рэгіянальны фестываль народнай творчасці,<br>народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» |
| Слаўгарадскі раён,<br>в. Кліны | Фестываль «Макавей» |
| ***Мінская вобласць*** | |
| Любанскі раён,<br>в. Шыпілавічы | Фэст традыцыйнай культуры<br>«Пятровіца» |
| Любанскі раён,<br>вёскі раёна | Раённы фэст аўтэнтычнай песні<br>«Бабулі» |
| Капыльскі раён,<br>в. Семежава | Свята-конкурс майстроў ткацтва<br>«Млечны шлях ад рук бабулі» |
| Салігорскі раён,<br>г. Салігорск | Рэгіянальны фестываль фальклорнага мастацтва<br>«Сугалоссе» |

Асаблівай увагі заслугоўваюць святы, якія створаны для падтрымкі і папулярызацыі канкрэтных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; напрыклад, «Свята клёцак» у Паставах, «Свята ткацтва» ў Лідзе,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свята зімовых абрадаў «Конікі» ў Давыд-Гарадку, фестываль «Макавей» у Слаўгарадскім раёне і інш.

Важна, калі ў працэс трансляцыі ўключаны рознаўзроставыя групы насельніцтва. Так, адметная сістэма работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай склалася ў Любанскім раёне, дзе для старэйшага пакалення носьбітаў ладзіцца фэст аўтэнтычнай песні «Бабулі», а для моладзі – фэст традыцыйнай культуры «Пятровіца», які ўключае летнік па навучанню мясцовым танцам, песням і абрадам, а таксама сустрэчы з носьбітамі традыцыйнай культуры.

У кожнай вобласці ёсць прыклады паспяховых мясцовых ініцыятыў па прасоўванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Напрыклад, у в. Стойлы Пружанскага раёна на аграсядзібе «Стулы» ў памяць аб жыцці і творчасці М. В. Тарасюка прыватным сямейным тэатрам прапануецца батлеечны спектакль «Прытулак памяці», прысвечаны майстру, праводзяцца пленэры разбяроў, іншыя творчыя мерапрыемствы, госці сядзібы могуць наведаць музей з «драўляным народам», які знаходзіцца побач. Сістэмная дзейнасць па далучэнню да народнай спадчыны ажыццяўляецца работнікамі культуры Пастаўскага раёна, у якім ахоўваюцца пяць нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. У розных населеных пунктах Пастаўшчыны праходзіць доўгатэрміновая акцыя «Святкуем па-беларуску», культурна-асветны праект «Ведай свой край. Народная культура», распачата рэалізацыя беларуска-польскага праекта «Кулінарны шлях» – «Смакі Беларусі».

У Гродзенскай вобласці для пашырэння магчымасцей азнаямлення з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі ў шэрагу раёнаў створаны музейныя экспазіцыі і пакоі для сустрэчы з носьбітамі, правядзення паказаў, майстар-класаў. У Гродзенскім раёне працуе музей пісанкі ў Сапоцкінскім культурна-турыстычным цэнтры і музейны пакой драўляных музычных інструментаў М. А. Скрамблевіча ў Адэльскім цэнтры культуры і народнай творчасці; у Воранаўскім раёне – музейны пакой «Тут радзімы маёй пачатак»; у Слонімскім – творчая гасцінная традыцыйнага печыва.

У Магілёўскай вобласці статус гісторыка-культурнай каштоўнасці маюць традыцыі паломніцтва да крыніц. Акрамя агульнапрынятых дзён ушанавання, праводзяцца розныя тэматычныя фестывалі, напрыклад эка-этна-фестываль «Песні аб крыніцах» і кулінарны фестываль «Гаспадыня крыніца запрашае» ў Слаўгарадскім раёне. Паспяхова дзейнічае і прымае турыстаў «Дрыбінская школа шапавалаў», створаная ў межах праекта ЕС-ПРААН «Садзеянне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» (арганізатар ДУК «Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей»).

У Мінскай вобласці цэнтры прыцягнення ўвагі да нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўзніклі ў многіх раёнах. Напрыклад, у Капыльскім быў створаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раённы цэнтр ткацтва ў аг. Семежава, на базе якога адкрыта багатая экспазіцыя мясцовага тэкстылю і школа ткачоў. У Любанскім раёне цэнрам адраджэння традыцый мясцовага хлебапячэння і прэзентацыі багатай народнай спадчыны стаў дом народных традыцый у в. Жораўка. Актыўна адраджае розныя напрамкі традыцыйнай культуры Ракаўскі цэнтр фальклору ў Валожынскім раёне.

Уключэнне адметных праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны сваёй мясцовасці ў праграмы адпачынку на аграсядзібах атрымала распаўсюджанне ў многіх раёнах Віцебшчыны – Браслаўскім, Глыбоцкім, Гарадоцкім, Полацкім, Ушацкім, Лепельскім, у асобных раёнах іншых абласцей – у Бярозаўскім на Брэстчыне, Свіслацкім на Гродзеншчыне, Валожынскім і Капыльскім раёнах на Міншчыне, Горацкім і Дрыбінскім раёнах на Магілёўшчыне.

Такім чынам, цікавыя, прывабныя для турыстаў мясцовыя ініцыятывы можна знайсці ў кожнай вобласці. Найбольш эфектыўнымі яны становяцца пры аб'яднанні розных відаў мясцовай спадчыны для прадстаўлення цэласнага вобраза традыцыйнай культуры. Утварэнню турыстычна-прывабных цэнтраў народнай спадчыны спрыяе цеснае супрацоўніцтва ўстаноў культуры, адукацыі, спорту і турызму, мясцовых органаў улады, міжнародных праграм падрымкі.

У Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях дзейнічаюць праграмы транспамежнага супрацоўніцтва, у якія ўключаны мерапрыемствы па вывучэнню і аднаўленню нематэрыяльнай культурнай спадчыны, стварэнню і пашырэнню цэнтраў па рэвіталізацыі старадаўніх рамёстваў. Напрыклад, праект «Народная творчасць без межаў» у рамках праграмы тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краін Усходняга партнёрства Беларусь–Украіна ажыццяўляўся на тэрыторыі Маларыцкага (Беларусь) і Ратнаўскага (Украіна) раёнаў.

У межах Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія–Літва–Беларусь на 2014–2020 гг. падтрымцы і захаванню нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны і традыцыйных рамёстваў былі прысвечаны наступныя праекты:

праект «Вывучэнне і зберажэнне традыцыйных рамесных навыкаў жыхароў даліны Дзвіны/Даўгавы і перадача іх будучаму пакаленню» (Браслаўскі і Полацкі раёны);

праект «Юныя рамеснікі за захаванне і развіццё традыцыйных навыкаў праз трансгранічнае супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Латвіі, Літвы і Беларусі» (Глыбоцкі раён);

праект «Мабільнае мастацтва як аснова ўзаемадзеяння ў развіцці і захаванні культурнай спадчыны прыгранічных тэрыторый» (Мастоўскі раён);

праект «Умацаванне самабытнасці сельскіх раёнаў шляхам развіцця традыцыйных рамёстваў і турызму» (Лідскі раён).

Носьбіты нематэрыяльнай культурнай спадчыны распаўсюджваюць веды пра свае традыцыі праз удзел у міжнародных фестывалях. Найбольш актыўна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта робяць майстры і аўтэнтычныя выканаўцы Віцебскай і Мінскай абласцей. За перыяд з 2017 па 2020 гг. беларуская традыцыйная спадчына была прадстаўлена на фестывалях і форумах у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Германіі, Кітаі, Літве, Польшчы, Расіі, Славакіі, Турцыі і Украіне.

Значна часцей і больш актыўна носьбіты нематэрыяльнай культурнай спадчыны прымаюць удзел у міжнародных фестывалях і творчых сустрэчах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Шэраг фестываляў народнай творчасці і рамесных традыцый за час свайго існавання набылі статус міжнародных:

Міжнародны пленэр ганчароў (в. Гарадная Столінскага раёна);

Міжнародны фестываль фальклору «Мотальскія прысмакі» (г. Іванава);

Міжнародны пленэр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і конкурс па ганчарству «Гліна спявае» (п. Копысь Аршанскага раёна);

Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» (аг. Ляскавічы Петрыкаўскага раёна).

На Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» заўсёды шырока прадстаўлена нематэрыяльная культурная спадчына ў межах праграм народнай творчасці, якія праходзяць на вуліцах і плошчах горада. Штогод ладзіцца не толькі «Горад майстроў», але і конкурсы па адметных беларускіх рамёствах – саломапляценню, маляванцы, выцінанцы і іншых, у якіх прымаюць удзел майстры з усёй Беларусі.

Дэманструецца нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі і на міждзяржаўных форумах і сустрэчах Беларусі з Расіяў, Украінай і Польшчай.

Патэнцыял нематэрыяльнай культурнай спадчыны для развіцця культурна-пазнавальнага турызму, а таксама выяўленне ўплыву турызму на жыццядзейнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ўстойлівае развіццё адпаведных супольнасцей патрабуе грунтоўнага вывучэння і аналізу на абласным узроўні. У поўнай меры турыстычны патэнцыял нематэрыяльнай культурнай спадчыны выкарыстоўваецца ў асобных раёнах, прыкладна каля паловы нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей мэтанакіравана ўключана ў разнастайныя турыстычныя праекты. Шматлікія прыклады выдатных мясцовых ініцыятыў і раённых мерапрыемстваў паказваюць, што пры творчым падыходзе ўстаноў культуры да работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай яе рэсурсы могуць быць выкарыстаны для развіцця адметных культурных праектаў і брэндавых мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць захаванню культурнай разнастайнасці і ўмацаванню супольнасцей носьбітаў адметных беларускіх традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЫНІКІ АНКЕТАВАННЯ, ПРАВЕДЗЕНАГА Ў МЕЖАХ МАНІТОРЫНГУ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЗАХАВАННЮ І ВЫКАРЫСТАННЮ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У МУЗЕЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Лапцёнак І. Б.,***
*дырэктар*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

***Каліноўская А. Т., Гумінская А. В.,***
*вядучыя спецыялісты аддзела*
*інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

Уключэнне ў музейную дзейнасць вывучэння і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны прадугледжана Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры. Адпаведна артыкулу 154 музейная дзейнасць ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння агульнадаступнасці культурных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, выкарыстання іх для эстэтычнага выхавання і культурнага развіцця грамадзян і ўключае ў сябе культурна-асветную работу і культурна-адукацыйную дзейнасць, звязаную з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, а таксама вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей адпаведна профілю музея. У артыкуле 159 падкрэсліваецца важнасць місіі музея, як сацыяльнага інстытута па захаванню і папулярызацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, нацыянальных культурных традыцый, у тым ліку традыцый народных мастацкіх рамёстваў, этнакультурнага і прыроднага асяроддзя.

Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 года ў паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына», акрамя звычаяў, форм падачы і выяўлення, ведаў і навыкаў, уключае таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, – прызнаныя супольнасцямі, групамі і асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Многія нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці маюць сваё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыяльнае ўвасабленне, асабліва беларускія традыцыйныя рамёствы, сучасныя формы аўдыя- і відэафіксацыі звычаяў і абрадаў, выканальніцкіх мастацтваў, якія дазваляюць сабраць багаты матэрыял для цікавых музейных экспазіцый і інтэрактыўных праграм. Жывы, дынамічны характар нематэрыяльнай культурнай спадчыны забяспечвае яе пастаяннае ўзнаўленне, стварэнне новых, але адпаведных старадаўнім тэхналогіям і звычаям прадметаў, матэрыялаў і інструментаў. Усё разам гэта дае багаты матэрыял для ажыццяўлення сучасных падыходаў да арганізацыі музейнай дзейнасці і прыцягнення наведвальнікаў.

Як паказаў аналіз уключэння нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў турыстычную дзейнасць, толькі палова нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей можа быць актыўна ўключана ў турыстычныя праграмы. Значная колькасць адметных праяваў традыцыйнай культурнай спадчыны – звычаі і абрады, веды і ўменні, – не разлічаныя на шырокае кола наведвальнікаў. У такіх выпадках відавочная роля музеяў, асабліва краязнаўчага профілю, па адлюстраванню адметнасцей мясцовага культурнага жыцця, папулярызацыі ведаў пра сапраўдную культурную спадчыну і духоўныя каштоўнасці мясцовых супольнасцей.

Вылучаецца шэраг музеяў, якія сістэматычна займаюцца вывучэннем і творчай прэзентацыяй нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей сваёй мясцовасці. Іх дзейнасць можа служыць прыкладам выкарыстання рэсурсаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны для прыцягнення наведвальнікаў, стварэння адметнай экспазіцыйна-выставачнай прасторы і папулярызацыі нацыянальных культурных традыцый.

*Адметныя праекты Брэсцкай вобласці.*

Дзяржаўная ўстанова культуры «Мотальскі музей народнай творчасці» Іванаўскага раёна вывучае і захоўвае нематэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць «Вясельная каравайная традыцыя вёскі Моталь». У пастаяннай экспазіцыі музея размешчаны экспазіцыйны комплекс, у якім прадстаўлены Мотальскае вяселле і каравайная традыцыя. Адпаведныя выстаўкі па-за межамі музея былі арганізаваны на абласных Дажынках у г. Драгічын; на святкаванні Дня горада (г. Іванава), на Міжнародным фестывалі фальклору «Мотальскія прысмакі». Наведвальнікам прапануюцца інтэрактыўныя музейныя праграмы і музейна-педагагічныя заняткі: абрады «Вясельны каравай», «Падзел караваю»; майстар-клас па вырабу кветак для вясельнага каравая; традыцыйныя святы «Трэці дзень вяселля. Апошняя вясельняя вячэра», «Святыя вечары» (зімні абрадавы цыкл), «Гуканне вясны» (веснавы цыкл), «Траецкія святы» (з дэгустацыяй пірагоў і мёду), «Мотальскія пірагі» (летні абрадавы цыкл); для маленькіх наведвальнікаў створана спецыяльная праграма «У гасцях у бабулі Алены», дзе дзеці ў форме гульні вывучаюць старажытныя народныя традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўная ўстанова культуры «Музей народнай творчасці “Бездзежскі фартушок”» Драгічынскага раёна актыўна працуе ў дзень правядзення вясновага абраду «Стрылка», прапануючы жыхарам і шматлікім гасцям аграгарадка наведванне музея, удзел у абрадавых карагодах, разнастайныя святочныя забавы. Таксама ладзяцца традыцыйныя музейныя святы «Гуканне вясны», «Чароўная купальская ноч» і інш.

*Адметныя праекты Віцебскай вобласці.*

Навукова-даследчая ўстанова культуры «Браслаўскае раённае аб'яднанне музееў» займаецца даследаваннем нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей «Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я», «Традыцыйная тэхналогія спіральнага пляцення», «Інсітнае (наіўнае) мастацтва Віцебшчыны». У Музеі традыцыйнай культуры частка экспазіцыі прысвечана саломапляценню і маляванкам. У 2019 г. створана выстава «Жывая спадчына», прысвечаная нематэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям Браслаўскага раёна. У музеях для наведвальнікаў праводзяцца практыкумы па розных тэмах: выраб маляванкі метадам штампоўкі; тэхналогія спіральнага пляцення для вырабу саламянага посуду; тэхналогія пляцення саламянага капелюша і інш.

Дзяржаўнай установай культуры «Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей» вядзецца вывучэнне сямі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў раёне: «Тэхналогія прыгатавання традыцыйнай стравы “Клёцкі з душамі”», «Традыцыйнае мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я», «Абрад “Насіць намётку” ў в. Папшычы», «Традыцыйная тэхналогія выпечкі жытняга хлеба», «Тэхналогія прыгатавання традыцыйнай стравы “Масляны баран”», «Традыцыі інсітнага (наіўнага) мастацтва Віцебшчыны», «Мастацкія практыкі саломапляцення». У музеі прадстаўлены ўзоры традыцыйнага мастацтва маляванкі – маляваныя дываны народнага майстра Беларусі Святланы Скавырка. У 2017 г. была рэалізавана мясцовая ініцыятыва «Стварэнне віртуальных падарожжаў па гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна» ў рамках праекта «Садзеянне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). У рамках рэалізацыі ініцыятывы праведзены шэраг мерапрыемстваў: тэматычны семінар «Гісторыка-культурная спадчына Глыбоччыны», круглы стол «Без мінулага няма будучыні», этнавечарына «Госць не госць, а гаспадару – радасць» з удзелам замежных калектываў. Адным з вынікаў рэалізацыі ініцыятывы стала стварэнне музейнага інтэрнэт-сайта «Гісторыка-культурная спадчына Глыбоцкага раёна» (http://spadchyna.glubmusej.by/be/), адзін з раздзелаў якога прысвечаны нематэрыяльным гісторыка-культурным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцям Глыбоччыны. У 2019 г. у рамках абласнога плэнэра маляваных дываноў «Райскі сад» Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеем арганізавана тэматычная выстава «Маляваныя сны». Супрацоўнікамі музея была падрыхтавана і праведзена медыялекцыя «Гісторыка-культурная спадчына рэгіёна», у якую ўключаны пытанні захавання і папулярызацыі багатай нематэрыяльнай культурнай спадчыны раёна.

Установа культуры «Мастацка-этнаграфічны музей імя Я. Н. Драздовіча» у аг. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна вядзе вывучэнне традыцыйнага мастацтва маляваных дываноў Віцебскага Паазер'я. Створана экспазіцыя «Жыццё і дзейнасць Я. Драздовіча». У 2019 г. арганізавана выстава маляваных дываноў «Чароўны свет маляванак» з фондаў ДУК «Шаркаўшчынскі раённы цэнтр культуры». У 2018 г. у Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі створана выстава «Жывапісная паляна», дзе былі прадстаўлены творы мастакоў-аматараў – прадстаўнікоў наіўнага мастацтва Шуміліншчыны, у 2019 г. – выстава «Золата продкаў», прысвечаная мастацкім практыкам саломапляцення. Для правядзення экскурсій з інтэрактыўнымі элементамі распрацавана і рэалізавана гульня «Збяры маляванку». Дзецям дашкольнага і школьнага ўзросту прапаноўваецца сабраць маляванку Я. Драздовіча, якая намалявана на 9-і кубах. Такім чынам, дзеці знаёмяцца з шасцю маляванкамі мастака.

*Адметныя праекты Гомельскай вобласці.*

Дзяржаўная ўстанова культуры «Веткаўскі музей стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Г. Шклярава» мае багатую калекцыю ручнікоў і іншых ткацкіх вырабаў неглюбскай тэкстыльнай традыцыі, якая шырока прадстаўлена ў залах музея і яго філіяла ў Гомелі. У 2020 г. у філіяле адкрылася выстава «Як палюбіла, так і зрабіла!», прысвечаная 105-годдзю з дня нараджэння адной з вядомых неглюбскіх майстрых Марыі Паўлаўны Каўтуновай (1915–1988). У музеі распрацаваны і рэалізуюцца інтэрактыўная адукацыйныя праграмы народнай творчасці, анлайн-лекторыі, праходзяць заняткі этна-клуба «Параскева», ладзіцца летнік традыцыйнага ткацтва «Кросенцы», ажыццяўляецца праект «Стройныя суботы» па вырабу традыцыйных строяў уласнымі рукамі.

Дзяржаўная ўстанова «Лельчыцкі раённы краязнаўчы музей» на IV форуме «Музеі Беларусі» ў 2019 г. прадставіла экспазіцыю «Лясное бортніцтва Беларусі на прыкладзе Лельчыцкага раёна». Летам 2020 г. была арганізавана выстава «Лясное бортніцтва».

Дзяржаўная ўстанова «Краязнаўчы музей г. Ельска» падрыхтаваў культурна-асветную акцыю «Нашчадкам у спадчыну», у рамках міжнароднага Дня музеў, у межах якой адбылося знаёмства ўдзельнікаў з песеннай творчасцю аўтэнтычнага фальклорнага гурта в. Казлы, што захоўвае нематэрыяльную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурную каштоўнасць «Мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў».

*Адметныя праекты Гродзенскай вобласці.*

Установа культуры «Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей» вядзе актыўную дзейнасць па вывучэнню і захаванню тэхналогіі ткацтва падвойных дываноў, якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Лепшыя ўзоры дываноў прадстаўлены ў пастаяннай экспазіцыі музея. Штогод рыхтуюцца выстаўкі «Тканыя дзівосы» падчас працы летняй школы «Майстэрня падвойнага ткацтва», «Скарбы бабулінага куфра» – на мерапрыемстве «Гудзевіцкі фэст. Купальскія таямніцы», іншыя часовыя экспазіцыі.

Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей» арганізуе выстаўкі, прысвечаныя нематэрыяльным гісторыка-культурнмх каштоўнасцям вобласці. Традыцыйнае белаўзорыстае ткацтва Панямоння шырока прадстаўлялася на выстаўках «Ручнікі Панямоння» (2017) і «Шляхам традыцый: беларускі ручнік» (2019). Адметным рамёствам Гродзеншчыны была прысвечана выстаўка «Жывая спадчына роднай зямлі» (2019).

Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі» з'яўлялася пляцоўкай для дзвюх выставак, арганізаваных у межах праекта «Культурная спадчына па абодва бакі мяжы» Праграмы транспамежнага супрацоўніцтва «Латвія–Літва–Беларусь 2014–2020». Выстаўкі ствараліся са збораў музея і Цэнтра культуры г. Друскінінкай (Літоўская Рэспубліка). Падчас выстаўкі «Велікоднае сугучча. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларуска-літоўскага памежжа» праходзілі майстар-класы па роспісу велікодных яек, адметная традыцыя роспісу якіх захоўваецца ў Гродзенскім раёне. Выстаўка «Мастацтва Karpiniai/Menas выцінанкі» суправаджалася правядзеннем майстар-класа па вырабу выцінанак-выбіванак (рамяство, якое на Гродзеншчыне мае статус гісторыка-культурай каштоўнасці).

У Навагрудскім гістарычна-краязнаўчым музеі Гродзенскай вобласці багата прадстаўлены мясцовыя выбіванкі ў раздзеле экспазіцыі «Сялянская хата», а майстар-класы для дзяцей і дарослых па вырабу папяровых карункаў праходзяць у межах аднайменных музейных заняткаў.

Музейна-педагагічныя заняткі «Нашчадкам у спадчыну» ў Мастоўскім дзяржаўным музеі «Лес і чалавек» знаёмяць з нематэрыяльнымі гісторыка-культурнымі кашоўнасцямі, да якіх адносяцца «Мясцовы танец “Котчынская кадрыля”», «Традыцыйная тэхналогія ткацтва падвойных дываноў». У Слонімскім раённым краязнаўчым музеі імя І. І. Стаброўскага» ў музейныя заняткі «Вытокі народных традыцый», «Беларуская хата дабром багата» ўключаны веды і навыкі па прыгатаванню Паўлаўскіх каравяаў і іншай каляндарна-абрадавая выпечкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Адметныя праекты Магілёўскай вобласці.*

Дзяржаўная ўстанова культуры «Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей» працяглы час паспяхова дзейнічае ў напрамку вывучэння і папулярызацыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей «Творчасць майстроў-шапавалаў» і «Традыцыйная тэхналогія пляцення лапцей», якія грунтоўна прадстаўлены ў экспазіцыі музея і служаць асновай для вялікай колькасці музейных праектаў. Штогод праходзяць разнастайныя выстаўкі: «Шапавальства – сучасны погляд», «Дрыбін – шапавальскі край», «Шапавальскі падворак», «Дрыбінскія бусавы», «Шапавальскі гасцінец», «Таямніцы і загадкі шапавалаў», «Дрыбіншчына майстравая» і інш. Распрацаваны цыкл музейна-педагагічных заняткаў: «У гасцях у дзеда Мацея», «Народныя рамёствы і промыслы Дрыбінскага раёна», «Востраў майстроў», «Лапаток з музея», «Жылі-былі два капялюшы» «Майстэрня шапавалаў». Праходзіць музейнае свята «Дзень валёнка».

Дзяржаўная ўстанова культуры «Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей» прадстаўляе багатую спадчыну мясцовых майстроў саломапляцення, арганізуе творчыя сустрэчы горацкіх майстроў з вучнямі сярэдніх школ і студэнтамі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія». У культурна-масавых мерапрыемствах музея прымае ўдзел аўтэнтычны фальклорны ансамбль «Паршынскія зоры», які з'яўляецца носьбітам нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Спеўная традыцыя выканання хрэсьбінных і вясельных песень».

Дзяржаўная ўстанова «Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей» многа ўвагі надае забеспячэнню нагляднасці і папулярызацыі ведаў аб творчасці майстра Харкевіча А. А. па тэхналогіі вырабу драўляных музычных народных інструментаў, якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Шматлікія выстаўкі ў музеі адлюстроўваюць розныя бакі дзейнасці майстра і яго рамяства: «Музычныя гукі дрэва», «Майстра ўмелыя рукі», «Як на дудцы заіграю...», «Драўляных спраў майстар». Серыя тэматычных выстаў «Музычных спраў майстар» прайшла па аддаленых населеных пунктах Круглянскага раёна. Аўдыторыяй праекта з'яўляюцца наведвальнікі музея, выхаванцы дашкольных і школьных агульнаадукацыйных устаноў раёна, удзельнікі клубаў «Яшчэ не вечар» і «Гутарка». Рэалізацыя праекта ўключае ў сябе: правядзенне тэматычных музейна-педагагічных заняткаў, гутарак, майстар-класаў па вырабу музычных інструментаў, вечароў-сустрэч з майстрам, выстаў майстра, выязных выстаў з установай культуры «Аўтаклуб» у маланаселеных пунктах раёна; правядзенне выязных экскурсій у майстэрні майстра Харкевіча А. А., прагляд відэафільма пра майстра; стварэнне фота-прэзентацый «Беларускія народныя інструменты». Для работы з дзіцячымі садамі актыўна выкарыстоўваецца такая форма работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як «Музей у чамадане»: на яе аснове  праводзяцца музейна-педагагічныя заняткі «Драўлянныя музычныя інструменты», «Музычныя гукі дрэва». З пачаткам летніх канікул музей працуе па праекту «Музей у кожны двор», у рамках якога дзеці знаёмяцца з драўлянымі музычнымі інструментамі і спрабуюць іграць на іх.

Амаль ва ўсіх раённых музеях Магілёўскай вобласці можна пазнаёміцца з мясцовымі праявамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

*Адметныя праекты Мінскай вобласці.*

Дзяржаўная ўстанова «Уздзенскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей» ажыццяўляе дзейнасць па захаванню выканальніцкага майстэрства ў жанры казкавай прозы Л. М. Цыбульскай, майстэрства якой працягваецца сучаснымі апавядальнікамі. Матэрыялы пра казачніцу экспанаваліся музеем на выстаўках «На зямлі маёй блізкай і знаёмай» (2017), «Радзіма – казачны мой кут» (2018), «Мой родны кут – выток натхнення» (2019). «Зямля, дзе пачаўся твой лёс» (2020). У музеі праводзяцца мерапрыемствы з выкарыстаннем матэрыялаў па творчасці Л. М. Цыбульскай: падарожжа ў Краіну Ведаў «Школа казачных навук»; музейны занятак «З глыбіняў памяці»; майстар-клас па складанню казак і вершаў «Казачная навука»; інтэрактыўны тэатр «Хата багата»; літаратурная гульня «Ведаеш – адказвай, не ведаеш – паслухай», гісторыка-біяграфічныя экскурсіі па месцах, дзе нарадзіліся знакамітыя людзі Уздзеншчыны «Сэрцам адданыя роднай зямлі», «Ганарымся спадчынай роднага краю».

Пэўная інфармацыя пра нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці сустракаецца і іншых раённых музеях Міншчыны, сярод якіх Капыльскі раённы краязнаўчы музей, Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей, Мядзельскі музей народнай славы, Вілейскі краязнаўчы музей, Івянецкі музей традыцыйнай культуры.

Рэалізуючы культурна-адукацыйныя праекты ў сферы нематэрыяльнай культурнай спадчыны музеі Рэспублікі Беларусь спрыяюць перадачы, актуалізацыі і захаванню спадчыны. У дзяцей і моладзі назапашваюцца веды аб традыцыйнай культуры беларусаў, неабходныя для фарміравання на іх падставе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Уключэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў поле музейнай дзейнасці спрые не толькі яе захаванню, але і ўзбагачае музеі новымі формамі культурна-адукацыйнай работы, нетыповымі выставачнымі і экспазіцыйнымі праектамі, што прыводзіць да павышэння турыстычнай атрактыўнасці як асобных музеяў, так і цэлых рэгіёнаў, павялічвае колькасць наведванняў музеяў, спрые эканамічнаму эфекту ад турызму, актуалізацыі нематэрыяльнай спадчыны і, у выніку, устойліваму развіццю рэгіёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

ЗАХАВАННЕ І ПАДТРЫМКА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ – ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫ РЭСУРС УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯРЖАВЫ *(Лапцёнак І. Б.)* .......... 3

І. АНАЛІЗ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЗАХАВАННЮ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ .......... 8

Рэгіянальныя адметнасці аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь *(Каліноўская А. Т.)* .......... 8

Мерапрыемствы па захаванню элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гомельскай вобласці, уключаных у спісы ЮНЕСКА *(Мельнікава Л. Г.)* .......... 13

Шляхі захавання вусных традыцый Віцебскай вобласці *(Лабука К. П.)* .......... 15

Захаванне і падтрымка рамесных традыцый у Гродзенскай вобласці *(Мурэня А. У.)* .......... 18

Асноўныя падыходы да вывучэння і захавання традыцыйных абрадаў на Брэстчыне *(Пракаповіч Г. В.)* .......... 21

Вопыт захавання спеўных традыцый у Магілёўскай вобласці *(Глуздаў А. М.)* .......... 24

Памятка па ажыццяўленню мерапрыемстваў у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў 2021–2022 гадах для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў .......... 38

ІІ. ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў МЭТАХ РАЗВІЦЦЯ МУЗЕЙНАЙ І ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ .......... 41

Асноўныя падыходы да выкарыстання адметных праяў светапогляду і міфалогіі як элементаў культурна-пазнавальнага турызму *(Скварчэўскі Д. В.)* .......... 41

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць майстроў па тэхналогіі вырабу драўляных музычных народных інструментаў у дзейнасці Круглянскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея *(Гапаева В. Э.)* ........ 44

Выкарыстанне ў культурна-асветных праектах нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Традыцыйнае белаўзорыстае ткацтва Панямоння» *(Савіцкая М. В.)* ........ 45

Комплекс мерапрыемстваў па ахове і папулярызацыі традыцыі паломніцтва да «Блакітнай крыніцы» *(Воранава А. В.)* ........ 47

Практыкі збераження традыцыйнай культуры Гродзенскага раёна як галоўная ўмова развіцця турызму і музейнай дзейнасці ў рэгіёне *(Рамановіч Н. І.)* ........ 49

Выкарыстанне нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычнай дзейнасці на Пастаўшчыне *(Чатовіч Л. Я.)* ........ 53

Фестывальны фальклорны рух «Берагіня» як крыніца пераемнасці народных традыцый у рэгіёне *(Курсевіч К. А.)* ........ 56

Арганізацыя экскурсійна-турыстычнай дзейнасці Брэсцкага раённага Дома рамёстваў *(Мартыновіч Ф. А.)* ........ 71

Арганізацыйна-метадычныя аспекты выкарыстання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейнай і турыстычнай дзейнасці *(Гамзовіч Р. С.)* ........ 76

Вынікі анкетавання, праведзенага ў рамках маніторынгу дзейнасці па выкарыстанню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычнай дзейнасці *(Лапцёнак І. Б., Каліноўская А. Т., Гумінская А. В.)* ........ 78

Вынікі анкетавання, праведзенага ў межах маніторынгу дзейнасці па захаванню і выкарыстанню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у музейнай дзейнасці *(Лапцёнак І. Б., Каліноўская А. Т., Гумінская А. В.)* ........ 87

ДАДАТАК ........ 96

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ





1–4. Удзельнікі круглых сталоў і семінараў па захаванню
нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей
ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». 2020 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ



3




4

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



5



6

5–8 Прэзентацыі і майстар-класы ў спецыялізаванай вучэбнай аўдыторыі «Этналабараторыя» ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». 2020 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



7



8

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

# АКТУАЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

**Зборнік артыкулаў**

Пад агульнай рэдакцыяй
Лапцёнак Ірыны Браніславаўны

Укладальнікі:
Каліноўская Алена Тадэвушаўна,
Гумінская Алена Васільеўна

На вокладцы:
Удзельнікі летніка традыцыйнага ткацтва «Кросенцы»
ў аг. Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.
Фотаздымак Анатоля Кляшчука

Падпісана да друку 11.11.2020.
Фармат: 60x84 1/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 5,75. Ул.-выд. арк. 5,87. Тыраж 9 экз.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№1 / 177 ад 12.02.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220107, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ